МОСТ ДРУЖБЫ
КОНКУРС МОЛОДЫХ ЛИТЕРАТОРОВ СОЮЗНОГО ГОСУДАРСТВА

# ЛИТЕРАТУРНЫЙ АЛЬМАНАХ

2

ПОСТОЯННЫЙ КОМИТЕТ
СОЮЗНОГО ГОСУДАРСТВА

МОСТ ДРУЖБЫ
КОНКУРС МОЛОДЫХ ЛИТЕРАТОРОВ СОЮЗНОГО ГОСУДАРСТВА

# ЛІТАРАТУРНЫ АЛЬМАНАХ

ПАСТАЯННЫ КАМІТЭТ
САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

УДК 821.161.1+821.161.3-822
ББК 84(2Рос=Рус)
Л64

*Выпуск издания осуществлён по заказу*
*Постоянного Комитета Союзного государства*

Л64 **Литературный** альманах = Літаратурны альманах. Вып. 2 – Минск : Звязда, 2015. – 352 с.

Во второй выпуск «Литературного альманаха» вошли произведения лауреатов II Международного литературного конкурса молодых белорусских и российских литераторов Союзного государства «Мост Дружбы», учреждённого Постоянным Комитетом Союзного государства.

**УДК 821.161.1+821.161.3-822**
**ББК 84(2Рос=Рус)**

© Постоянный Комитет Союзного государства, 2015
© Оформление. РИУ «Издательский дом «Звязда», 2015
© Сивец Т. Н., перевод, 2015
© на рассказы принадлежит авторам произведений

**Григорий Рапота**

Государственный секретарь Союзного государства

Плодотворное сотрудничество российских и белорусских литераторов складывалось на протяжении не одного столетия. Продолжается оно и сейчас.

Сегодня интернет-формат творчества соперничает с традиционной литературой. Однако ни одно из современных средств коммуникации не может столь же полно выполнить её воспитательную задачу. Именно на писателей ложится огромная ответственность за то, каким будет общество завтра, насколько думающими станут наши потомки.

Подрастает новое поколение молодых людей, пробующих себя в литературном творчестве. Кто-то из них, хочется верить, через десять-двадцать лет станет известным, прославит свою страну. Но в начале этого пути их нужно поддержать. Именно такую задачу выполняет Конкурс молодых литераторов Союзного государства «Мост Дружбы», ориентированный на поиск и поддержку молодых талантливых авторов, привлечение их внимания к истории, культуре и литературным традициям России и Беларуси, строительству Союзного государства.

Подведены итоги второго такого конкурса. Жюри состояло из профессиональных литературоведов, специалистов по классическим произведениям, которые оценивали работы по целому ряду показателей. По их мнению, уровень присланных рассказов – высокий, их авторы обладают данными, позволяющими надеяться, что у них есть шанс найти своё место в литературе. Уже сейчас это думающие, тонко чувствующие люди.

**Григорий Рапота**
Государственный секретарь Союзного государства

Плённае супрацоўніцтва расійскіх і беларускіх літаратараў стваралася на працягу не аднаго стагоддзя. Працягваецца яно і сёння.

Зараз інтэрнэт-фармат творчасці супернічае з традыцыйнай літаратурай. Аднак ні адзін з сучасных сродкаў камунікацыі не можа гэтак жа поўна выканаць яе выхаваўчую задачу. Менавіта пісьменнікі нясуць велізарную адказнасць за тое, якім будзе грамадства заўтра, наколькі думаючымі стануць нашы нашчадкі.

Падрастае новае пакаленне маладых людзей, якія спрабуюць свае сілы ў літаратурнай творчасці. Нехта з іх, хочацца верыць, гадоў праз дзесяць-дваццаць стане вядомым, праславіць сваю краіну. Але ў пачатку гэтага шляху іх трэба падтрымаць. Менавіта такую задачу выконвае Конкурс маладых літаратараў Саюзнай дзяржавы «Мост Дружбы», арыентаваны на пошук і падтрымку маладых таленавітых аўтараў, прыцягненне іх увагі да гісторыі, культуры і літаратурных традыцый Расіі і Беларусі, будаўніцтва Саюзнай дзяржавы.

Падведзены вынікі другога такога конкурсу. Журы складалася з прафесійных літаратуразнаўцаў, спецыялістаў па класічных творах, якія ацэньвалі работы па цэлым шэрагу паказчыкаў. На іх думку, узровень дасланых апавяданняў – высокі, іх аўтары маюць даныя, якія дазваляюць спадзявацца, што ў іх ёсць шанс знайсці сваё месца ў літаратуры. Ужо зараз гэта людзі, якія думаюць і тонка адчуваюць.

Творы пераможцаў і ўдзельнікаў конкурсу «Мост Дружбы» сабраны ў «Літаратурны альманах».

Произведения победителей и участников конкурса «Мост Дружбы» собраны в «Литературный альманах». Хочу поблагодарить наших итальянских друзей из Ассоциации «Познаём Евразию», которые являются авторами идеи проведения такого литературного конкурса и входят в состав его жюри.

Желаю нашим победителям идти вперёд, верить в свои силы и в Большую литературу.



Хачу падзякаваць нашым італьянскім сябрам з Асацыяцыі «Пазнаем Еўразію», якія з’яўляюцца аўтарамі ідэі правядзення такога літаратурнага конкурсу і ўваходзяць у склад яго журы.

Жадаю нашым параможцам ісці наперад, верыць у свае сілы і ў Вялікую літаратуру.



**Члены экспертного совета:**

**Анатолий Николаевич Андреев,** прозаик, доктор филологических наук, профессор.

**Александр Николаевич Бадак,** директор издательства «Мастацкая літаратура».

**Александр Константинович Кожедуб,** писатель.

**Елена Александровна Овчаренко,** помощник Государственного секретаря Союзного государства.

**Полина Викторовна Пахомова,** помощник по специальным проектам Председателя Совета директоров ЗАО «Банк Интеза» и Президента Ассоциации «Познаём Евразию».

**Татьяна Николаевна Сивец,** главный редактор еженедельника «Літаратура і мастацтва».

**Александр Петрович Торопцев,** прозаик, доцент Литературного института им. А. М. Горького, главный редактор журнала «Проза», главный редактор журнала «Вестник детской литературы».

**Александр Миронович Ушаков,** ведущий научный сотрудник Института мировой литературы.

**Члены экспертнага савета:**

**Анатоль Мікалаевіч Андрэеў,** празаік, доктар філалагічных навук, прафесар.

**Аляксандр Мікалаевіч Бадак,** дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура».

**Аляксандр Канстанцінавіч Кажадуб,** пісьменнік.

**Алена Аляксандраўна Аўчарэнка,** памочнік Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы.

**Паліна Віктараўна Пахомава,** памочнік па спецыяльных праектах Старшыні Савета дырэктараў ЗАТ «Банк Інтэза» і Прэзідэнта Асацыяцыі «Пазнаём Еўразію».

**Таццяна Мікалаеўна Сівец,** галоўны рэдактар штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва».

**Аляксандр Пятровіч Торапцаў,** празаік, дацэнт Літаратурнага інстытута імя А. М. Горкага, галоўны рэдактар часопіса «Проза», галоўны рэдактар часопіса «Веснік дзіцячай літаратуры».

**Аляксандр Міронавіч Ушакоў,** вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута сусветнай літаратуры.

**МОЛОДЫЕ РОССИЙСКИЕ ПИСАТЕЛИ**

**МАЛАДЫЯ РАСІЙСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ**

| | |
|---|---|
| Евгений Капустин | Яўген Капусцін |
| Илья Луданов | Ілья Луданаў |
| Георгий Фомин | Георгій Фамін |
| Ирина Иванникова | Ірына Іваннікава |
| Мария Первушина | Марыя Пярвушына |
| Елизавета Рожкова | Лізавета Ражкова |
| Юлия Богданова | Юлія Багданава |

**Евгений Капустин**

**Яўген Капусцін**

**Евгений Капустин** родился 19 сентября 1984 года. Окончил Санкт-Петербургский Государственный Морской Технический университет. По специальности — сервис-инженер систем автоматизации морской техники. Поэт, прозаик, драматург, переводчик. Куратор международного культурного проекта «Отзвуки небес», редактор-составитель одноимённого международного сборника современной духовной поэзии. Автор сборников стихов «От времени к вечности», публикаций в сборниках, газетах и журналах России и зарубежья. Лауреат многочисленных конкурсов и фестивалей. Награждён Почётным серебряным знаком имени Святой Татьяны (2010).

**Яўген Капусцін** нарадзіўся 19 верасня 1984 года. Скончыў Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны марскі тэхнічны ўніверсітэт. Па спецыяльнасці – сервіс-інжынер сістэм аўтаматызацыі марской тэхнікі. Паэт, празаік, драматург, перакладчык. Куратар міжнароднага культурнага праекта «Водгукі нябёсаў», рэдактар-укладальнік аднайменнага міжнароднага зборніка сучаснай духоўнай паэзіі. Аўтар зборніка вершаў «Ад часу да вечнасці», публікацый у зборніках, газетах і часопісах Расіі і замежжа. Лаўрэат шматлікіх конкурсаў і фестываляў. Узнагароджаны Ганаровым сярэбраным знакам імя Святой Таццяны (2010).

## ВОСПОМИНАНИЯ О ВОЙНЕ И НЕ ТОЛЬКО

*Рассказчики:*
*Капустин Николай Петрович, родился 19 декабря 1931 года. Деревня Новинка, Тихвинский район Ленинградской области.*
*Капустина (Трошкова) Любовь Ивановна, родилась 4 сентября 1930 года. Деревня Ваньково, Тихвинский район Ленинградской области.*

### До войны

**Л. И.:** Свёкор участвовал в Германской войне (в Первой мировой). Их часть стояла в Финляндии. Немцы всех захватили, угнали в Германию. Пять лет он провёл в плену. Его держали в холодном сарае. Отморозил пальцы ног — пришлось ампутировать. Спасла его немка-доярка: выкормила, отогрела.
Все уже думали, что он погиб, никто не ждал, что вернётся.
Однажды на Троицу свекровь собралась идти в соседнюю деревню на престольный праздник. Перед уходом наказала всем домашним: «Сегодня мой муж Пеша придет. Сводите его в баню, дайте чистое бельё!». Все переглянулись, пожали плечами — решили, что тётя Феня из ума выжила. Но к обеду свёкор пришёл! Как она велела, его сводили в баню, дали переодеться в чистое бельё, и он отправился вслед за супругой.
**Л. И.:** Был в наших краях знаменитый разбойник Ланцов. Здоровенный, высокий. Страшный! Ловкий и до чего сильный! Однажды в тюрьме руками разжал решётку и сбежал. В другой раз ушёл из камеры через дымоход.
Ланцов — личность знатная. Все боялись одного его имени. Все бандиты стремились подражать ему, учились у него. Про него даже песню сочинили. Народ знал эту песню, но теперь она забылась.

## УСПАМІНЫ ПРА ВАЙНУ І НЕ ТОЛЬКІ

*Апавядальнікі:*
*Капусцін Мікалай Пятровіч, нарадзіўся 19 снежня 1931 года. Вёска Навінка, Ціхвінскі раён Ленінградскай вобласці.*
*Капусціна (Трашкова) Любоў Іванаўна, нарадзілася 4 верасня 1930 года. Вёска Ванькава, Ціхвінскі раён Ленінградскай вобласці.*

### Да вайны

**Л. І.:** Свёкар удзельнічаў у Германскай вайне (у Першай сусветнай). Іх часць стаяла ў Фінляндыі. Немцы ўсіх захапілі, пагналі ў Германію. Пяць гадоў ён правёў у палоне. Яго трымалі ў халодным хляве. Адмарозіў пальцы ног, прыйшлося ампутаваць. Выратавала яго немка-даярка – выкарміла, адагрэла.
Усе ўжо думалі, што ён загінуў, ніхто не чакаў, што вернецца.
Аднойчы на Тройцу свякроў сабралася ісці ў суседнюю вёску на прастольнае свята. Перад сыходам наказала ўсім хатнім: «Сёння мой муж Пеша прыйдзе. Адвядзіце яго ў лазню, дайце чыстую бялізну!». Усе пераглянуліся, перасмыкнулі плячыма – вырашылі, што цётка Феня з глузду з'ехала. Але да абеду свёкар прыйшоў! Як яна загадала, яго адвялі ў лазню, далі пераапрануцца ў чыстую бялізну, і ён выправіўся следам за жонкай.
**Л. І.:** Быў у нашых краях знакаміты разбойнік Ланцоў. Здаравенны, высокі. Страшны! Спрытны і да чаго моцны! Аднойчы ў турме рукамі расціснуў краты і збег. Іншым разам вылез з камеры праз комін. Ланцоў – асоба выбітная. Усе баяліся аднаго яго імені. Усе бандыты імкнуліся быць падобнымі на яго, вучыліся ў яго. Пра яго нават песню склалі. Народ ведаў гэтую песню, але цяпер яна забылася.

Всю округу в страхе держал со своей бандой. Грабили всех проезжающих и проходящих. Всё отбирали, у кого-то и одежду снимали. Иногда убивали. А оружие у них было — только ножи, колья да сильные руки.
Шёл на танцы парень в красивом костюме. Попался Ланцову — тот его убил, думал, что если в костюме, значит богатый. А у парня в карманах только три копейки оказалось. Ланцов потом сокрушался: «За три копейки человека убил! Всю жизнь жалеть буду!».
Девушка ехала с мужиками. У неё кобыла ленивая — чтобы заставить бежать, нужно долго хлыстом работать. Ехали через лес, заметили разбойников. Мужики сразу ускакали вперёд, а моя подруга пока хлестала кобылу — подошли разбойники с кольями. Один хотел лошадь по голове ударить, да промахнулся, попал девушке колом по бедрам. Тут кобыла понесла и проскочила сквозь толпу бандитов. А когда подруга выехала из лесу — встретила своих спутников, они её тут ждали. Видели, что она отстала, но вернуться не рискнули.
Вёл мужик корову в город продавать. На дороге в лесу Ланцова и встретил, да не узнал, — его не все знали в лицо. Разбойник спрашивает: «Куда путь держишь?». Мужик искренне отвечает: «На базар иду корову продавать, да Ланцова боюсь». А Ланцов улыбнулся: «Не бойся, Ланцов тебя не тронет!». А действительно — зачем бандитам корова? Возиться с ней… Им деньги нужны!
Как-то молодая девушка Дуся одна бежала по дороге через лес. Бегом бежала, в жутком страхе перед Ланцовым. На него и наткнулась. Не узнала. Он и говорит: «Иди своей дорогой спокойно. А если попадётся тебе кто-то на пути — говори всем, что Ланцов тебя не тронул, и они не тронут». Дуся так и обмерла, поняв, что перед ней он сам. А когда пришла в себя — побежала дальше что есть духу, не останавливаясь.
Ланцов не обижал тех, кто ему приходился хоть в какой-то степени роднёй. В одной семье его даже иногда пускали ночевать. Кажется, там жила его сестра.

Усё наваколле ў страху трымаў са сваёй бандай. Рабавалі ўсіх, хто ехаў ці ішоў. Усё адбіралі, у кагосьці і вопратку здымалі. Часам забівалі. А зброі ў іх было – адны нажы, калы ды моцныя рукі.

Ішоў на танцы хлопец у прыгожым гарнітуры. Трапіўся Ланцову – той яго забіў, думаў, што калі ў касцюме, значыць багаты. А ў хлопца ў кішэнях толькі тры капейкі аказалася. Ланцоў потым бедаваў: «За тры капейкі чалавека забіў! Усё жыццё шкадаваць буду!».

Дзяўчына ехала з мужыкамі. У яе кабыла лянівая – каб прымусіць бегчы, трэба доўга дубцом працаваць. Ехалі праз лес, заўважылі разбойнікаў. Мужыкі адразу паскакалі наперад, а мая сяброўка пакуль хвастала кабылу – падышлі разбойнікі з каламі. Адзін хацеў каня па галаве ўдарыць, ды прамахнуўся, трапіў дзяўчыне калом па сцёгнах. Тут кабыла панесла і праскочыла праз натоўп бандытаў. А калі сяброўка выехала з лесу – сустрэла сваіх спадарожнікаў, яны яе тут чакалі. Бачылі, што яна адстала, але вярнуцца не рызыкнулі.

Вёў мужык карову ў горад прадаваць. На дарозе ў лесе Ланцова і сустрэў, ды не пазнаў – яго не ўсе ведалі ў твар. Разбойнік пытаецца: «Куды ідзеш?». Мужык шчыра адказвае: «На базар іду карову прадаваць, ды Ланцова баюся». А Ланцоў пасміхнуўся: «Не бойся, Ланцоў цябе не кране». А сапраўды – нашто бандытам карова?.. Ім грошы патрэбныя. Важдацца з ёй!

Неяк маладая дзяўчына Дуся адна бегла па дарозе праз лес. Бегам бегла, у жудасным страху перад Ланцовым. На яго і натыкнулася. Не пазнала. Ён і кажа: «Ідзі сабе спакойна. А калі трапіцца табе хтось на шляху – кажы ўсім, што Ланцоў цябе не крануў, і яны цябе не крануць». Дуся так і абмерла, зразумеўшы, што перад ёй ён сам. А калі апрытомнела – пабегла далей што ёсць духу, не спыняючыся.

Ланцоў не крыўдзіў тых, хто яму даводзіўся хоць у нейкай ступені раднёй. У адной сям'і яго нават часам пускалі начаваць. Здаецца, там жыла яго сястра. Калі Ланцова

Когда Ланцова последний раз арестовывали, он им сказал: «Если и теперь уйду из тюрьмы — отблагодарю, всю жизнь богаты будете!». Ходили слухи, что у него где-то зарыта целая яма с деньгами и драгоценностями. Но на сей раз знаменитый разбойник не вернулся. Говорят, в тюрьме его тайно убили и через заднюю дверь вынесли. Видимо, решили избавиться, не дожидаясь суда.

**Л. И.:** Рассказывают, что некая девка была очень серьёзно больна, уже лежала при смерти. Отнесли её к бабке, которая заговаривала болезни. У той бабки жила змея. Змея залезла через рот в нутро к девке. Видно было, как змея извивалась в животе. Потом змея вылезла и вытащила болезнь. Девка выздоровела.

**Л. И.:** Младенцам давали маковое молоко, чтобы лучше спали и не плакали. Тогда не знали, что такое наркотики…

**Л. И.:** В соседней деревне — на Шижне — перед войной церковь разрушали. Всё убранство вытащили, купола сбили. Колокол сбросили — говорят, он так в землю и ушёл. В церкви потом лошадей держали, капусту солили, затем там располагался клуб.

Свои же мужики разрушали, помню фамилии — Петров, Кузнецов и другие… Все они погибли в войну, все до единого! Лишь Кузнецов вернулся с войны живым — зачах и вскоре скончался. Врачи не могли определить, что у него за болезнь. Просто угас на глазах.

Иконы из разрушенной церкви — большие, метра два на полтора — забрали к некоему Грише, в доме сделали из них перегородку и заклеили обоями. Тогда была мода вешать на стенах фотокарточки. В эту перегородку вбили гвозди и повесили фотографии в рамках. Гвозди сквозь обои вбили в глаза Богоматери — это потом узнали. Человек, который это делал, вскоре ослеп.

Однажды я ночевала в том доме, взрослых с нами не было, лишь старшая дочь хозяина Нюша. Как раз в ту ночь ей во сне явилась Богородица и велела:

апошні раз арыштоўвалі, ён ім сказаў: «Калі і зараз выберуся з турмы – аддзячу, усё жыццё багатыя будзеце». Хадзілі чуткі, што ў яго недзе закапана цэлая яма з грашыма і каштоўнасцямі. Але гэтым разам знакаміты разбойнік не вярнуўся. Кажуць, у турме яго таемна забілі і праз заднія дзверы вынеслі. Мабыць, вырашылі пазбавіцца, не чакаючы суда.
**Л. І.:** Кажуць, нейкая дзеўка была вельмі сур'ёзна хворая, ужо ляжала пры смерці. Аднеслі яе да бабкі, якая хваробы загаворвала. У той бабкі жыла змяя. Змяя залезла праз рот у нутро да дзеўкі. Відаць было, як змяя выгіналася ў жываце. Потым змяя вылезла і выцягнула хваробу. Дзеўка ачуняла.
**Л. І.:** Немаўлятам давалі макавае малако, каб лепш спалі і не плакалі. Тады не ведалі, што такое наркотыкі...
**Л. І.:** У суседняй вёсцы – на Шыжне – перад вайной царкву руйнавалі. Усё ўбранне выцягнулі, купалы збілі. Звон скінулі – кажуць, так ён у зямлю і пайшоў. У царкве потым коней трымалі, капусту салілі, пасля там клуб месціўся.
Свае ж мужыкі разбуралі, памятаю прозвішчы – Пятроў, Кузняцоў і іншыя... Усе яны загінулі ў вайну! Толькі Кузняцоў вярнуўся з вайны жывым, але неўзабаве зачаўрэў і памёр. Лекары не маглі вызначыць, што ў яго за хвароба. Проста загас на вачах.
Іконы з разбуранай царквы – вялікія, метры два на паўтара – забралі да нейкага Грышы, у доме зрабілі з іх перагародку і заклеілі шпалерамі. Тады была мода вешаць на сценах фотакарткі. У гэтую перагародку ўбілі цвікі і павесілі фатаграфіі ў рамках. Цвікі скрозь шпалеры ўбілі ў вочы Маці Божай – гэта потым даведаліся. Чалавек, які тое рабіў, неўзабаве аслеп.
Аднойчы я начавала ў тым доме, дарослых з намі не было, толькі старэйшая дачка гаспадара Нюша. Якраз у тую ноч ёй у сне з'явілася Багародзіца і загадала: «Вызвалі мяне, адкрый твары ўсім!». Нюша прачнулася і разбудзіла нас. Мы набіралі вады, адмочвалі

«Освободи меня, открой лица всем!». Нюша проснулась и разбудила нас. Мы набирали воды, отмачивали и снимали обои, вытаскивали гвозди. Потом позвали мужиков, те послушались нас, поместили иконы в рамки и установили их в комнате на почетное место.

## Война

**Н. П.:** Брат Сергей — офицер, служил в пограничных войсках в Литве, в Лиепае. Пограничники приняли на себя первый удар фашистов, все там и сгинули. Утром 22 июня 1941-го Сергей из своего гарнизона позвонил Катерине, своей жене, жившей на съёмной квартире. Только и успел сказать несколько слов — сообщить, что начинается война, что нужно срочно эвакуироваться, что скоро отходит корабль… Внезапно связь прервалась. Что там произошло дальше — неизвестно… Тело Сергея не найдено, он числится пропавшим без вести. Есть предположение, что литовцы сами наших пограничников и убили.

Катерина сразу бросила всё и побежала на пристань, а там люди грузятся на корабль с вещами, даже мебель забирают, — видимо, заранее знали, успели подготовиться. А она ничего не взяла, так, с маленькой сумочкой, и эвакуировалась. Катерина была беременна. Из Литвы она приехала к нам в деревню, и у нас родила сына, назвали его так же — Сергеем.

**Л. И.:** 22 июня я была в гостях в соседнем селе — в Ладвушах. Приехал Яков Семёнов из сельсовета, сообщил о войне. Мы чаю попили — и бежать домой.

А у нас уже начали призывать мужиков и парней.

Мой дядя Вася-малый обучал новобранцев. Тренировал: как держать винтовку, как целиться. Учил ходить в строю, надевать противогазы, бросать гранаты.

Когда забирали брата Пешу, я чихнула. Он вернулся живым, получив ранение.

і здымалі шпалеры, выцягвалі цвікі. Потым паклікалі мужыкоў, тыя паслухаліся нас, змясцілі абразы ў рамкі і паставілі іх у пакоі на пачэснае месца.

## Вайна

**М. П.:** Брат Сяргей – афіцэр, служыў у памежных войсках у Літве, у Ліепаі. Пагранічнікі прынялі на сябе першы ўдар фашыстаў, усе там і загінулі. Раніцай 22 чэрвеня 1941-га Сяргей са свайго гарнізона патэлефанаваў Кацярыне, сваёй жонцы, якая жыла на здымнай кватэры. Толькі і паспеў сказаць колькі слоў – паведаміць, што пачынаецца вайна, што трэба тэрмінова эвакуіравацца, што хутка адыходзіць карабель... Раптам сувязь перарвалася. Што там адбылося далей – невядома... Цела Сяргея не знойдзена, ён лічыцца прапаўшым без вестак. Мяркуюць, што літоўцы самі нашых памежнікаў і забілі.

Кацярына адразу кінула ўсё і пабегла на прыстань, а там людзі грузяцца на карабель з рэчамі, нават мэблю забіраюць – мабыць, загадзя ведалі, паспелі падрыхтавацца. А яна нічога не ўзяла, так, з маленькай сумачкай, і эвакуіравалася.

Кацярына была цяжарная. З Літвы яна прыехала да нас у вёску і ў нас нарадзіла сына, назвалі яго гэтак жа – Сяргеем.

**Л. І.:** 22 чэрвеня я была ў гасцях у суседнім сяле – у Ладвушах. Прыехаў Якаў Сямёнаў з сельсавета, паведаміў пра вайну. Мы чаю папілі – і бегма дадому.

А ў нас ужо пачалі прызываць мужыкоў і хлопцаў.

Мой дзядзька Вася-малы навучаў навабранцаў. Трэніраваў: як трымаць вінтоўку, як цэліцца. Вучыў хадзіць строем, апранаць адгазнікі, кідаць гранаты.

Калі забіралі брата Пешу, я чхнула. Ён вярнуўся жывым, атрымаўшы раненне.

Муж моей крёстной, Саня, был председателем колхоза, его в армию не брали. Но через пару месяцев он сам запросился на фронт: «Я больше не останусь тут бабами руководить! Пойду воевать!».
Когда мы его провожали, все смотрели на меня, ждали, что я чихну. Не чихнула. Через неделю он погиб. Но об этом мы узнали только зимой, когда пришёл солдат, разыскал его жену и всё рассказал: Саня утонул на переправе, получив ранение в живот.
**Н. П.:** Мы, мальчишки, бегали смотреть на строевые упражнения новобранцев, нам интересно было. Призывникам выдали охотничьи ружья. «Лечь!.. Встать!.. Целься!.. Коли!.. Бей прикладом!..» Удары отрабатывали на соломенных снопах. Мы всё повторяли за ними.
**Н. П.:** Немец рвался на Свирь — чтобы соединиться с финном и замкнуть второе кольцо блокады Ленинграда. Тогда городу было бы не выстоять! В октябре немцы заняли Тихвин, 60 дней его удерживали, пока наши их не выбили оттуда. В тот период линия фронта проходила в 50 км от нашей деревни. Ночью мы видели вдали зарево от боёв, от пожаров и взрывов.
Нас посылали рыть землянки в лесах — если бы враг придвинулся ближе, пришлось бы покинуть дома.
**Л. И.:** Когда фронт приблизился, нас хотели эвакуировать за реку Пашу, но когда немец сначала занял Тихвин, а потом продвинулся еще на 12 км, — наоборот, людей с Паши эвакуировали к нам.
**Н. П.:** Через наши деревни вывозили раненых, мимо постоянно ездили военные автомобили — ЗИСы, полуторки, студебеккеры. На краю деревни располагался медсанбат, здесь раненым делали перевязки и везли дальше в тыл. На дороге оборудовали КПП, все машины проверяли — возможно, отлавливали дезертиров. Солдаты, курсанты шли через нас — отступали на Вологду. Шли беженцы из занятых врагом деревень. Они у нас меняли одежду на еду.

Муж маёй хроснай, Саня, быў старшынёй калгаса, яго ў войска не бралі. Але праз пару месяцаў ён сам папрасіўся на фронт: «Я больш не застануся тут бабамі кіраваць! Пайду ваяваць!».
Калі мы яго праводзілі, усе глядзелі на мяне, чакалі, што я чхну. Не чхнула. Праз тыдзень ён загінуў. Але пра гэта мы даведаліся толькі ўзімку, калі прыйшоў салдат, адшукаў яго жонку і ўсё расказаў: Саня патануў на пераправе, атрымаўшы раненне ў жывот.
**М. П.:** Мы, хлапчукі, бегалі глядзець на страявыя практыкаванні навабранцаў, нам цікава было. Прызыўнікам выдалі паляўнічыя стрэльбы. «Легчы!.. Устаць!.. Цаляй!.. Калі!.. Бі прыкладам!..» Удары адпрацоўвалі на саламяных снапах. Мы ўсё паўтаралі за імі.
**М. П.:** Немец рваўся на Свір – каб злучыцца з фінам і замкнуць другое кальцо блакады Ленінграда. Тады гораду было б не выстаяць! У кастрычніку немцы занялі Ціхвін, 60 дзён яго ўтрымлівалі, пакуль нашы іх не выбілі адтуль. У той перыяд лінія фронту праходзіла ў 50 км ад нашай вёскі. Уначы мы бачылі ўдалечыні зарыва ад баёў, ад пажараў і выбухаў.
Нас пасылалі капаць зямлянкі ў лясах – калі б вораг прысунуўся бліжэй, прыйшлося б пакінуць дамы.
**Л. І.:** Калі фронт наблізіўся, нас хацелі эвакуіраваць за раку Пашу, але, калі немец спачатку заняў Ціхвін, а потым прасунуўся яшчэ на 12 км, – наадварот, людзей з Пашы эвакуіравалі да нас.
**М. П.:** Праз нашы вёскі вывозілі параненых, міма пастаянна ездзілі ваенныя аўтамабілі – ЗІСы, палутаркі, студабекеры. На краі вёскі размяшчаўся медсанбат, тут параненым рабілі перавязкі і везлі далей у тыл. На дарозе абсталявалі КПП, усе машыны правяралі – магчыма, адлоўлівалі дэзерціраў.
Салдаты, курсанты ішлі праз нас – адступалі на Волагду. Ішлі ўцекачы з занятых ворагам вёсак. Яны ў нас мянялі вопратку на ежу.

Наш дом — предпоследний от края деревни, после него семь километров чистого поля до следующего жилья. Зима лютая, морозы под минус сорок. Мы избу и не запирали — все шагали сплошным потоком, заходили к нам погреться и передохнуть перед дальнейшей дорогой.

Ночевали в том числе и в нашем доме — голодные, холодные. Много их было, все запасы съели. Спали вповалку на полу, головами на пороге, шагнуть некуда было.

Отец ночевал в сарае — корову охранял и присматривал, чтобы сено не загорелось от случайного окурка.

**Л. И.:** По деревне машины шли и шли… Раненых везли, очень много их было… Стон стоял… Машины с людьми открытые, а холод, мороз…

**Н. П.:** В деревне стояли конные обозы — телеги, сани — в том числе и с оружием. Однажды соседский парнишка где-то украл гранату. Похоже, это была лимонка — зелёная, круглая. Мы вдвоём с другим мальчишкой бегали за счастливым похитителем, просили показать находку. Он сначала похвастался, а потом не захотел делиться добычей — удирал от нас, в итоге забежал к себе в дом и закрылся. Мы долго ломились в запертую дверь, потом сообразили пойти посмотреть в окно. Только зашли за угол — шарахнуло, стёкла вылетели…

Взрослых дома не было, и обладатель гранаты решил разобрать свою находку. Видимо, держал её на коленях — ему разворотило всё между ног, бёдра и живот. Он умер в медсанбате.

А если бы мы сумели открыть дверь и попали бы в дом? Или успели бы влезть в окно?..

**Л. И.:** Об авианалётах нас предупреждали — бегали по деревне: «Тушите свет! Закрывайте окошки! Самолёты летят!». Мы занавешивали окна одеялами.

Свои и вражеские самолёты мы различали по звуку: немецкие гудели натужно, неравномерно, наши — более размеренно и плавно.

Наш дом – перадапошні ад краю вёскі, сем кіламетраў чыстага поля да наступнага жылля пасля яго. Зіма лютая, маразы пад сорак. Мы хату і не зачынялі – усе ішлі суцэльным патокам, заходзілі да нас пагрэцца і перадыхнуць перад далейшай дарогай.

Начавалі ў тым ліку і ў нашым доме – галодныя, халодныя. Шмат іх было, усе запасы паелі. Спалі на падлозе, галовамі на парозе, ступіць няма куды было.

Бацька начаваў у хляве – карову ахоўваў і прыглядаў, каб сена не загарэлася ад выпадковага недакурка.

**Л. І.:** Па вёсцы машыны ішлі ды ішлі... Параненых везлі, вельмі шмат іх было... Стогн стаяў... Машыны з людзьмі адкрытыя, а холад, мароз...

**М. П.:** У вёсцы стаялі конныя абозы – вазы, сані – у тым ліку і са зброяй.

Аднойчы суседскі хлапчук дзесьці скраў гранату. Падобна на тое, што лімонку – зялёная, круглая. Мы ўдваіх з іншым хлапчуком бегалі за шчаслівым выкрадальнікам, прасілі паказаць знаходку. Ён спачатку пахваліўся, а потым не захацеў дзяліцца здабычай – уцякаў ад нас, у выніку забег да сябе ў хату і зачыніўся. Мы доўга біліся ў замкнёныя дзверы, потым вырашылі пайсці зірнуць у акно. Толькі зайшлі за вугал – шарахнула, шкло павылятала...

Дарослых дома не было, і ўладальнік гранаты вырашыў разабраць сваю знаходку. Мабыць, трымаў яе на каленях – яму раскурочыла ўсё паміж ног, сцёгны і жывот. Ён памёр у медсанбаце.

А калі б мы здолелі адчыніць дзверы і трапілі б у дом? Ці паспелі б улезці ў акно?..

**Л. І.:** Пра авіяналёты нас папярэджвалі – бегалі па вёсцы: «Тушыце святло! Зачыняйце аканіцы! Самалёты ляцяць!». Мы завешвалі вокны коўдрамі.

Свае і варожыя самалёты мы адрознівалі па гуку: нямецкія гулі натужліва, нераўнамерна, нашы – больш мерна і плаўна.

Однажды на поле сел подбитый советский самолёт. Постоял, отремонтировался и улетел. При взлёте поля ему не хватило — въехал в рожь.
**Н. П.:** Неподалёку, в Кайваксе, располагался наш аэродром, и над деревнями постоянно летали самолёты. Бомбардировщики летали строем в сопровождении истребителей — на Свирь, на финнов.
Один неисправный истребитель полсотни метров не дотянул до поля, врезался в деревья в осиннике. Самолёт развалился на три части, лётчик погиб. Мы, ребятишки, потом ходили на место аварии собирать патроны и детали. Кто-то принёс домой ткань от парашюта…
**Н. П.:** С зимы 1941-го по весну 1942-го в соседнем доме располагался штаб тыловых частей, а офицеры жили у нас. В дом провели телефон и часто звонили в штаб фронта, в Чудово. Днём офицеры совещания устраивали, а ночами пьянствовали, с бабами гуляли, песни пели под гармошку, слушали патефон. Я сидел на печи, видел, как они пили: в стакан на треть заливали крепкий чай, на две трети — водку. Это называлось «пунш». Один офицер объяснял другому, молодому: «Так приятнее, мягче».
Моя мать готовила им еду — американскую тушёнку, гречу или перловку с мясом в больших железных банках. И нам, детям, немного доставалось. Вкусные консервы! Офицеры рассуждали: «Всё-таки Америка помогает».
Офицеры регулярно менялись, каждый месяц приезжали новые.
**Л. И.:** В деревне лошадей не осталось, всех забрали на войну.
Мы, дети, всё время работали. Например, палками молотили лён — тяжёлая работа! Женщины работали за мужиков, дети за женщин… От голода постоянно хотели спать. Ослабели, еле ноги переставляли, но работали.
Нам выдавали один мешок зерна в месяц — это десять килограммов. В некоторых семьях сразу всё мололи и съедали, а потом голодали. То ли не могли удержаться, то ли боялись, что украдут…

Аднойчы на поле сеў падбіты савецкі самалёт. Пастаяў, адрамантаваўся і паляцеў. Пры ўзлёце поля яму не хапіла – заехаў у жыта.

**М. П.:** Непадалёк, у Кайваксе, размяшчаўся наш аэрадром, і над вёскамі пастаянна ляталі самалёты. Бамбавікі ляталі строем у суправаджэнні знішчальнікаў – на Свір, на фінаў.

Адзін няспраўны знішчальнік паўсотні метраў не дацягнуў да поля, урэзаўся ў дрэвы ў асінніку. Самалёт разваліўся на тры часткі, лётчык загінуў. Мы, дзеці, потым хадзілі на месца аварыі збіраць патроны і дэталі. Хтосьці прынёс дадому тканіну ад парашута...

**М. П.:** З зімы 1941-га па вясну 1942-га ў суседнім доме размяшчаўся штаб тылавых частей, а афіцэры жылі ў нас. У дом правялі тэлефон, і часта тэлефанавалі ў штаб фронту, у Чудава. Днём афіцэры нарады ладзілі, а начамі п’янствавалі, з бабамі шпацыравалі, песні спявалі пад гармонік, слухалі патэфон. Я сядзеў на печы, бачыў, як яны пілі: у шклянку на трацiну залівалі моцны чай, на дзве трацiны – гарэлку. Гэта называлася «пунш». Адзін афіцэр тлумачыў іншаму, маладому: «Так прыемней, мякчэй».

Мая маці гатавала ім ежу – амерыканскую тушонку, грэчку або пярлоўку з мясам у вялікіх жалезных банках. І нам, дзецям, трохі даставалася. Смачныя кансервы! Афіцэры разважалі: «Усё ж Амерыка дапамагае».

Афіцэры рэгулярна мяняліся, кожны месяц прыязджалі новыя.

**Л. І.:** У вёсцы коней не засталося, усіх забралі на вайну.

Мы, дзеці, увесь час працавалі. Напрыклад, палкамі малацілі лён – цяжкая праца! Жанчыны працавалі за мужыкоў, дзеці за жанчын... Ад голаду пастаянна хацелі спаць. Аслабелі, ледзь ногі перастаўлялі, але працавалі.

Нам выдавалі адзін мяшок збожжа на месяц – гэта дзесяць кілаграмаў. У некаторых сем’ях адразу ўсё малолі і з’ядалі, а потым галадалі. Ці то не маглі ўтрымацца, ці то баяліся, што скрадуць...

Весной откапывали мёрзлую сгнившую картошку. Её очень легко чистить — кожура сама отпадает, а внутри один крахмал. Из него на противнях пекли оладьи. В поле удавалось найти примерно одну картофелину на два метра земли. Всё у себя перекопали — потом в другие деревни ходили копать.
Питались мякиной: толкли в ступах и пекли лепёшки. Пока был запас ягод, ели мякину, толчёную с клюквой. Ели жмыхи из отрубей. В других семьях лебеду ели; от неё пухли. Ели жареный щавель с яйцом — от него тошнило. «Дудки» (сныть) сушили, резали ножом и толкли в ступах или мололи на жерновах, потом пекли лепёшки. От них мучились сильными запорами.
Одна бабка в поле работала, полола картошку, не могла утерпеть, доставала мелкие, ещё незрелые картошины и сразу ела их — сырые, зелёные, прямо с землёй. От этого и умерла, прямо в поле.
Когда косили — всё сено отдавали государству, а для себя по кустам вдоль дорог собирали сено, выпавшее из повозок. Из соломенных крыш доставали гнилую солому — давали корове. Голодная корова на ногах не стояла — её подвешивали к потолку, пропуская под животом длинный узкий ковёр-дорожку.
Мы держали корову, потому и выжили. Надо 300 литров молока сдать государству, остальное — себе. У кого коровы не было — те тоже выживали, но было гораздо тяжелее.
Умер в деревне только один человек — в семье Чуркиных, уже в августе, когда голод был не такой сильный, ягоды появились…
Бывало, военные у нас ночевали — делились сгущёнкой, тушёнкой.
Мы всю тёплую одежду — шубы, тулупы — поменяли на хлеб. Потом мама даже полотенца выменяла. Когда несла их, у неё слёзы катились из глаз, от этого мама по дороге спотыкалась, падала и роняла свою ношу.
У нас был штабель брёвен, заготовленных для постройки нового дома. В войну всё пошло на дрова.

Увесну капалі мёрзлую гнілую бульбу. Яе вельмі лёгка чысціць – лупіны самі адпадаюць, а ўнутры адзін крухмал. З яго на бляхах пяклі аладкі. У полі ўдавалася знайсці прыкладна адну бульбіну на два метры зямлі. Усё ў сябе перакапалі – потым у іншыя вёскі хадзілі капаць.
Сілкаваліся мякінай: таўклі ў ступе і пяклі аладкі. Пакуль быў запас ягад, елі мякіну, тоўчаную з журавінамі. Елі макуху з вотруб'я. У іншых сем'ях лебяду елі; ад яе пухлі. Елі смажанае шчаўе з яйкам – ад яго на ваніты цягнула. «Дудкі» (снітку) сушылі, рэзалі нажом і таўклі ў ступе або малолі на жорнах, потым пяклі аладкі. Ад іх пакутавалі на запор.
Адна бабка ў полі працавала, палола бульбу, не магла ўцярпець, выбірала дробныя, яшчэ няспелыя бульбіны, і адразу ела іх – сырыя, зялёныя, прама з зямлёй. Ад гэтага і памерла, прама ў полі.
Калі касілі – усё сена аддавалі дзяржаве, а для сябе па кустах уздоўж дарог збіралі сена, якое выпала з калёс. З саламяных стрэх даставалі гнілую салому – давалі карове. Галодная худоба на нагах не стаяла – яе падвешвалі да столі, прапускаючы пад жыватом доўгую вузкую посцілку.
Мы трымалі карову, таму і выжылі. Трэба 300 літраў малака здаць дзяржаве, астатняе – сабе. У каго каровы не было – тыя таксама выжывалі, але было значна цяжэй.
Памёр у вёсцы толькі адзін чалавек – у сям'і Чуркіна, ужо ў жніўні, калі голад быў не такі моцны, ягады з'явіліся...
Бывала, ваенныя ў нас начавалі – дзяліліся згушчонкай, тушонкай.
Мы ўсю цёплую вопратку – футры, кажухі – памянялі на хлеб. Потым мама нават ручнікі выменяла. Калі несла іх, у яе слёзы каціліся з вачэй, ад гэтага мама па дарозе спатыкалася, падала і выпускала з рук сваю ношу.
У нас быў штабель бярвёнаў, нарыхтаваных для пабудовы новага дома. У вайну ўсё пайшло на дровы.

**Н. П.:** Мякину ели — это отходы от помола зерна. Лепёшки из неё пекли. В основном питались картошкой и молоком, летом запасали грибы и ягоды на всю зиму.
**Н. П.:** Во вторую и третью военные зимы в нашей деревне размещался спецотряд. Бойцы на лыжах, в маскхалатах, вооружённые карабинами с оптическими прицелами, — невиданное дело! Они били лосей. Потом приезжали машины и забирали туши — мясо для фронта.
**Л. И.:** 9 мая 1945-го мы работали на реке, сплав гнали. Вдруг всех позвали в клуб, а там сообщили, что война закончилась. Рёв стоял, крик, вой, плач — от радости и от горя…

## После войны

**Л. И.:** После войны к нам в дом прислали белорусов. Нам сколько-то денег начислили от лесопункта, чтобы мы о приезжих заботились. Много малышей, крошечные, все грязные, вшивые. Мы затопили баню, наподдавали пару, собрали их всех в парилку, закрыли там и снаружи подперли дверь. Они с непривычки орут, плачут, ломятся — а не выйти. В бане вши надуваются, красные делаются, толстые… У них все вши и вывелись!
В деревне был паренёк один — не то чтобы дурачок, но немного с придурью. Эти ребята стали его дразнить, водой поливать. Он не выдержал — схватил палку и погнался за ними. Они от него врассыпную — кто в дом вбежал и дверь захлопнул, а кто в картошку сиганул, в ботве залег. Потом они нам рассказывали: «Мы в бульбовнике прятались!». Так смешно их речь звучала!
**Н. П.:** После войны вместо наших лошадей, отправленных на фронт, в колхоз прислали иностранных. Были монгольские лошадки — маленькие, но выносливые.

**М. П.:** Мякіну елі – гэта рэшткі ад памолу збожжа. Аладкі з яе пяклі. У асноўным сілкаваліся бульбай і малаком, летам запасаліся грыбамі і ягадамі на ўсю зіму.
**М. П.:** У другую і трэцюю ваенныя зімы ў нашай вёсцы месціўся спецатрад. Байцы на лыжах, у маскхалатах, узброеныя карабінамі з аптычнымі прыцэламі – дзіўная справа! Яны білі ласёў. Потым прыязджалі машыны і забіралі тушы – мяса для фронту.
**Л. І.:** 9 мая 1945-га мы працавалі на рацэ, сплаў гналі. Раптам усіх паклікалі ў клуб, а там паведамілі, што вайна скончылася. Роў стаяў, крык, віскат, плач – ад радасці і ад гора...

## Пасля вайны

**Л. І.:** Пасля вайны да нас у дом даслалі беларусаў. Нам крыху грошай налічылі ад лесапункта, каб мы пра прыезджых клапаціліся. Шмат дзяцей, малых зусім, усе брудныя, вашывыя. Мы затапілі лазню, пары далі, сабралі іх усіх там, зачынілі і звонку падпёрлі дзверы. Яны з непрывычкі гарланяць, плачуць, б'юцца – а не выйсці. У лазні вошы надзімаюцца, чырвоныя робяцца, тоўстыя... У іх усё вошы і павыveліся!
У вёсцы быў хлопец адзін – не тое каб дурачок, але трохі з прыдурам. Гэтыя хлопцы сталі яго дражніць, вадой паліваць. Ён не вытрымаў – схапіў палку і пагнаўся за імі. Яны ад яго ўрассыпную – хто ў дом забег і дзверы зачыніў, а хто ў бульбу сігануў, у бацвінні залёг. Потым яны нам распавядалі: «Мы ў бульбоўніку хаваліся!». Так смешна іх гаворка гучала!
**М. П.:** Пасля вайны замест нашых коней, адпраўленых на фронт, у калгас даслалі замежных. Былі мангольскія конікі – маленькія, але цягавітыя. Яны панічна баяліся лесу – не прывыклі, бо ў Манголіі голы стэп. Едуць праз лес – вушамі стрыгуць, нярвуюцца, ад кожнага шолаху кідаюцца. Калі пакінуць без нагляду – збягуць.

Они панически боятся леса — не привыкли, ведь в Монголии голая степь. Едут через лес — дёргают ушами, нервничают, от каждого шороха шарахаются. Если их оставить без присмотра — сбегут.
Были шведские кони — огромные, сильные. И цивилизованные! Едят только из кормушки, сами пастись не умеют.
**Л. И.:** Пригнали к нам скот из Германии. Лошади все больные, в лишаях. Мы их лечили.
**Л. И.:** Мы работали все, от мала до велика. По утрам по деревне ходила женщина и будила народ на работу — стучала палкой по подоконникам и громко пела:

— Вставай, дружки! Вставай, молодцы!
Вставай!
Каша сваривши, горох перепривши!
Вставай!
Каша на Паши, горох на Ояти!
Вставай!

Паша и Оять — это крупные реки на востоке области.
Мы пололи колхозные поля. Лягушек боялись до смерти! Особенно подруга Шурка: когда квакушки из грядок выскакивали, ревмя ревела, убегала! Но потом возвращалась — работать надо…
Жили весело, развлекались после работы. Был клуб, была изба-читальня, хотя в ней мы не читали, а плясали под гармошку, а мужики в домино играли. Бывало, весь день мы трудились — окучивали картошку, потом вечер и всю ночь гуляли, а поутру снова отправлялись в поля.
Мы работали, поэтому и жили неплохо. Нам завидовали, вредили. Например, однажды соседка нам картошку в погребе посолила (от этого появляется гниль).

Былі шведскія коні – велізарныя, моцныя. І цывілізаваныя! Ядуць толькі з кармушкі, самі пасвіцца не ўмеюць.
**Л. І.:** Прыгналі да нас скаціну з Германіі. Коні ўсе хворыя, у лішаях. Мы іх лячылі.
**Л. І.:** Мы працавалі ўсе, і малы і вялікі. Раніцою па вёсцы хадзіла жанчына і будзіла народ на працу – грукала палкай па падаконніках і гучна спявала:

Уставай, дружкі! Уставай, малойцы!
Уставай!
Каша зварыцца, гарох перапрэе!
Уставай!
Каша на Пашы, гарох на Аяці!
Уставай!

Паша і Аяць – гэта буйныя рэкі на ўсходзе вобласці.
Мы палолі калгасныя палі. Жаб баяліся да смерці! Асабліва сяброўка Шурка: калі якая квакуха з градкі выскоквала, ровам раўла, уцякала! Але потым вярталася – працаваць трэба...
Жылі весела, забаўляліся пасля працы. Быў клуб, была хата-чытальня, хоць у ёй мы не чыталі, а скакалі пад гармонік, а мужыкі ў даміно гулялі. Бывала, увесь дзень мы працавалі – бульбу абганялі, потым вечар і ўсю ноч гулялі, а раніцай зноў выпраўляліся ў палі.
Мы працавалі, таму і жылі нядрэнна. Нам зайздросцілі, шкодзілі. Напрыклад, аднойчы суседка нам бульбу ў склепе пасаліла (ад гэтага з'яўляецца гнілата). Прыйшлося забіць акенца склепа, каб такое не паўтаралася. А тая суседка потым неяк вывіхнула сківіцу. Давялося ёй з перакошаным тварам, з разяўленым ротам ехаць у горад у бальніцу, там ёй доктар кулаком урэзаў – і сківіца стала на месца.

Пришлось заколотить окошко погреба, чтобы такое не повторялось. А та соседка потом как-то вывихнула челюсть. Пришлось ей с перекошенным лицом, с разинутым ртом ехать в город в больницу, там ей доктор кулаком врезал — и челюсть встала на место.

**Н. П.:** После войны в деревнях воровства не было, в домах двери на замки не закрывали.

В 1947-м мы с другом ездили в Ленинград, сделали свои дела и всю ночь гуляли по городу. Ни хулиганства, ни бандитизма, бродили спокойно, бояться некого было.

**Л. И.:** В 1951 году я ждала ребёнка. Тогда беременные до последнего дня работали, иногда рожали прямо в поле во время работы. Я бедовая была, всё делала по хозяйству. Беременная ходила в Тихвин и обратно — а это 60 километров, — и ничего страшного!

Дверь в нашу избу закрывалась изнутри железной накладкой. Я дома работала на втором этаже, и, когда кто-то приходил, я, чтобы не спускаться по узкой крутой лестнице, дверь открывала ухватом, перегнувшись через перила. Однажды я потеряла равновесие, кувыркнулась через перила и упала со второго этажа. Сильно ударилась о лестницу животом, потом головой о стену… До сих пор не понимаю, как это прошло без последствий для меня и для дочери?

Ещё, беременная, шла провожать Колю в армию. На косогоре поскользнулась, упала на спину и съехала по грязи с очень длинной и крутой горы. Очевидцы говорили между собой: «До низа доедет и родит!». Ничего, тоже обошлось.

Рожала я дома, без врачей. Пришла после молотьбы, ночь промучилась и родила дочь. Кровь останавливали — холод прикладывали, внутренности мне застудили. Бабка же сама рожала — что ж она, не знала, как правильно кровь останавливать? Когда сообразили, что случилось, — хотели меня везти в город в больницу, да поняли, что не доеду, умру по дороге. Оставили дома. Ничего, выжила, как кошка! Только с тех пор печень застужена осталась.

**М. П.:** Пасля вайны ў вёсках крадзяжу не было, у дамах дзверы на замкі не зачынялі. У 1947-м мы з сябрам ездзілі ў Ленінград, зрабілі свае справы і ўсю ноч шпацыравалі па горадзе. Ні хуліганства, ні бандытызму, хадзілі спакойна, баяцца не было каго.
**Л. І.:** У 1951-м годзе я чакала дзіця. Тады цяжарныя да апошняга дня працавалі, часам нараджалі прама ў полі падчас працы. Я адчайная была, усё рабіла па гаспадарцы. Цяжарная хадзіла ў Ціхвін і назад – а гэта 60 кіламетраў – і нічога страшнага!
Дзверы ў нашу хату зачыняліся знутры жалезнай клямкай. Я дома працавала на другім паверсе, і, калі нехта прыходзіў, я, каб не спускацца па вузкай крутой лесвіцы, дзверы адчыняла вілачнікам, перагнуўшыся цераз парэнчы. Аднойчы я страціла раўнавагу, кульнулася праз парэнчы і ўпала з другога паверха. Моцна ўдарылася аб лесвіцу жыватом, потым галавой аб сцяну... Да гэтага часу не разумею, як гэта прайшло без наступстваў для мяне і для дачкі?
Яшчэ, цяжарная, ішла праводзіць Колю ў войска. На касагоры паслізнулася, завалілася на спіну і з’ехала па гразі з вельмі доўгай і крутой горкі. Відавочцы казалі паміж сабой: «Да нізу даедзе і народзіць!». Нічога, таксама абышлося.
Нараджала я дома, без лекараў. Прыйшла пасля малацьбы, ноч прамучылася і нарадзіла дачку. Кроў спынялі – холад прыкладвалі, вантробы мне застудзілі. Бабка ж сама нараджала, што ж яна, не ведала, як правільна кроў спыняць? Калі зразумелі, што здарылася – хацелі мяне везці ў горад у бальніцу, ды рашылі, што не даеду, памру па дарозе. Пакінулі дома. Нічога, выжыла, як кошка! Толькі з тых часоў пячонка застужаная засталася.
**Л. І.:** Мой брат Песа здаравушчы быў! Кроў з малаком! Падковы гнуў! Маці даіла карову, прыносіла сырадой, налівала яму збан, Песа сядаў на ганак, збан выпіваў і цэлую галаву цукру з’ядаў.

**Л. И.:** Мой брат Пеша здоровенный был! Кровь с молоком! Подковы гнул! Мать доила корову, приносила парное молоко, наливала ему кувшин, Пеша садился на крыльцо, кувшин выпивал и цельную сахарную голову съедал.
Племянник Коля, сын Пеши, после войны служивший в Германии, рассказал историю: его сослуживец однажды заметил яблоню на чьём-то участке. Забор невысокий — он залез яблок набрать… А там воровать не принято! Его убили, живот разрезали и яблоками набили — «чтобы наелся»!
**Л. И.:** Как-то раз я прихожу с работы, — а у нас телёнка увели в колхоз. Свекровь рассказала, что к ней пришли, она не пускала, а они без спроса открыли стойло, взяли телёнка за хвост и за ухо и увели. Свекровь пошла в сельсовет жаловаться: «У меня один сын на войне погиб, другой в армии служит — верните телёнка!». А телёнка уже зарезали… В итоге она вытребовала деньги.
**Н. П.:** В магазине всё меняли на яйца. Два яйца — пачка папирос. Также тряпки принимали.
**Л. И.:** Был один конь дурной, всегда идет шагом, и никак не заставить его бежать. Хоть понукай его, хоть хлещи — всё бесполезно, идёт шагом и ни на что не реагирует. А вот с горы бежит галопом, и тут уже наоборот — никак его не остановить, ни «тпру», ни хлыст не действуют. Больше всего я боялась свалиться с телеги — конь, разогнавшись под гору, не заметит, что я упала, и дальше побежит.
Была кобыла Майка. Она на всём скаку останавливается перед ямой — и седок летит через голову. Кстати, почему-то это всегда проходило без серьезных последствий для людей.
Жеребец один был как дикий! Когда бесился — убегал, носился по деревне, а весь народ прятался по домам: «Опять жеребец Трошковых буянит!». Брат Пеша — сильный очень, смелый, однажды поймал его, намотал вожжи на руку; жеребец таскал его по всей деревне, топтал… всего затрепал, тот еле жив остался.

Пляменнік Коля, сын Пешы, пасля вайны служыў у Германіі, распавёў гісторыю: яго калега аднойчы заўважыў яблыню на нечым участку. Плот невысокі – ён залез яблыкаў набраць... А там красці не прынята! Яго забілі, жывот разрэзалі і яблыкамі набілі – «каб наеўся».
**Л. І.:** Неяк прыходжу я з працы – а ў нас цяля адвялі ў калгас. Свякроў распавяла, што да яе прыйшлі, яна не пускала – а яны без дазволу адчынілі хлеў, узялі цяля за хвост і за вуха і павялі. Свякроў пайшла ў сельсавет скардзіцца: «У мяне адзін сын на вайне загінуў, другі ў арміі служыць – вярніце цяля»... А цяля ўжо зарэзалі. У выніку яна грошы выпатрабавала.
**М. П.:** У краме ўсё мянялі на яйкі. Два яйкі – пачак папярос. Анучы таксама прымалі.
**Л. І.:** Быў адзін конь благі, заўсёды ступае крокам, і ніяк не прымусіць яго бегчы. Хоць панукай яго, хоць бі – усё дарма, ідзе сабе і ні на што не рэагуе. А вось з гары бяжыць галопам, і тут ужо наадварот – ніяк яго не спыніць, ні «тпру», ні дубец не дапамагаюць. Больш за ўсё я баялася зваліцца з воза – конь, разагнаўшыся, не заўважыць, што я ўпала, і далей пабяжыць.
Была кабыла Майка. Яна на ўсім скаку спынялася перад ямай – і седакі ляцелі праз галаву. Дарэчы, чамусь гэта заўсёды праходзіла без сур'ёзных наступстваў для людзей.
Жарабец адзін быў як дзікі! Калі шалеў – уцякаў, насіўся па вёсцы, а ўвесь народ хаваўся па хатах: «Ізноў жарабец Трошкавых буяніць». Брат Пеша – моцны вельмі, смелы – аднойчы злавіў яго, наматаў лейцы на руку; жарабец цягаў яго па ўсёй вёсцы, таптаў... Усяго затузаў, той ледзь жывы застаўся. А суседа Трошку на дарозе да смерці затаптаў. Пасля гэтага ад жарабца пазбавіліся.
Аднойчы конь пасвіўся, і з травой праглынуў змяю. Нібы звар'яцеў! Бегаў па вёсцы як вар'ят, усе ад яго шарахаліся. Мужыкі з цяжкасцю злавілі каня, павалілі на зямлю, звязалі. Улілі яму ў рот сыроваткі з тытунём. Змяя выйшла.

А соседа Трошку на дороге насмерть затоптал. После этого от жеребца избавились.
Однажды конь пасся и с травой проглотил змею. Словно взбесился! Бегал по деревне как сумасшедший, все от него шарахались. Мужики с трудом поймали коня, повалили на землю, связали. Влили ему в рот сыворотки с табаком. Змея вышла.
**Л. И.:** Редкостная у нас была корова! Гнали сплав, брёвна шли по реке, а река шириной пять-семь метров. Корова паслась, увидела красивый зелёный луг на другом берегу — и переплыла. Как?! Никто не знает. Плыла, уворачиваясь от брёвен? Или шла по дну пешком под ними? Обратно её с трудом перевезли на плоту.
Бедовая была, буйная! Других коров бодала! Хозяева боялись вместе с ней своих бурёнок отпускать. Но когда начал нападать медведь — она других коров защищала, бросалась на медведя! Однажды он всё-таки ранил её, сломал позвоночник в трёх местах. Со сломанным позвоночником корова стоять не могла, ползала. Когда ей надо было в туалет — я сама её из стойла на улицу волокла, и обратно. Потом её выходили, вылечили!
— А вы на школьницу не похожи, — сказал я и понял, что сморозил ужасную глупость. Видимо, она прочла это на моём лице и не стала развивать эту тему. Мы заговорили о книгах. Она назвала свою любимую — «Замок» Франца Кафки. Мне показалось это странным, потому что Кафку невозможно было понять. В какой-то момент она назвала причину прихода в магазин. Я назвал свою. Она назвала меня Леоном. Я не понял. Я не нашёл ещё свою любимую книгу. Пока больше всех нравится Керуак и его «На дороге». «Особенно тема поиска отца», — как же я помпезно выражался, будто я известный литературный критик или старый преподаватель.

Яшчэ адно акенца загарэлася ў суседнім доме. З суседняга балкона даносіцца пах цыгарэт. Брыдкі пах цыгарэт. Але да ўсяго прывыкаеш. Не звяртаеш увагі. Уначы ён робіцца вастрэйшым, бо іншых пахаў няма. У пакоі за маёй спінай не толькі зорак, наогул нічога не відаць. Цемра перамагла. Месяца мала. Брыдкі пах цыгарэт наганяе мяне хвалямі. Святло ў акенцы згасла. Мяркую, гэта быў дзясяты паверх. Яшчэ гадзіну таму ў мяне раскалваліся скроні. Было адчуванне, што ў іх укручваюць ніты. Быццам з мяне хочуць зрабіць монстра Віктара Франкенштэйна. Боль сышоў са слязьмі.
У трэці раз мы выпадкова пабачыліся ў прадуктовай краме. Я, як звычайна, купляў два пачакі малака, ватрушкі з тварагом і какаву – яна закончылася. Што набывала яна, я не памятаю. Хоць яна казала. Я заўважыў яе першы. Не ведаў, з чаго пачаць гаворку, таму вырашыў зрабіць выгляд, што захоплена разглядаю садавіну і гародніну. Да гэтага я не бачыў яе тры дні. Прайшло пяць дзён з моманту нашай першай сустрэчы.
– Замест таго, каб чытаць «Капітанскую дачку», вы чытаеце цэннікі. Ці вы яе ўжо дачыталі? – пачуў я яе голас за спіной. Я павярнуўся і разгубіўся. Што сказаць? Відаць, трэба адказаць на пытанне.
– Я яе ўжо дачытаў. Цяпер Гогаль, «Тарас Бульба».
– Такое адчуванне, што вы школьнік.
– А вы на школьніцу не падобная, – сказаў я і зразумеў, што звёрз жахлівае глупства. Мабыць, яна прачытала гэта на маім твары і не стала развіваць тэму. Мы загаварылі пра кнігі. Яна назвала сваю любімую – «Замак» Франца Кафкі. Мне падалося гэта дзіўным, таму што Кафку немагчыма зразумець. У нейкі момант яна назвала прычыну прыходу ў краму. Я назваў сваю. Яна назвала мяне Леонам. Я не зразумеў. Я не знайшоў яшчэ сваю любімую кнігу. Пакуль больш за ўсіх падабаецца Керуак і яго «На дарозе». «Асабліва тэма пошуку бацькі» – як жа я пампезна выказваўся, быццам я вядомы літаратурны крытык або стары выкладчык.

Я чувствую, что мои глаза опухли от слёз, а нос — от бумажных салфеток. В луну я влюбился летом. Случайно увидел её днём на небе. Так удивился. Потом наблюдал за ней весь день и всю ночь.

В моём подъезде установили лампочки, которые реагируют на движение. Моя дверь находится чуть в стороне от них, поэтому мне каждый раз приходится пройти пару метров до лампочки и помахать руками. После этого могу разглядеть замочную скважину и правильную сторону ключа.

Мне сегодня было так стыдно, что хотел вернуть весь гонорар. Не сделал этого. Стал жадным. Или я таким был всегда.

Во время третьей встречи я узнал её имя, а она — моё. Я назвал ей своё настоящее имя, хотя часто представляюсь как Артём, Андрей или Артур. Внутренняя мания преследования и несуществующие теории заговора заставляют меня скрывать своё имя. Удивительно, что все псевдонимы начинаются на «А». Не знаю, из-за чего так. Почему-то я захотел предложить ей ещё раз встретиться. Затем подумал, что она ответит: мы и так встретимся в кафе. И ничего не стал предлагать. Лишь сказал: «До встречи в кафе». Она мне пожелала всего доброго. Я ушёл домой пить какао и есть ватрушки с творогом. Моя мама в детстве (в моём детстве) очень вкусно их пекла. Теперь я живу один, далеко от родителей. Ем ватрушки — вспоминаю маму.

Ночью на улице прохладно, а я сижу в одной футболке. Мне холодно. Не хочу вставать и идти за кофтой. Боюсь нарушить момент. Я так просидел уже почти три часа. Хотя точного времени не знаю. Я много чего не знаю. Некоторые люди меня считают умным. Одно время я им верил. Сейчас — нет. В данный момент — нет. И завтра не буду.

Молоко закончилось, а какао есть. Ещё закончился хлеб. Она не ест мучное — бережёт фигуру — и не пьёт молоко — аллергия. Что же она тогда покупала?

Я адчуваю, што вочы мае апухлі ад слёз, а нос – ад папяровых сурвэтак. У поўню я закахаўся летам. Выпадкова ўбачыў яе днём на небе. Так здзівіўся. Потым назіраў за ёй увесь дзень і ўсю ноч.
У маім пад’ездзе паставілі лямпачкі, якія рэагуюць на рух. Мае дзверы знаходзяцца крыху ў баку ад іх, таму мне кожны раз даводзіцца прайсці пару метраў да лямпачкі і памахаць рукамі. Пасля гэтага я магу разгледзець замок і правільны бок ключа.
Мне сёння было так сорамна, што я хацеў вярнуць увесь ганарар. Не зрабіў гэтага. Стаў сквапным. Ці я такім быў заўсёды.
Падчас трэцяй сустрэчы я даведаўся яе імя, а яна – маё. Я назваў ёй сваё сапраўднае імя, хоць часта прадстаўляюся Арцёмам, Андрэем або Артурам. Унутраная манія праследу і неіснуючыя тэорыі змовы прымушаюць мяне хаваць сваё імя. Дзіўна, што ўсе псеўданімы пачынаюцца на «А». Не ведаю, з-за чаго так. Чамусьці я захацеў прапанаваць ёй яшчэ раз сустрэцца. Потым падумаў, што яна адкажа, што мы ж і так сустрэнемся ў кавярні. І нічога не стаў прапаноўваць. Толькі сказаў: «Да сустрэчы ў кавярні». Яна мне пажадала ўсяго добрага. Я пайшоў дадому піць какаву і есці ватрушкі з тварагом. Мая мама ў дзяцінстве (у маім дзяцінстве) пякла вельмі смачныя ватрушкі. Цяпер я жыву адзін, далёка ад бацькоў. Ем ватрушкі – успамінаю маму.
Ноччу на вуліцы халаднавата, а я сяджу ў майцы. Мне холадна. Не хачу ўставаць і ісці па кофту. Баюся сапсаваць момант. Я так прасядзеў амаль тры гадзіны. Хаця дакладна час не ведаю. Я шмат чаго не ведаю. Некаторыя людзі мяне лічаць разумным. Некалі я ім верыў. Цяпер – не. У дадзены момант – не. І заўтра не буду.
Малако скончылася, а какава ёсць. Яшчэ скончыўся хлеб. Яна не есць мучнога – беражэ фігуру – і не п’е малако – алергія. Што ж яна тады купляла?
Дзень сёння не атрымаўся з самай раніцы. Пачынаючы з таго, што мне прыйшлося ўставаць а восьмай. Я рэдка ўстаю так рана. Мой сярэднестатыстычны дзень

День сегодня не задался с самого утра. Начиная с того, что мне пришлось вставать в 8 утра. Я редко встаю так рано. Мой среднестатистический день начинается в полдень. Когда я усну в эту ночь или утро, то буду спать, пока не надоест лежать в кровати. А может, я усну на полу. А может — на подоконнике. И потом ненароком вывалюсь из окна. Но со мной ничего не будет, ведь мышцы во сне расслаблены. Хотя я могу проснуться от свободного падения. $g = 9{,}8$ м/с$^2$.
В школе я впервые уснул в десятом классе на уроке физики.
Я ей об этом рассказывал.
В дни, когда я сильно устаю, начинаю ненавидеть себя больше обычного.
Спустя неделю нашего знакомства мы с ней гуляли целый день по городу. В этом городе некуда идти и не на что смотреть. Было неважно, куда мы идём и где мы идём. Важно было, что МЫ идём. Темы для разговора всплывали из ниоткуда.
Я всегда старался быть занятым. Занятым важным, как мне казалось. И если я целый день что-то делал, то я сам себе казался полезным. И поэтому я меньше ненавидел себя. Ох уж эта иллюзия полезности. Без неё моя жизнь была бы ужасной, тлетворной.
Всегда после проведения мероприятия у меня чешется голова. Мероприятия я провожу нечасто. Занимаюсь этим почти год. Открытие кинотеатра — это огромный шаг вперёд. Мог бы быть. Но это был провал. В газете можно написать «Провёл провал». Наверное, кто-нибудь и оценил бы каламбур.
Этот провал не сравнить с тем потрясением, что я испытал в 13:28. Я зачем-то посмотрел на часы на Центральной площади. Они показывали 13:28. Я никогда не забуду эти цифры. Всегда буду вздрагивать, когда увижу их на циферблате, или на табло, или на экране. Кого я обманываю. Я слишком драматизирую.
И сейчас чешется голова.
Когда рассветёт, нужно будет слезть с подоконника. Как я хочу спать! Резко напала сонливость.

пачынаецца апоўдні. Калі я засну ў гэтую ноч ці раніцу, то буду спаць, пакуль не надакучыць ляжаць у ложку. А можа, я засну на падлозе. А можа – на падаконніку. І потым незнарок выпаду з акна. Але са мной нічога не будзе, бо мышцы ў сне расслабленыя. Хаця я магу прачнуцца ад свабоднага падзення. $g = 9{,}8$ м/с$^2$. У школе я ўпершыню заснуў у дзясятым класе на ўроку фізікі.
Я ёй пра гэта распавядаў.
У дні, калі я моцна стамляюся, пачынаю ненавідзець сябе больш чым звычайна.
Праз тыдзень нашага знаёмства мы з ёй шпацыравалі цэлы дзень па горадзе. У гэтым горадзе няма куды ісці і няма на што глядзець. Было няважна, куды мы кіруемся і дзе мы крочым. Важна было, што МЫ ідзем. Тэмы для размовы ўсплывалі з ніадкуль.
Я заўсёды імкнуўся быць занятым. Занятым важным, як мне здавалася. І калі я цэлы дзень нешта рабіў, то сам сабе здаваўся карысным. І таму я менш ненавідзеў сябе. Вось ужо гэтая ілюзія карыснасці. Без яе маё жыццё было б жахлівым, нікчэмным.
Заўсёды пасля правядзення мерапрыемства ў мяне свярбіць галава. Мерапрыемствы я праводжу нячаста. Займаюся гэтым амаль год. Адкрыццё кінатэатра – гэта велізарны крок наперад. Мог бы быць. Але гэта быў правал. У газеце можна было б напісаць «Правёў правал». Напэўна, хто-небудзь і ацаніў бы каламбур.
Гэты правал не параўнаць з тым узрушэннем, што я адчуваў у 13:28. Я чамусьці паглядзеў на гадзіннік на Цэнтральнай плошчы. Ён паказваў 13:28. Я ніколі не забуду гэтыя лічбы. Заўсёды буду ўздрыгваць, калі ўбачу іх на цыферблаце, або табло, або экране. Каго я падманваю. Я занадта драматызую.
І зараз свярбіць галава.
Калі развіднее, трэба будзе злезці з падаконніка. Як я хачу спаць! Рэзка напала дрымота. На першым спатканні мы гулялі цэлы дзень. У маім заплечніку ляжала кніжка. Толькі кніга і больш нічога.

На первом свиданиии мы гуляли целый день. В моём рюкзаке лежала книжка. Только книга и больше ничего.
— Почему ты не угостишь меня мороженым? — смеясь, спросила она.
— Потому что у меня нет денег, — признался я. И она купила два — себе и мне.
В следующий раз мы пошли в кино.
Неужели это трамвай? Так поздно? Я не ослышался, это точно был трамвай. Так грохочет только он.
Мы договорились встретиться сегодня возле памятника Лермонтову в 12.00. После чего, в два часа, мне нужно было идти готовиться к проведению открытия. Она никогда не опаздывала. Приходила даже раньше назначенного времени. Опаздывал я. Опаздывал, потому что она приходила раньше времени.
Всё-таки прохладный ветер дует на высоте одиннадцатого этажа. На первом этаже такие ветра не дуют.
На первом курсе университета я был самым прилежным студентом. А на втором — нет. В университете я впервые уснул на биологии. Когда меня хотела разбудить преподаватель, мой сосед попросил не беспокоить, и она продолжила лекцию. После окончания вуза я почти не общаюсь с соседом по парте. Мы живём в разных городах. Он уехал в свой родной город. Для него он действительно родной, как город М. — для меня.
Через неделю я буду пить какао и смотреть в окно на точно такие же дома и улицы, только в городе М. Эти улицы и дома будут такими же, но лучше.
Боль в голове прошла. Слёзы больше не текут. На смену им пришла тяжесть в глазах. Веки закрываются. ПОДНИМИТЕ МНЕ ВЕКИ. Несколько часов назад я думал, что просижу на окне два-три дня. Почему я сразу не одел кофту? Или «надел»? Где вечно поправляющие люди, когда они так нужны? Что мне теперь делать?

– Чаму ты не пачастуеш мяне марозівам? – са смехам спытала яна.
– Таму што ў мяне няма грошай, – прызнаўся я. І яна купіла два – сабе і мне. У наступны раз мы пайшлі ў кіно.
Няўжо гэта трамвай? Так позна? Я не недачуў, гэта дакладна быў трамвай. Так грукоча толькі ён.
Мы дамовіліся сустрэцца сёння каля помніка Лермантаву ў 12.00. Пасля чаго, у дзве гадзіны, мне трэба было ісці рыхтавацца да правядзення адкрыцця. Яна ніколі не спазнялася. Прыходзіла нават раней за прызначаны час. Спазняўся я. Спазняўся, таму што яна прыходзіла раней часу.
Усё ж такі прахалодны вецер дзьме на вышыні адзінаццатага паверха. На першым паверсе такія не дзьмуць.
На першым курсе ўніверсітэта я быў самым руплівым студэнтам. А на другім – не. Ва ўніверсітэце я ўпершыню заснуў на біялогіі. Калі мяне хацела пабудзіць выкладчыца, сусед папрасіў не турбаваць, і яна прадоўжыла лекцыю. Пасля заканчэння ВНУ я амаль не маю зносінаў з суседам па парце. Мы жывём у розных гарадах. Ён з'ехаў у свой родны горад. Для яго ён сапраўды родны, як горад М. – для мяне.
Праз тыдзень я буду піць какаву і глядзець у акно на такія самыя дамы і вуліцы, толькі ў горадзе М. Гэтыя вуліцы і дамы будуць такімі ж, але лепей.
Боль у галаве прайшоў. Слёзы больш не цякуць. На змену ім прыйшоў цяжар у вачах. Павекі заплюшчваюцца. УЗДЫМІЦЕ МНЕ ПАВЕКІ. Некалькі гадзін таму я думаў, што прасяджу на акне два-тры дні. Чаму я адразу не апрануў кофту? Або «надзеў»? Дзе людзі, якія вечна папраўляюць, калі яны патрэбныя? Што мне цяпер рабіць?
«Чаму ты не ўладкуешся на нармальную працу?» – спытала яна. «Я ненавіджу працаваць», – адказаў я. «Але ж зараз працуеш?» – працягвала яна. «Гэта не праца», –

«Почему ты не устроишься на нормальную работу?» — спросила она. «Я ненавижу работать», — ответил я. «Но ты же сейчас работаешь?» — продолжала она. «Это не работа», — отвечал я. «Ты на ней устаешь? Значит, работа», — доказывала она. «Я устаю и когда книги читаю», — разбивал её доказательства я.
На втором свидании я постарался её удивить. Я подготовил несколько сюрпризов в кинотеатре. Специально договорился с персоналом, чтобы они мне подыграли в нужный момент.
Скоро уже должно было выглянуть солнце. Как-то я всю ночь проходил по незнакомому городу, где был в первый раз, один. Было страшно. Таким образом я ждал поезд. Мои друзья спали на полу в здании вокзала. Их я могу назвать своими друзьями. Тогда они были ими. А сейчас — не знаю.
Я никогда не гнался за прибылью. Поэтому я плохой бизнесмен. Но это дело моё, и веду его, как хочу. Со мной работают такие же энтузиасты. Кажется, я всегда был жадным.
Очень неудобно, когда тебе приходится постоянно делать несколько шагов и махать руками, чтобы закрыть входную дверь. Очень надоедает. Как и этот ветер, который с каждым разом всё противней.
В кинотеатре её ждало три сюрприза.
Первый сюрприз.
Я ждал её в кафе кинотеатра, сидя за столиком. Она пришла раньше назначенного времени, но я пришёл ещё раньше. Она села напротив меня. Мы стали говорить. Неожиданно подходит официантка и приносит вкусное пирожное. Она смотрит на меня. Я делаю удивлённое лицо в стиле «не умею играть, только переигрывать». «Я не ем мучное», — говорит она. Я убеждаю её, что одно пирожное не навредит и что она его заслужила, и что не каждому человеку неожиданно приносят пирожное. Мы смеёмся.
Конец первого сюрприза.

адказваў я. «Ты на ёй стамляешся? Значыць, праца», – даводзіла яна. – «Я стамляюся і калі кнігі чытаю», – разбіваў яе доказы я.

На другім спатканні я пастараўся яе здзівіць. Я падрыхтаваў некалькі сюрпрызаў у кінатэатры. Спецыяльна дамовіўся з персаналам, каб яны мне падыгралі ў патрэбны момант.

Хутка павінна было паказацца сонца. Неяк я ўсю ноч шпацыраваў па незнаёмым горадзе, дзе апынуўся ў першы раз, адзін. Было страшна. Я чакаў цягнік. Мае сябры спалі на падлозе ў будынку вакзала. Іх я магу назваць сваімі сябрамі. Тады яны былі імі. А цяпер – не ведаю.

Я ніколі не гнаўся за прыбыткам. Таму я дрэнны бізнэсмен. Але гэта справа мая, і я раблю яе, як хачу. Са мной працуюць такія ж энтузіясты. Здаецца, я заўсёды быў сквапным.

Вельмі нязручна, калі табе даводзіцца ўвесь час рабіць некалькі крокаў і махаць рукамі, каб зачыніць уваходныя дзверы. Вельмі надакучвае. Як і гэты вецер, што з кожным разам усё больш брыдкі.

У кінатэатры яе чакала тры сюрпрызы.

Першы сюрпрыз.

Я чакаў яе ў кавярні кінатэатра, седзячы за столікам. Яна прыйшла раней за прызначаны час, але я прыйшоў яшчэ раней. Яна села насупраць мяне. Мы сталі размаўляць. Нечакана падыходзіць афіцыянтка і прыносіць смачнае пірожнае. Яна глядзіць на мяне. Я раблю здзіўлены твар у стылі «не ўмею іграць, толькі пераігрываць». «Я не ем мучнога», – кажа яна. Я пераконваю яе, што адно пірожнае не нашкодзіць і што яна яго заслужыла, і што не кожнаму чалавеку нечакана прыносяць пірожнае. Мы рагочам.

Канец першага сюрпрызу.

Если я сейчас не одену/надену кофту, то заболею. Болезнь мне не помешает. Давно не болел. Придёт она и приготовит какао. Нет, я не должен её больше видеть. Ни за что. Через неделю я улетаю. Она не достойна того, чтобы мешать моей мечте. Самообман. Иллюзия полезности — тоже самообман. Она никогда не была в этой квартире. В этой квартире никогда не было звёзд. Она не полна звёзд. Но была темнота. Были солнце и луна.
Между свиданием в кинотеатре и сегодня — 18 дней. Из них 15 я хотел сказать, что скоро уеду. Из них 10 дней я хотел сказать, что люблю её. Меня никто никогда не любил. Никогда не говори человеку, что любишь его, ведь он может ответить, что он тебя не любит. И скорее всего, так и сделает. Сегодня я ей признался. Это была ошибка.
Второй сюрприз.
При входе в кинозал билетёрша подарила ей книгу. По ней был снят фильм, на который мы идём. Моему удивлению не было границ.
Конец второго сюрприза.
Когда сильно хочешь спать или ненавидишь себя, высота в одиннадцать этажей кажется притягательной. Уже не смотришь вдаль. Твой взгляд направлен вниз. Это из-за неё я устал и плакал. Открытие ни при чём. Какая разница, что о тебе напишут в газетах и скажут люди? Я улетаю через неделю. Там у меня будут совсем другие заботы. Как бы я хотел, чтобы не было мыслей о ней. Это книги виноваты в нашем знакомстве.
Интересно, за сколько я долечу до земли, если мой вес 70 кг? Зря я спал на уроках физики.
Сегодня мы просто гуляли. Большую часть времени молчали. Я решил ей всё рассказать. Видимо, она это подозревала. Она единственная, кто меня понимает. Кроме мамы и сестры. И моего школьного друга, которого я уже не видел три года. Она ждала, когда я наконец скажу что-то важное. Я готовился. Тяжело

Калі я цяпер не адзену/надзену кофту, то захварэю. Хвароба мне не перашкодзіць. Даўно не хварэў. Прыйдзе яна і зробіць какаву. Не, я не павінен яе больш бачыць. Ні за што. Праз тыдзень я адлятаю. Яна не вартая таго, каб перашкаджаць маёй мары. Самападман. Ілюзія карыснасці – таксама падман. Яна ніколі не была ў гэтай кватэры. У гэтай кватэры ніколі не было зорак. Яна не поўная зорак. Але была цемра. Былі сонца і месяц.
Паміж спатканнем ў кінатэатры і сёння – 18 дзён. З іх 15 я хацеў сказаць, што хутка паеду. З іх 10 дзён я хацеў сказаць, што кахаю яе. Мяне ніхто ніколі не любіў. Ніколі не кажы чалавеку, што кахаеш яго, бо ён можа адказаць, што ён цябе не. І хутчэй за ўсё, так і зробіць. Сёння я ёй прызнаўся. Гэта была памылка.
Другі сюрпрыз.
Пры ўваходзе ў кіназалу квіткарка падарыла ёй кнігу. Па ёй быў зняты фільм, на які мы ідзем. Майму здзіўленню не было межаў.
Канец другога сюрпрызу.
Калі моцна хочаш спаць ці ненавідзіш сябе, вышыня ў адзінаццаць паверхаў здаецца прыцягальнай. Ужо не пазіраеш удалячынь. Твой позірк скіраваны ўніз. Гэта з-за яе я стаміўся і плакаў. Адкрыццё ні пры чым. Якая розніца, што пра цябе напішуць у газетах і скажуць людзі? Я вылятаю праз тыдзень. Там у мяне будуць зусім іншыя клопаты. Як бы я хацеў, каб не было думак пра яе. Гэта кнігі вінаватыя ў нашым знаёмстве.
Цікава, колькі зойме мой палёт да зямлі, калі мая вага 70 кг? Дарма я спаў на ўроках фізікі.
Сёння мы проста шпацыравалі. Большую частку часу маўчалі. Я вырашыў ёй усё расказаць. Мабыць, яна гэта падазравала. Яна адзіная, хто мяне разумее. Акрамя мамы і сястры. І майго школьнага сябра, якога я ўжо тры гады не бачыў. Яна чакала, калі я нарэшце скажу нешта важнае. Я рыхтаваўся. Цяжка казаць такое. Хоць гэта проста словы.

говорить такое. Хотя это просто слова. Если я никогда никого не любил, то как я понял, что это любовь? Опять самообман? С чего вообще начать такой разговор? Нужно ли при этом стоять или идти? Или лучше сесть? А сидеть рядом или друг против друга?

Сразу два окошка загорелись в разных концах дома. Почти одновременно. Неужели это всё-таки был трамвай? Есть ощущение, что я задремал на несколько секунд или минут.

Третий сюрприз.

Он её ждал на улице. Мы уже шли на остановку, когда нас догнал мой знакомый, которого она не знала, с букетом цветов и сказал: «Девушка, вы, кажется, оставили цветы в кинотеатре». Она с удивлённой, забавной улыбкой смотрела на меня. Я чувствовал себя значимым и полезным. Иллюзия полезности.

Конец третьего сюрприза.

Наверное, скоро рассвет. Самый тёмный час перед рассветом. Ещё одно окно озарилось светом. Неужели кто-то встаёт в такую рань? Видимо, это работа заставляет их вставать в это время. Сколько же сейчас? В комнате до сих пор ничего не видно. У меня замёрзло всё: ноги, руки, лицо. Футболку заправил в штаны, но всё так же сижу на подоконнике, свесив ноги на улицу.

Мы шли по Центральной площади. Людей было мало — местные на работе, а туристы в этот город редко приезжают. Я остановился. Она тоже. Мы стоим друг против друга. Я говорю, что через неделю улетаю в город М., что уже куплен билет. Она молча смотрит на меня. Я продолжаю говорить, что это моя мечта — жить там.

— Это всё пустяки, — говорю я, — главное, что я хотел сказать… это… это. Я люблю тебя.

Что-то странное мелькнуло в её глазах. Часы на Центральной площади показывали 13:27. Я смотрел на неё. У неё было незнакомое мне выражение лица. Думаю, оно выражало сожаление. И вот она ответила.

Калі я ніколі нікога не любіў, то як я зразумеў, што гэта каханне? Зноў самападман? З чаго наогул пачынаць такую размову? Ці трэба пры гэтым стаяць або ісці? Або лепш сесці? А сядзець побач або насупраць адно аднаго?
Два акенцы запаліліся ў розных канцах дома. Амаль адначасова. Няўжо гэта ўсё ж такі быў трамвай? Адчуванне, што я задрамаў на некалькі секунд ці хвілін.
Трэці сюрпрыз.
Ён яе чакаў на вуліцы. Мы ўжо ішлі на прыпынак, калі нас дагнаў мой знаёмы, якога яна не ведала, з букетам кветак і сказаў: «Дзяўчына, вы, здаецца, пакінулі кветкі ў кінатэатры». Яна здзіўлена, з усмешкай глядзела на мяне. Я адчуваў сябе значным і карысным. Ілюзія карыснасці.
Канец трэцяга сюрпрызу.
Напэўна, хутка світанак. Самы цёмны час перад світаннем. Яшчэ адно акно азарылася святлом. Няўжо нехта ўстае ў такую рань? Мабыць, гэта праца прымушае іх уставаць у гэты час. Колькі ж цяпер? У пакоі да гэтага часу нічога не разгледзець. У мяне змерзла ўсё: ногі, рукі, твар. Майку заправіў у штаны, але ўсё гэтак жа сяджу на падаконніку, звесіўшы ногі на вуліцу.
Мы ішлі па цэнтральнай плошчы. Людзей было мала – мясцовыя на працы, а турысты ў гэты горад прыязджаюць рэдка. Я спыніўся. Яна таксама. Мы сталі твар у твар. Я кажу, што праз тыдзень адлятаю ў горад М., што ўжо набыты білет. Яна моўчкі глядзіць на мяне. Я працягваю гаварыць, што гэта мая мара – жыць там.
– Гэта ўсё дробязі, – кажу я, – галоўнае, што я хацеў сказаць... гэта... гэта. Я кахаю цябе.
Нешта дзіўнае мільганула ў яе вачах. Гадзіннік на цэнтральнай плошчы паказваў 13:27. Я глядзеў на яе. У яе быў незнаёмы мне выраз твару. Думаю, ён выказваў шкадаванне. І вось яна адказала.

Слёзы давно перестали течь и высохли. Голова перестала болеть. Она теперь тяжёлая от сонливости. Весь продрог. Я развернулся, слез с окна и закрыл его. Я виноват во всём. Я просидел всю ночь, но так и не решил, что делать. Сегодня я услышал от неё самые ужасные слова в этой ситуации. Я плотно закрыл окно. Расстелил диван и лёг под одеяло прямо в одежде. Из-за её слов не могу найти себе места. Только её слова в голове. Что теперь делать? Кажется, это было проявлением эгоизма с её стороны. Нет, это я эгоист. До сих пор думаю, что я не заслужил таких слов.
Часы на Центральной площади показали 13:28.
— Я тоже тебя люблю. Не уезжай.

Слёзы даўно перасталі цячы і высахлі. Галава перастала балець. Яна цяпер цяжкая ад дрымоты. Увесь скалеў. Я павярнуўся, злез з акна і зачыніў яго. Я вінаваты ва ўсім. Я прасядзеў усю ноч, але так і не вырашыў, што рабіць. Сёння я пачуў ад яе самыя жудасныя словы ў гэтай сітуацыі. Я шчыльна зачыніў акно. Разаслаў канапу і лёг пад коўдру прама ў вопратцы. З-за яе слоў не магу знайсці сабе месца. Толькі яе словы ў галаве. Што цяпер рабіць? Да гэтага часу думаю, што я не заслужыў такіх слоў.
Гадзіннік на цэнтральнай плошчы паказаў 13:28.
– Я таксама цябе кахаю. Не з’язджай.

**Ирина Иванникова**

Ірына Іваннікава

**Ирина Иванникова** родилась в 1985 году в Берлине, с 1990 года живёт в Рязани. Окончила лечебный факультет Рязанского государственного медицинского университета. Пишет стихи и рассказы с восьми лет, первая публикация состоялась в 1997 году — в детской областной газете «Колокольчик». Стихи для детей пишет с 2010 года. Участница Семинаров молодых писателей, пишущих для детей (2012, 2013, 2014), и Форума молодых писателей России (2013). Победитель в поэтической номинации Межрегионального конкурса «Россия, Русь! Храни себя, храни!» (2013). Лауреат литературных конкурсов: имени В. В. Карпенко (2013), «Мещёрская лира» (2013), «Каблуковская Радуга» (2014). Финалист Международного поэтического конкурса «Память сердца» (2013—2014). В 2014 году студией «МультСоюз» выпущен мультфильм «Зоомагазин» по одноимённому стихотворению автора. Финалист II Международного конкурса на лучшее произведение для детей «Корнейчуковская премия» (2014). Публиковалась в журнале «Мурзилка» (№ 7, 2014), сборнике «Ока литературная» (2004, 2007), альманахе «Литературная Рязань — 2012», сборнике «Новые сказки — 2013» (том 2). В 2013 году вышел дебютный сборник стихотворений для детей «Прогулка с божьей коровкой» (издательство «Русское слово», Рязань), ставший «Серебряным лауреатом» конкурса «Её величество — Книга», по рейтингу Международной гильдии писателей (2013).

**Ірына Іваннікава** нарадзілася ў 1985 годзе ў Берліне, з 1990 года жыве ў Разані. Скончыла лячэбны факультэт Разанскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Піша вершы і апавяданні з васьмі гадоў, першая публікацыя адбылася ў 1997 годзе – у дзіцячай абласной газеце «Званочак». Вершы для дзяцей піша з 2010 года. Удзельніца Семінараў маладых пісьменнікаў, якія пішуць для дзяцей (2012, 2013, 2014), і Форуму маладых пісьменнікаў Расіі (2013). Пераможца ў паэтычнай намінацыі Міжрэгіянальнага конкурсу «Расія, Русь! Захоўвай сябе, захоўвай!» (2013). Лаўрэат літаратурных конкурсаў: імя У. В. Карпенкі (2013), «Мяшчорская ліра» (2013), «Каблукоўская вясёлка» (2014). Фіналіст Міжнароднага паэтычнага конкурсу «Памяць сэрца» (2013–2014). У 2014 годзе студыяй «МультСаюз» выпушчаны мультфільм «Заакрама» па аднайменным вершы аўтаркі. Фіналіст II Міжнароднага конкурсу на лепшы твор для дзяцей «Карнейчукоўская прэмія» (2014). Друкавалася ў часопісе «Мурзілка» (№ 7, 2014), зборніку «Ака літаратурная» (2004, 2007), альманаху «Літаратурная Разань – 2012», зборніку «Новыя казкі – 2013» (том 2). У 2013 годзе выйшаў дэбютны зборнік вершаў для дзяцей «Шпацыр з божай кароўкай» (выдавецтва «Рускае слова», г. Разань), які стаў «Сярэбраным лаўрэатам» конкурсу «Яе вялікасць – Кніга», паводле рэйтынгу Міжнароднай гільдыі пісьменнікаў (2013).

## ВАСИЛЬКОВЫЕ ДУШИ

Лариса, молодая художница-пейзажистка, нередко бывала в Москве по профессиональным делам. На этот раз они с коллегой Мариной приехали в Златоглавую для участия в проведении благотворительной выставки картин.

Три дня командировки были расписаны по минутам, но никто и предположить не мог, что все лоты выставки-аукциона обретут своих покупателей сразу после премьерной демонстрации! Состоятельные люди, да и просто ценители искусства, не скупясь, отдавали внушительные суммы за картины малоизвестных, но многообещающих художников. Собранные средства были направлены в детские дома.

Впечатлённые успехом мероприятия, женщины решили устроить себе маленький отпуск и остаться в столице до окончания командировки. На второй же день они отправились на экскурсию по городу. После традиционного посещения Красной площади и Поклонной горы Марина неожиданно предложила подруге посетить Ваганьковское кладбище, на котором ни одна из них прежде не бывала. Лариса согласилась скрепя сердце — ей не хотелось завершать своё пребывание в Москве столь печальной нотой. Но Марина заявила, что Ваганьково — это скорее аллея славы, нежели пристанище скорби и грусти, и Лариса сдалась.

…Фотографии известных актёров, музыкантов, спортсменов, шоуменов мелькали повсюду. Нигде и никогда Лариса не встречала такого количества имён разных эпох и поколений. Многие были её современниками — Тальков, Листьев, Абдулов… С последним она мечтала познакомиться с детства, была преданной поклонницей актёра. «Вот мы и встретились, Александр Гаврилович! Жалко, что так…» — еле слышно произнесла Лариса на могиле артиста.

— Что ты там бормочешь себе под нос? — одёрнула её Марина. — Если ты немного поторопишься, мы успеем присоединиться к экскурсионной группе школьников.

## ВАСІЛЬКОВЫЯ ДУШЫ

Ларыса, маладая мастачка-пейзажыстка, нярэдка бывала ў Маскве па прафесійных пытаннях. Гэтым разам яны з калегай Марынай прыехалі ў сталіцу для ўдзелу ў правядзенні дабрачыннай выставы.

Тры камандзіровачныя дні былі распісаныя па хвілінах, але ніхто і падумаць не мог, што ўсе лоты выстаўкі-аўкцыёну здабудуць сваіх пакупнікоў адразу пасля прэм'ернай дэманстрацыі! Заможныя людзі, ды і проста знаўцы мастацтва, не вагаючыся, аддавалі вялікія сумы за карціны малавядомых, але шматабяцаючых мастакоў. Сабраныя сродкі былі адпраўлены ў дзіцячыя дамы.

Уражаныя поспехам мерапрыемства, жанчыны вырашылі наладзіць сабе маленькі адпачынак і застацца ў сталіцы да заканчэння камандзіроўкі. На другі ж дзень яны выправіліся на экскурсію па горадзе. Следам за традыцыйным наведваннем Чырвонай плошчы і Паклоннай гары Марына нечакана прапанавала сяброўцы наведаць Ваганькаўскія могілкі, на якіх ні адна з іх раней не была. Ларыса пагадзілася без ахвоты – ёй не хацелася завяршаць знаходжанне ў Маскве на такой сумнай ноце. Але Марына заявіла, што Ваганькава – гэта хутчэй алея славы, чым прыстанак смутку і маркоты, і Ларыса здалася.

...Фотаздымкі вядомых акцёраў, музыкаў, спартсменаў, шоўменаў мільгалі паўсюль. Нідзе і ніколі Ларыса не сустракала яшчэ такой колькасці вядомых асоб розных эпох і пакаленняў. Многія былі яе сучаснікамі – Талькоў, Ліснеў, Абдулаў... З апошнім яна марыла пазнаёміцца з дзяцінства, была адданай прыхільніцай акцёра. «Вось мы і сустрэліся, Аляксандр Гаўрылавіч! Шкада, што так...» – ледзь чутна прашаптала Ларыса на магіле артыста.

– Што ты там мармычаш пад нос? – гучна спытала Марына. – Калі ты трохі паспяшаешся, мы зможам далучыцца да экскурсійнай групы школьнікаў.

Лариса последовала за подругой, и вскоре они слушали, затаив дыхание, удивительные рассказы экскурсовода:
— …Обратите внимание, рядом с поэтом покоится Галина Артуровна Бениславская, большая поклонница и сподвижница Есенина. Именно здесь, спустя год после кончины Сергея Александровича, в день своего рождения, она застрелилась. Случилось две осечки, но третье нажатие на курок оказалось для молодой женщины роковым. В тот день ей исполнилось всего 29 лет.
«Как и мне тогда…» — подумала Лариса.
Марина вновь вывела подругу из задумчивости, решительно ухватив за руку.
— Пойдём, не хочется отставать от группы.
Многие надгробия поразили Ларису, затронув самые тонкие, болезненные струны души. Умершая в родах мать со своим мертворождённым ребёнком — убитый горем глава семейства поставил им памятник в виде фигуры Девы Марии с младенцем на руках. И еще одна могила… дочери известного художника Шилова. По словам экскурсовода, девочка погибла после долгой и безуспешной борьбы с лейкозом.
Лариса почувствовала, что земля уходит у неё из-под ног. Её душили рыдания, горло сковали спазмы. Не в силах больше находиться в тягостной атмосфере некрополя, она метнулась к выходу.
«Сколько лет уже прошло? — роились в голове привычные мысли. — Пять, целых пять лет. Почему я до сих пор не могу смириться?»
Слёзы текли по лицу, и Лариса по-детски утирала их рукавом свитера. Она смогла немного успокоиться лишь за кладбищенской оградой. Жизнь текла в своём прежнем неугомонном ритме, ласково улыбалось апрельское солнце. Лариса скользила безучастным взглядом по лицам прохожих, и вдруг ей показалось, что она увидела её. Короткая сиреневая ветровка, лёгкая голубая беретка, чёрные лаковые сапожки на ножках.

Ларыса рушыла следам за сяброўкай, і неўзабаве яны слухалі, стаіўшы подых, дзівосныя расповеды экскурсавода:

– ...Звярніце ўвагу, побач з паэтам спачывае Галіна Артураўна Беніслаўская, вялікая прыхільніца і паплечніца Ясеніна. Менавіта тут, праз год пасля скону Сяргея Аляксандравіча, у дзень свайго нараджэння, яна застрэлілася. Было дзве асечкі, але трэці націск на курок стаў для маладой жанчыны фатальным. У той дзень ёй споўнілася ўсяго 29 гадоў.

«Як і мне тады...» – падумала Ларыса.

Марына зноў вывела сяброўку з панылай задуменнасці, даволі груба ўхапіўшы за руку.

– Хадзем, не хочацца адставаць ад групы.

Многія надмагіллі ўразілі Ларысу, закрануўшы самыя тонкія, балючыя струны душы. Памерлая ў родах маці са сваім мёртванароджаным дзіцём – змучаны горам муж і бацька паставіў ім помнік у выглядзе фігуры Панны Марыі з немаўлём на руках. І яшчэ адна магіла... Дочкі вядомага мастака Шылава. Па словах экскурсавода, дзяўчынка памерла пасля доўгай і беспаспяховай барацьбы з лейкозам.

Ларыса адчула, што зямля сыходзіць у яе з-пад ног. Яе душылі рыданні, горла сквалі спазмы. Не здольная больш знаходзіцца ў цяжкай атмасферы некропаля, яна кінулася да выхаду.

«Колькі гадоў ужо прайшло? – ірваліся ў галаве звыклыя думкі. – Пяць, цэлых пяць гадоў. Чаму я да гэтага часу не магу змірыцца?»

Слёзы бязгучна цяклі па твары, і Ларыса па-дзіцячы выцірала іх рукавом. Яна змагла трохі супакоіцца толькі за могілкавай агароджай. Жыццё цякло ў ранейшым неўтаймаваным рытме, ласкава ўсміхалася красавіцкае сонца. Ларыса слізгала безуважным позіркам па тварах мінакоў, і раптам ёй здалося, што яна ўбачыла яе. Кароткая бэзавая вятроўка, лёгкая блакітная бярэтка, чорныя лакавыя боцікі на маленькіх ножках.

— Женька! — закричала Лариса и бросилась к девочке. Это была её дочь. Она шла под руку с высокой дамой в красном пальто.
— Женька, доченька! — схватила Лариса малышку за плечо и развернула к себе. Взгляд серо-голубых глаз девочки был полон удивления — незнакомая женщина плакала и гладила её по непослушным русым кудряшкам, торчащим из-под беретки.
— Её зовут Маша, — холодно прозвучал голос дамы в красном, лицо которой тоже показалось Ларисе знакомым. Мать резко дернула девочку за руку, увлекая за собой, и поспешила прочь от ненормальной незнакомки.
— Простите, женщина обозналась! — прозвучал им вдогонку голос Марины.
Дама не обернулась. Сиреневая курточка и красное пальто скрылись в иномарке, припаркованной неподалёку, и вскоре исчезли из виду. Марина обняла подругу и тихо проговорила:
— Ты должна смириться, милая! Жени больше нет…
Эту жестокую, убийственно-простую фразу говорили Ларисе все, кто окружал её последние пять лет. Кроме мужа. Он ушёл сразу после того, как это произошло. Лариса осталась одна.
— Неправда, неправда… — задыхалась бедная женщина, цепляясь за паутинку обманчивых слов. Девочка в сиреневой куртке была так похожа на Женю!..
Лариса снова воскресила в памяти события пятилетней давности. Они с дочерью шли на дачу вдоль огромного пшеничного поля. Малышка заметила синеющие в зелёных волнах головки васильков. Их было так много, что девочка с восторженным визгом бросилась собирать букет. Вместе с мамой они сплели чудесный венок, который Женька сразу же водрузила на свои светлые кудряшки. Лариса долго любовалась дочерью, не в силах отвести взгляд. Она ещё не знала, что это лето для девочки — последнее.
— Мам, ты чего? — засмущалась Женя.

– Жэнька! – выгукнула Ларыса і пабегла за дзяўчынкай, якая ішла пад руку з высокай дамай у чырвоным паліто.
– Жэнька, дачушка! – Ларыса за плячо павярнула малую тварам да сябе. Погляд шэра-блакітных вачэй дзяўчынкі быў поўны здзіўлення: незнаёмая цётка плакала і гладзіла яе па непаслухмяных русых кудзерках, што выбіліся з-пад бярэткі.
– Яе завуць Маша, – холадна прагучаў голас дамы ў чырвоным, твар якой таксама здаўся Ларысе знаёмым. Маці рэзка тузанула дзяўчынку за руку, цягнучы за сабой, прэч ад ненармальнай незнаёмкі.
– Выбачайце, жанчына абазналася! – прагучаў ім наўздагон голас Марыны.
Дама не азірнулася. Бэзавая куртачка і чырвонае паліто схаваліся ў іншамарцы, прыпаркаванай непадалёк, і неўзабаве зніклі з вачэй. Марына абняла сяброўку і ціха прамовіла:
– Ты мусіш змірыцца, мілая! Жэні больш няма...
Гэтую жорсткую, забойча-простую фразу казалі Ларысе ўсё, хто акружаў яе апошнія пяць гадоў. Акрамя мужа. Ён сышоў адразу пасля таго, як гэта адбылося. Ларыса засталася адна.
– Няпраўда, няпраўда... – задыхалася бедная жанчына, чапляючыся за павуцінку зманлівых слоў. Дзяўчынка ў бэзавай куртцы была так падобная на Жэню!..
Зноў ажылі ў памяці падзеі пяцігадовай даўніны. Яны з дачкой ішлі на дачу ўздоўж вялізнага пшанічнага поля. Малая заўважыла сінія галоўкі васількоў у зялёных хвалях. Іх было так шмат, што дзяўчынка з захапленнем кінулася збіраць букет. Разам з мамай яны сплялі цудоўны вянок, які Жэнька адразу ж усклала на свае светлыя кудзеркі. Ларыса доўга любавалася дачкой, не магла адвесці позірк. Яна яшчэ не ведала, што гэта лета для дзяўчынкі – апошняе.
– Мам, ты чаго? – засаромелася Жэня.

— Я только сейчас заметила, родная, что глаза у тебя, как эти цветочки, васильковые!

Спустя два месяца девятилетняя Женька на уроке физкультуры сломала руку. Лариса вначале спокойно отнеслась к случившемуся: с каким ребёнком не бывает? Но врач-рентгенолог, внимательно изучив снимок, неожиданно сообщил:

— Костная ткань лучевой кости поражена опухолью, что, собственно, и стало причиной перелома.

Женю срочно положили в онкодиспансер на обследование. Диагноз прозвучал как приговор: саркома, запущенная форма. Лариса постоянно задавала себе вопрос — за что так жестоко наказала судьба её девочку?! Ответа не было. Несколько сеансов изнурительной химиотерапии имели кратковременный положительный эффект, но рост опухоли и распространение метастазов не замедлили. Накануне Нового года Жени не стало. Она тихо заснула в своей кроватке, пожелав, как всегда, спокойной ночи родителям, и больше не проснулась.

Лариса замкнулась в себе. Она находилась в состоянии, близком к помешательству. Муж отдалился от неё и решил, что им легче будет пережить боль порознь. Ещё недавно крепкая и благополучная семья распалась. Лариса искала утешения в творчестве. В один из зимних вечеров она написала картину: до самого неба бескрайнее пшеничное поле, в центре — хрупкая фигура девочки с васильковым венком на белокурой макушке. Глаза ребёнка светятся счастьем и любовью к жизни.

Выставлять полотно Лариса наотрез отказалась, несмотря на пламенные уговоры Марины и её хвалебные отзывы.

— Напрасно прячешь свой шедевр, — не уставала увещевать Марина приятельницу. — Это лучшая твоя работа! На выставке её с руками оторвут!

– Я толькі цяпер заўважыла, родная, што вочы ў цябе, як гэтыя кветачкі, васільковыя!
Праз два месяцы дзевяцігадовая Жэнька на ўроку фізкультуры зламала руку. Ларыса спачатку спакойна паставілася да таго, што здарылася: з якім дзіцёнкам не бывае? Але ўрач-рэнтгенолаг, уважліва вывучыўшы здымак, нечакана паведаміў:
– Косцевая тканка прамянёвай касці пашкоджана пухлінай, што, уласна, і стала прычынай пералому.
Жэню тэрмінова паклалі ў анкадыспансер на абследаванне. Дыягназ прагучаў як прысуд – саркома, запушчаная форма. Ларыса пастаянна задавала сабе пытанне: за што так жорстка пакараў лёс яе дзяўчынку?! Адказу не было. Некалькі сеансаў знясільваючай хіміятэрапіі мелі кароткачасовы станоўчы эфект, але рост пухліны і распаўсюджванне метастазаў не замарудзілі. Напярэдадні Новага года Жэні не стала. Яна ціха заснула ў сваім ложку, пажадаўшы, як заўжды, дабранач бацькам, і больш не прачнулася.
Ларыса замкнулася ў сабе. Яна знаходзілася ў стане, блізкім да вар'яцтва. Муж аддаліўся ад яе і вырашыў, што ім лягчэй будзе перажыць боль паасобку. Яшчэ нядаўна моцная і шчаслівая сям'я распалася. Ларыса шукала суцяшэння ў творчасці. У адзін з зімовых вечароў яна напісала карціну: да самага неба бязмежнае пшанічнае поле, у цэнтры – далікатная постаць красуні-дзяўчынкі з васільковым вянком на бялявай галоўцы. Вочы дзіцяці свяціліся шчасцем і любоўю да жыцця.
Выстаўляць палатно Ларыса адмовілася наадрэз, нягледзячы на палымяныя ўгаворы Марыны і яе хвалебныя водгукі.
– Дарэмна хаваеш свой шэдэўр, – не стамлялася пераконваць Марына прыяцельку. – Гэта лепшая твая праца! На выставе яе з рукамі адарвуць!
Ларыса і сама выдатна ведала цану сваёй карціне – для яе яна была бясцэнная. Час ішоў, бег, імчаўся, а яе дзяўчынка ў атачэнні васількоў усё гэтак жа бесклапотна ўсміхалася, непадуладная яму.

Лариса и сама прекрасно знала цену своей картине — для неё она была бесценна. Время шло, бежало, мчалось, а ее девочка в окружении васильков всё так же беспечно улыбалась, неподвластная ему.
Расстаться с полотном Лариса смогла только теперь, ради благотворительной выставки-аукциона. Её картина возглавила тематический ряд произведений «Дети — цветы жизни» и была куплена в первые же часы за немалые деньги. Имя покупателя Лариса узнавать не пожелала. Ей было достаточно того, что вырученные средства очень пригодятся обездоленным детишкам.
…Рейсовый автобус замер в многочасовом столичном заторе. Лариса безразлично смотрела в окно, глубоко погружённая в раздумья и воспоминания.
— Похоже, мы нескоро домой приедем! — донёсся до неё тоскливый вздох Марины.
Невелика беда: спешить Ларисе некуда, да и не к кому.
— Говорят, где-то впереди авария, — продолжила Марина. — А впрочем… — махнула она рукой, видя безучастность подруги и будто жалея о сказанном.
— Вдруг там кому-то помощь нужна? — внезапно оживилась Лариса.
— Сказала на свою голову! — недовольно процедила Марина. — Тебе разве плохо сидится?
— Выпусти меня, пожалуйста! — решительно потребовала Лариса у сидевшей с краю приятельницы.
— Ладно уж, пойдём вместе! — нехотя согласилась она.
Через сотню метров их взору предстало жуткое зрелище — последствие лобового столкновения легкового автомобиля и маршрутной Газели. Маршрутка стояла с помятым бампером, и, по словам вездесущих зевак, её пассажиры отделались испугом и синяками. Второй автомобиль, вернее, то, что от него осталось, напоминал сплющенную консервную банку. Страшное ДТП случилось, по-видимому, несколько минут назад. Из разбитого водительского окошка крохотной иномарки,

Расстацца з палатном Ларыса змагла толькі цяпер, дзеля дабрачыннай выстаўкі-аўкцыёну. Яе карціна ўзначаліла тэматычны шэраг твораў «Дзеці – кветкі жыцця» і была набытая ў першыя ж гадзіны за немалыя грошы. Імя пакупніка Ларыса ведаць не пажадала. Ёй было досыць таго, што атрыманыя сродкі вельмі патрэбныя бяздольным дзецям.

...Рэйсавы аўтобус спыніўся ў шматгадзінным сталічным заторы. Ларыса абыякава глядзела ў акно, абрынутая ў роздумы і ўспаміны.

– Відаць, мы няхутка дадому прыедзем! – данёсся да яе тужлівы ўздых Марыны.

Тае бяды: спяшацца Ларысе няма куды, ды і няма да каго.

– Кажуць, недзе наперадзе аварыя, – працягнула Марына. – А, зрэшты... – махнула яна рукой, пабачыўшы безуважнасць сяброўкі і, здаецца, пашкадаваўшы пра сказанае.

– Раптам там дапамога патрэбна? – схамянулася Ларыса.

– Сказала на сваю галаву! – незадаволена працадзіла Марына. – Табе хіба кепска сядзіцца?

– Выпусці мяне, калі ласка! – рашуча запатрабавала Ларыса ў прыяцелькі, якая сядзела з краю.

– Добра ўжо, пойдзем разам! – неахвотна пагадзілася тая.

Праз пару соцень метраў перад іх вачыма паўстала жудаснае відовішча – наступства лабавога сутыкнення легкавога аўтамабіля і маршрутнай Газелі. Маршрутка стаяла з пакамечаным бамперам, і, паводле ўсюдыісных разявак, яе пасажыры абышліся спалохам і сінякамі. Другі аўтамабіль, дакладней, тое, што ад яго засталося, нагадваў спляжаную бляшанку. Страшнае ДТЗ адбылося, відаць, усяго некалькі хвілін таму. З разбітага вадзіцельскага акна маленькай іншамаркі, ненатуральна звесіўшыся, тырчала бледная жаночая рука. На асфальце з процілеглага боку валялася маленькая блакітная бярэтка.

неестественно свесившись, торчала бледная женская рука в красной материи. На асфальте с противоположной стороны валялась маленькая голубая беретка.

— О Господи! — вскрикнула Лариса, пронзённая внезапной догадкой. — Что с девочкой? Где ребёнок?

Она бросилась к спасателям. В этот момент один из них как раз вскрывал заднюю дверь автомобиля. Лариса зажала рот дрожащей ладонью.

Она смотрела и не могла произнести ни слова. На заднем сидении неподвижно застыла пристёгнутая ремнём Маша. В глазах её застыл ужас. Непостижимым образом та часть салона, где находился ребёнок, избежала смертоносной деформации. Медики осмотрели девочку, пребывавшую в состоянии шока, и серьёзных повреждений не обнаружили, а вот её маме, сидевшей за рулем, помочь не удалось — женщина умерла мгновенно. Лихорадочный взгляд Ларисы упал на предмет прямоугольной формы, зажатый между мягкими спинками переднего и заднего сидений. Он-то и спас малышке жизнь! Массивная металлическая рамка с позолотой органично дополняла дивной красоты полотно. С него, не тронутого ни единой царапиной, улыбалась девочка с васильковыми глазами…

– Божухна! – залямантавала Ларыса, працятая раптоўнай здагадкай. – Што з дзяўчынкай? Дзе дзіця?
Яна кінулася да ратавальнікаў. У гэты момант адзін з іх якраз ускрываў заднія дзверы аўтамабіля. Ларыса заціснула рот дрыготкай далонню.
Яна глядзела і не магла вымавіць ні слова. На заднім сядзенні нерухома застыла прышпіленая рэменем Маша. У вачах яе стаяў жах. Незразумелым чынам тая частка салона, дзе знаходзілася дзіця, пазбегла смяротнай дэфармацыі. Медыкі агледзелі дзяўчынку, якая знаходзілася ў стане шоку, але сур'ёзных пашкоджанняў у яе не выявілі, а вось яе маме, якая сядзела за рулём, дапамагчы не ўдалося – жанчына памерла імгненна. Ліхаманкавы позірк Ларысы ўпаў на амаль плоскі прадмет прамавугольнай формы, заціснуты паміж мяккімі спінкамі пярэдняга і задняга сядзенняў. Ён і выратаваў малой жыццё! Масіўная металічная рама з пазалотай арганічна дапаўняла дзівоснай прыгажосці палатно. З яго, не кранутая ні адзінай драпінай, усміхалася дзяўчынка з васільковымі вачыма...

**Мария Первушина**

Марыя Пярвушына

**Мария Первушина** родилась в Удмуртской Республике, в селе Дебёсы. Проучившись в школе положенные 11 лет, переехала в Пермь получать высшее образование. Сейчас – студентка пятого курса, работает. Не раз публиковалась в альманахах университетских литературных конкурсов, один раз – в пермском литературном журнале.

**Марыя Пярвушына** нарадзілася ва Удмурцкай Рэспубліцы, у сяле Дзябёсы. Адвучыўшыся ў школе патрэбныя 11 гадоў, пераехала ў Перм атрымліваць вышэйшую адукацыю. Зараз – студэнтка пятага курса, працуе. Не раз друкавалася ў альманахах універсітэцкіх літаратурных конкурсаў, аднойчы – у пермскім літаратурным часопісе.

## ТИШИНА И Я

### Глава первая

Она стучится, а я как раз натягиваю штаны. Пока ремень не приходится на своё место, она всё более нетерпеливо отбивает ритм своей маленькой костяшкой. Опять не пошла на работу, по-видимому. Конечно, если существует такая работа, на которую она могла бы пойти. Ещё в начале нашего знакомства я спросил довольно прямо о её занятии. Она рассеянно махнула рукой, думая, возможно, совершенно о другом, и сказала: «Там… Неважно». И я понял, что вытянуть из неё больше информации будет сложно.
Открываю дверь, она входит, смотрит на меня, голого по пояс, и бесцветным голосом говорит: «Опять тебе к десяти?». Притворяется, конечно. Мне всегда к десяти. Но я молчу, потому что понимаю — она опять закинулась. Другого повода быть не может. Интересуюсь, что сегодня было в её меню.
По привычке она садится на диван в большой комнате и начинает говорить. Я в это время надеваю рубашку, умываюсь и готовлю кофе. А она говорит, и её слышно везде — на кухне, в ванной. Она не обижается, если я не сажусь с ней рядом. Я даже мог бы подойти к окну и сесть на подоконник, глядя на серый город, на серое небо.
«У Ховарда словно механизм в голове, который выдаёт безупречные кадры», — говорит она, а я сижу напротив и пью кофе. Сегодня она чем-то расстроена. Это видно даже по тому, с чего начинается её рассказ — с постановки камеры и цветокоррекции. Почти каждая её пауза сопровождается тяжёлым выдохом. Она как-то сказала, что нуждается в доле печали, поэтому могу предположить, что нынешнее состояние доставляет ей удовольствие. Можно ли узнать об этом, слушая её?

## ЦІШЫНЯ І Я

### Глава першая

Яна грукае, а я якраз нацягваю штаны. Пакуль рэмень не патрапляе на сваё месца, яна ўсё больш нецярпліва адбівае рытм сваім маленькім кулачком. Відаць, зноў не пайшла на працу, калі існуе такая праца, на якую яна магла б пайсці. Яшчэ на пачатку нашага знаёмства я спытаў даволі прама пра яе заняткі. Яна разгублена махнула рукой, думаючы, магчыма, зусім пра іншае, і сказала: «Там... Няважна». І я зразумеў, што выцягнуць з яе больш інфармацыі будзе складана.

Адчыняю дзверы, яна заходзіць. Глядзіць на мяне, голага па пояс, і бясколерным голасам кажа: «Ізноў табе да дзесяці?». Прыкідваецца, вядома. Мне заўсёды да дзесяці. Але я маўчу, таму што разумею – яна зноў закінулася. Іншай нагоды быць не можа. Цікаўлюся, што сёння было ў яе меню.

После университета я устроилась на работу и поселилась в старом районе города, в доме у Южного парка. Ну, ты ведь примерно представляешь, где это. Там у меня тоже был сосед, к которому я наведывалась каждый день. Не особо искушённый в вопросе кино, он, тем не менее, вёл со мной диалоги, порой выдавая оригинальные мысли. Помогал мне писать. Но спустя полтора года моё присутствие всё-таки стало для него невыносимым, и он заменил меня собакой, с которой мог гулять по парку. То есть я была для него домашним животным, понимаешь? Вот ты сидишь дома один, работаешь, или смотришь телевизор, или ужинаешь, и в какой-то момент тебе становится не то чтобы одиноко, а просто страшно от мысли, что, кроме тебя, на свете никого нет. И вдруг твой пёс, или кошка, или крыса зашуршат пакетом, или опрокинут чашку с водой, или просто дёрнутся во сне — и твой страх уже прошёл, и ты — почти счастлив. Я не знала об этом, когда, обозлённая, переезжала сюда. А здесь узнала.
— Ты завела кошку?
— Нет. Познакомилась с тобой.
Конец истории одного киноманьяка.
История одного бухгалтера.
— А я работаю бухгалтером.
— Я догадывалась. А кем ты хотел стать?
— В смысле? Я уж не помню…
— Как печально звучит…
— Я хотел стать футболистом.
Остановки заканчиваются — нам нужно выходить.
Конец истории одного бухгалтера.

таксама быў сусед, да якога я наведвалася кожны дзень. Не надта абазнаны ў пытаннях кіно, ён, тым не менш, вёў са мной дыялогі, часам выдаючы арыгінальныя думкі. Дапамагаў мне пісаць. Але праз год з нечым мая прысутнасць усё-такі стала для яго невыноснай, і ён замяніў мяне сабакам, з якім мог шпацыраваць па парку. Гэта значыць, я была для яго хатняй жывёлай, разумееш? Вось ты сядзіш дома адзін, працуеш, або глядзіш тэлевізар, або вячэраеш, і ў нейкі момант табе становіцца не тое каб самотна, а проста страшна ад думкі, што, акрамя цябе, на свеце нікога няма. І раптам твой сабака, або котка, або пацук зашамацяць пакетам, ці перакуляць кубак з вадой, ці проста варухнуцца ўва сне – і твой страх ужо мінуў, і ты – амаль шчаслівы. Я не ведала пра гэта, калі, узлаваная, пераязджала сюды. А тут дазналася.

– Ты завяла котку?

– Не. Пазнаёмілася з табой.

Канец гісторыі аднаго кінаманьяка.

Гісторыя аднаго бухгалтара.

– А я працую бухгалтарам.

– Я здагадвалася. А кім ты хацеў стаць?

– У сэнсе? Я ўжо не памятаю...

– Як сумна гучыць...

– Я хацеў стаць футбалістам.

Прыпынкі скончыліся – нам трэба выходзіць.

Канец гісторыі аднаго бухгалтара.

## Глава пятая

Мы выходим из автобуса, я смотрю на часы и не верю своим глазам. В панике спрашиваю, сколько на её часах, и мои опасения подтверждаются. Вспоминаю, что по пути мы стояли в пробке, а я за рассказом не придал этому значения. Восклицаю: «Мои страховочные пять минут!» — и, взяв её за руку, резко тяну в направлении кинотеатра. Она спрашивает, сильно ли мы опаздываем, и я кричу ей, что очень. Мы мчимся по улице, мой красный шарф трепыхается перед лицом подобно флагу, а сзади тяжело дышит она. Мы стоим на светофоре. Бежим со всех ног по пешеходному переходу, пробираемся через лабиринт толпы, она прерывисто кричит мне, что не надо, что не хочет больше бежать, что оно того не стоит, а я кричу, чтобы она не останавливалась. Зелёный никак не загорается. Мы поднимаемся по рабочему эскалатору, как по нерабочему, на второй этаж. Я покупаю билеты, отдаю один ей, оставляю сдачу на кассе, а когда, раскрасневшиеся и запыхавшиеся, наконец, подбегаем ко входу в кинозал, обнаруживаем его закрытым. Я облегченно вздыхаю: «Успели!», — а она смотрит то на билет, то на часы, и её лицо вытягивается. «Успели? — она говорит. — Да мы, блин, первые!» Я не понимаю, что в этом плохого, а она начинает смеяться. Потом садится на стоящую рядом скамейку и смеётся там. Я пытаюсь доказать, как важно прийти первыми, что однажды в зал начали запускать за пятнадцать минут до фильма, а как-то раз вообще не стали показывать рекламу, а сразу пустили фильм, но это её ещё больше веселит. Не сказал бы, что мне было неприятно слышать её звонкий откровенный смех.

Мы входим в зал и усаживаемся на свои места. Я вижу, как она нервничает, как беспокойно оглядывается на приходящих зрителей.

— Почему так много народу? А? Что за фильм такой — «Задание 34»? — спрашивает она, а я отвечаю, что это боевик с Джейсоном Стэйтемом в главной роли, но мой голос перекрывают громкие звуки начавшейся рекламы.

## Глава пятая

Мы выходзім з аўтобуса, я гляджу на гадзіннік і не веру сваім вачам. У паніцы пытаюся, колькі на яе гадзінніку, і мае страхі пацвярджаюцца. Прыгадваю, што па дарозе мы стаялі ў пробцы, а я за аповедам не надаў гэтаму значэння. Выгукваю: «Мае страховачныя пяць хвілін!» – і, схапіўшы яе за руку, рэзка цягну ў бок кінатэатра. Яна пытаецца, ці моцна мы спазняемся, і я крычу ёй, што вельмі. Мы імчымся па вуліцы, мой чырвоны шалік трапечацца перад тварам нібыта сцяг, а ззаду цяжка дыхае яна. Мы стаім на светлафоры. Бяжым з усіх ног па пешаходным пераходзе, прабіраемся праз лабірынт з натоўпу, яна задыхана крычыць мне, што не трэба, што не хоча больш бегчы, што яно таго не варта, а я крычу, каб яна не спынялася. Зялёны ніяк не загараецца. Мы падымаемся па працуючым эскалатары, як па непрацуючым, на другі паверх. Я купляю квіткі, аддаю адзін ёй, пакідаю рэшту на касе, а калі, расчырванелыя і задыханыя, мы нарэшце падбягаем да ўваходу ў кіназалу, бачым яе зачыненай.

Я з палёгкай уздыхаю: «Паспелі!», – а яна глядзіць то на квіток, то на гадзіннік, і яе твар выцягваецца. «Паспелі? – кажа яна. – Ды мы, блін, першыя!» Я не разумею, што ў гэтым дрэннага, а яна пачынае смяяцца. Потым садзіцца на лаўку, што стаіць побач, і смяецца там. Я спрабую даказаць, як важна прыйсці першымі, што аднойчы ў залу пачалі запускаць за пятнаццаць хвілін да фільма, а неякнаогул не сталі паказваць рэкламу, а адразу пусцілі фільм, але гэта яе яшчэбольш весяліць. Не сказаў бы, што мне было непрыемна чуць яе звонкі адкрыты смех.

Мы заходзім у залу і сядаем на свае месцы. Я бачу, як яна нервуецца, як неспакойна азіраецца на іншых гледачоў. «Чаму так шмат народу? А? Што за фільм такі – “Заданне 34”?» – пытаецца яна, а я адказваю, што гэта баявік з Джэйсанам Стэйтэмам у галоўнай ролі, але мой голас перакрываюць гукі рэкламы.

— С кем? — кричит она.
— Со Стэйтемом!
Когда яркие блики экрана падают на её лицо, я вижу выражение «Что за фигня?» на языке мимики.
— Ты специально держал это в тайне?
— Да!
Она смотрит на меня большими глазами, сдерживаясь, чтобы не сказать что-то гадкое.
— Что? — кричу я серьёзно.
— Ничего! Хорошо, что ты платил, — говорит она, и я понимаю, что начинаю ей нравиться.
Первые пятнадцать минут она то и дело меняет своё положение на мягком кресле. Затем, осознав всю неизбежность происходящего, спрашивает меня цинично, позёвывая: «Героя Стэйтема уже хотят убить?». Я киваю. «Чудесненько», — реагирует она и наконец поднимает глаза на экран. Через некоторое время начинаются драки, я с интересом за ними наблюдаю, а она язвительно замечает: «Пока это единственное место, где нет халтуры». А когда в фильме появляется красивая девушка, прогнозирует: «Он с ней переспит». В сцене, где лучший друг героя желает ему удачи и машет на прощание рукой, усмехается: «Да он же и есть предатель». А при изображении полицейских, сидящих в машине, возмущается: «Где хот-доги и кофе? Почему второй тоже белый?». Я спрашиваю, неужели она никогда не позволяет себе расслабиться, а она отвечает, что обычно делает это в ванной, и что она не одна такая — режиссёры подобных фильмов именно там придумывают свои сюжетцы. Играет энергичная музыка — герой сломя голову мчится на крутой машине и сбивает указатели, а я спрашиваю, думала ли она когда-нибудь о такой жизни. Посмотрев мне в глаза, еле слышно отвечает: «Думала. Но она не для таких, как мы».

– З кім? – крычыць яна.
– Са Стэйтэмам!
Калі яркія блікі ад экрана падаюць на яе твар, я бачу выраз «Што за бздура?!» на мове мімікі.
– Ты спецыяльна трымаў гэта ў таямніцы?
– Так!
Яна глядзіць на мяне вялікімі вачыма, стрымліваючыся, каб не сказаць штось брыдкае.
– Што? – крычу я сур’ёзна.
– Нічога! Добра, што ты плаціў, – кажа яна, і я разумею, што пачынаю ёй падабацца.
Першыя пятнаццаць хвілін яна раз-пораз змяняе сваю паставу ў мяккім крэсле. Затым, усвядоміўшы ўсю непазбежнасць таго, што адбываецца, пытаецца мяне цынічна, пазяхаючы: «Героя Стэйтэма ўжо хочуць забіць?». Я ківаю. «Цудоўненька», – рэагуе яна і нарэшце пазірае на экран. Праз некаторы час пачынаюцца бойкі – я з цікавасцю за імі сачу, а яна з’едліва заўважае: «Пакуль гэта адзінае месца, дзе няма халтуры». А калі ў фільме з’яўляецца прыгожая дзяўчына, прагназуе: «Ён з ёй пераспіць». У сцэне, дзе лепшы сябар героя жадае яму поспеху і махае на развітанне рукой, пасміхаецца: «Ды ён жа і ёсць здраднік». А падчас з’яўлення паліцэйскіх, якія сядзяць у машыне, абураецца: «Дзе хот-догі і кава? Чаму другі таксама белы?». Я пытаюся, няўжо яна ніколі не дазваляе сабе расслабіцца, а яна адказвае, што звычайна робіць гэта ў ванне, і што яна не адна такая – рэжысёры падобных фільмаў менавіта там прыдумляюць свае сюжэты. Гучыць энергічная музыка – герой на злом галавы імчыцца на крутой машыне і збівае ўказальнікі, а я пытаюся, ці думала яна калі-небудзь пра такое жыццё. Паглядзеўшы мне ў вочы, ледзь чутна адказвае: «Думала. Але яно не для такіх, як мы».

За последним эффектным кадром следуют музыкальные титры — мы покидаем зал. По пути я замечаю за ней странное воодушевление — она идёт пружинистой походкой, подтанцовывая.
— Неужели терапия Стэйтемом помогла?
Она не отвечает, лишь подёргивает плечиком в такт. Выйдя в коридор, заявляет:
— Ты выбрал отличный фильм. Как раз хотела ненадолго забыть об искусстве.
— Чувствую себя медбратом.
— Почему это?
— Вывел почти безнадёжную пациентку на прогулку.
Она улыбается:
— Но я пока не видела ни деревьев, ни травы, а только Джейсона Стэйтема.
— Будет тебе трава, только потише об этом, — говорю я.
Мы выходим из кинотеатра, а на улице уже темно, и морозно, и фонари постепенно загораются. Северный ветер крепчает, под подошвами ботинок хрустит свежий снег, а над головой повисают звезды, — всё как всегда, но она идёт и радуется.
— Как будто всё это — для меня, — вздыхает она. А потом поворачивает голову и понимает, что для нас.

За апошнім эфектным кадрам ідуць музычныя цітры – мы пакідаем зал. Па дарозе я заўважаю ў ёй дзіўныя перамены – яна ідзе пруткім крокам, падтанцоўваючы.
– Няўжо тэрапія Стэйтэмам дапамагла?
Яна не адказвае, толькі паторгвае плечыкам у такт. У калідоры заяўляе:
– Ты абраў выдатны фільм. Якраз хацела ненадоўга забыцца пра мастацтва.
– Адчуваю сябе медбратам.
– Чаму гэта?
– Вывеў амаль безнадзейную пацыентку на шпацыр.
Яна ўсміхаецца:
– Але я пакуль не бачыла ні дрэў, ні травы, а толькі Джэйсана Стэйтэма.
– Будзе табе трава, толькі цішэй пра гэта, – кажу я.
Мы выходзім з кінатэатра, а на вуліцы ўжо цёмна, і марозна, і ліхтары паступова запальваюцца. Паўночны вецер мацнее, пад падэшвамі храбусціць свежы снег, а над галавой павісаюць зоркі – усё як заўсёды, але яна ідзе і радуецца.
– Як быццам усё гэта – для мяне, – уздыхае яна. А потым паварочвае галаву і разумее, што для нас.

**Елизавета Рожкова**

**Лізавета Ражкова**

**Елизавета Рожкова** родилась в небольшом городке Лысьва Пермского края. Студентка факультета журналистики Санкт-Петербургского государственного университета, ведёт активную литературную жизнь. В этом году стала членом литобъединения «Молодой Петербург», часто бывает в «Центре современной литературы и книги». В прозе старается отразить темы творчества и веры человека в себя. В 2011 году вышел первый поэтический сборник автора — «Холодно-тёплые».

**Лізавета Ражкова** нарадзілася ў невялікім мястэчку Лысьва Пермскага краю. Студэнтка факультэта журналістыкі Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта, вядзе актыўнае літаратурнае жыццё. Сёлета стала членам літаб'яднання «Малады Пецярбург», часта бывае ў «Цэнтры сучаснай літаратуры і кнігі». У прозе акцэнтуе ўвагу на тэмах творчасці і веры чалавека ў сябе. У 2011 годзе выйшаў першы паэтычны зборнік аўтаркі «Халодна-цёплыя».

## ТЫ НАЗЫВАЕШЬСЯ БОГОМ

Киносеанс закончился. Подавая пальто Лизе, я предложил проводить её до дома. Весь фильм я держал в руках её невесомое, почти несуществующее запястье. Иногда она сгибала пальцы и осторожно, будто бы нечаянно, дотрагивалась до моей руки. Про дом она ответила не сразу: два раза поправила на себе платье, проверила, не распалась ли причёска, и, только когда застегнула последнюю пуговицу, подняла на меня глаза. Лиза плакала на последней сцене — это было видно по расплывшимся на её худом лице тёмным пятнам косметики. Её своеобразной красотой мог не восхититься только незрячий.

— Я не домой, — сказала она и утопила меня в глубоких, глубже, чем любой океан, глазах.

— Провожу не до дома, — ответил я.

Мы шли, и она говорила о фильме. Не о том, кто её родители, какой она была в детстве, почему учится в университете и о чём мечтает по вечерам. Не о том, в какую бы из всех стран уехала, где бы провела старость и какие цветы её любимые. Словом, говорила не о том, о чём говорят мужчина и женщина на первых свиданиях.

Бывает, совершенно не важно, рядом с каким человеком ты окажешься, но тебе вдруг в голову западает что-то невыпадающее. Ты бы рад поддержать разговор о хорошей музыке, но, если думаешь не о музыке, ты его не поддержишь. Лиза говорила, что фильм её удивил и ей хочется побыть одной. Но для этого существует специальное место, и туда-то мы идём.

В темноте я разглядел нечто вроде церковных куполов, укрывшихся словно бы только на ночь от холода деревьями. Когда мы совсем подошли к крыльцу, я понял, что это действительно церковь. Под пиджаком я нащупал наручные часы и заметил Лизе, что для молитвы уже поздно. Но она сказала, что это не та церковь, которую мы привыкли представлять и в которую можно прийти только

## ТЫ НАЗЫВАЕШСЯ БОГАМ

Кінасеанс скончыўся. Я падаў паліто Лізе і прапанаваў правесці яе дадому. Увесь фільм я трымаў у руках яе бязважкае, амаль няіснае запясце. Часам яна згінала пальцы і асцярожна, быццам неспадзеў, дакраналася да маёй рукі. Пра дом яна адказала не адразу: два разы папраўіла сукенку, праверыла, ці не сапсавалася прычоска і, толькі калі зашпіліла апошні гузік на паліто, узняла на мяне вочы. Ліза плакала на апошняй сцэне – гэта было бачна па цёмных плямах касметыкі на яе худым твары. Яе своеасаблівай прыгажосцю мог не захапіцца толькі невідушчы.

– Я не дадому, – сказала яна і ўтапіла мяне ў глыбокіх, глыбей за любы акіян, вачах.

– Праўду не дадому, – адказаў я.

Мы ішлі, і яна гаварыла пра фільм. Не пра тое, хто яе бацькі, якой яна была ў дзяцінстве, чаму вучыцца ва ўніверсітэце і пра што марыць па вечарах. Не пра тое, у якую б з усіх краін з’ехала, дзе б правяла старасць, і якія кветкі яе любімыя. Словам, казала зусім не пра тое, пра што гавораць на першых спатканнях.

Бывае, зусім не важна, побач з якім чалавекам ты апынешся, але раптам у тваю галаву патрапляе нешта незвычайнае. Ты рады быў бы пагутарыць пра добрую музыку, але, калі думкі не пра музыку, ты і гаворкі не падтрымаеш. Ліза казала, што фільм яе здзівіў і ёй хочацца пабыць адной. Але для гэтага існуе адмысловае месца, і якраз туды мы і кіруемся.

У цемры я разгледзеў нешта накшталт царкоўных купалоў, што, здаецца, захінуліся на ноч ад холаду ў шаты дрэў. Калі мы падышлі да ганка, я зразумеў, што гэта сапраўды царква, і заўважыў, што для малітвы ўжо позна. Але Ліза сказала, што гэта не тая царква, якую мы звычайна сабе ўяўляем. А потым дадала, што не надта верыць у бога, пра якога спаконвеку пішуць у кнігах.

тогда, когда тебя будет ждать священник. А потом она добавила, что не очень-то верит в бога, про которого издревле пишут в книгах.

Я ничего не понял.

— Если правда хочешь проводить меня, подождёшь у входа? — спросила она, не объясняя мне ничего. Эта ситуация не казалась ей странной.

Я утвердительно кивнул. Ветер разливал по телу противный холод. Я спросил, можно ли подождать её прямо в церкви. Лиза не отказала, но предупредила, что внутри нет стульев. Греться можно будет только на ногах.

Что ж, это лучше, чем стать жертвой ночного ветра — без женщины рядом, которую ты держишь за запястье, он менее романтичен.

Мне показалось странным, что в церкви, куда мы с Лизой зашли, не было ни одной иконы. Не было привычного алтаря и закутка для хора. Не было даже общего паникадила.

Вместо этого я насчитал тринадцать мольбертов с картинами, прикрытыми белой бумагой. На мольбертах было написано по имени. Андрей. Филипп. Дальше не видно. Везде стояли большие, высокие подсвечники — точно такие же, как в церкви. Подсвечники были единственным напоминанием о храме. Правда, не похоже, что в них когда-либо ставили свечи.

Лиза прошла в самый дальний угол зала.

— Возьми мой шарф, ты забыла платок, — торопливо крикнул я ей в спину, а она обернулась и сказала, что это лишнее.

Я видел, как она осторожно сняла бумагу и о чём-то долго-долго, старательно и со всей душой говорила. Она неистово молилась. Хотя нарушала все порядки обращения к богу. Вышла она навстречу радостной, словно очищенной от той задумчивости и угрюмости, которую оставили ей на память час и ещё половина часа кино.

Я нічога не зразумеў.
– Калі праўда хочаш правесці мяне, пачакаеш ля ўваходу? – спытала яна, нічога мне не тлумачачы. Сітуацыя не падавалася ёй дзіўнай.
Вецер разліваў па целе непрыемны холад. Я спытаў, ці можна пачакаць яе прама ў царкве. Ліза не адмовіла, але папярэдзіла, што ўнутры няма крэслаў. Грэцца можна будзе толькі на нагах.
Што ж, гэта лепш, чым стаць ахвярай начнога ветру, – без жанчыны, якую ты трымаеш за запясце, ён меней рамантычны.

Мне падалося дзіўным, што ў царкве не было ніводнай іконы. Не было звыклага алтара і закутка для хору. Не было нават агульнага панікадзіла.
Замест гэтага я налічыў трынаццаць мальбертаў з карцінамі, закрытымі белай паперай. На кожным было напісана імя. Андрэй. Філіп. Далей не відаць. Усюды стаялі вялікія, высокія падсвечнікі: адзіны напамін пра храм. Праўда, непадобна, што ў іх калі-небудзь ставілі свечкі.
Ліза прайшла ў самы далёкі кут залы.
– Вазьмі мой шалік, ты забыла хустку, – паспешліва крыкнуў я ёй у спіну, а яна абярнулася і сказала, што гэта лішняе.
Я бачыў, як асцярожна яна зняла паперу і доўга, нібы выліваючы душу, штосьці казала. Яна апантана малілася. Хаця парушыла ўсе парадкі звароту да бога. Вярнулася да мяне яна радаснай, нібы ачышчанай ад задумення і самоты, што пакінулі па сабе гадзіна і яшчэ палова гадзіны кіно.
Мы ішлі, і яна прыгадвала выпадкі з дзяцінства, а потым тое, што ёй праснілася напярэдадні нашай сустрэчы. Ліза ўсё распавядала, распавядала, а я ўяўляў, як кожны вечар яна расчэсвае на ноч валасы, перагортвае сшытак з вершамі. Потым дапівае

Мы шли, и она вспоминала картинки из детства, а потом то, что ей приснилось накануне нашей встречи. Лиза всё рассказывала, рассказывала, а я представлял, как каждый вечер она расчёсывает на ночь волосы, перелистывает тетрадку со стихами. Потом допивает хербал, расслабляя ступни, чтобы с них легче скатывались на пол тапочки. Наконец запрыгивает на кровать и прячет ноги под тёплым одеялом.

Так она засыпает.

На следующее утро я позвонил ей и предложил увидеться. Мы встретились, и с тех пор так проходил каждый наш вечер. Она больше не заходила в церковь. Более того, когда я сам попытался найти этот храм, вспоминая по крупицам наш маршрут из кино и пытаясь угадать в домах, освещённых мягким сентябрьским солнцем, силуэты той тёмной улицы, по которой мы шли, я ничего не нашёл. Этих куполов не существовало. Не было дорожек, с которых бы виднелись те высочайшие деревья до крыши. Я решил, что забрёл не в тот район.

У Лизы я не спросил, где мы были в ту ночь. А сама она об ангелах, боге и прочем не говорила. Никогда не говорила.

В мае мы были совсем уже парой, и в первый раз она не пришла на наше излюбленное место. Парк на набережной, куда мы любили приходить пораньше, покупать, как только наступила весна, у пухлощёкой продавщицы Марьи Никитичны мягкий, свежеиспечённый хлеб, а потом бежать к реке и кидать его по щепотке уткам, впервые мне предстал во всей своей невзрачности. Тихая синяя речка, узкие дорожки вдоль, в шахматном порядке деревья — здесь никогда не бывало изысканных фонтанов, саксофонисты здесь не играли, не раскладывали футляры и шапки в этом отрезанном от городской суеты месте. Это были обыкновенный берег и обыкновенная вода. Я не знал об этом раньше.

Левый рукав я измял уже напрочь, когда прошло только тридцать минут, на которые задержалась Лиза. Трубку она не брала, и это стало серьёзным поводом

хербал, расслабляючы ступні, каб з іх лягчэй скатваліся на падлогу тапачкі. Нарэшце забіраецца ў ложак і хавае ногі пад цёплай коўдрай.
Затым яна засынае.
Наступным ранкам я патэлефанаваў ёй і прапанаваў сустрэцца. Мы спаткаліся, і з таго часу бавілі разам кожны вечар. Яна больш не заходзіла ў царкву. Больш за тое, калі сам я паспрабаваў адшукаць гэты храм, успамінаючы па кроках наш маршрут з кінатэатра і імкнучыся адгадаць у дамах, асветленых мяккім вераснёўскім сонцам, сілуэты той цёмнай вуліцы, якой мы ішлі, я нічога не знайшоў. Гэтых купалоў не існавала. Не было сцяжынак, з якіх былі б відаць тыя высокія дрэвы. Я вырашыў, што зайшоў не ў той раён. У Лізы я не спытаў, дзе мы былі ў тую ноч. А сама яна пра анёлаў, бога ды падобнае не казала. Ніколі не казала.
У маі мы былі зусім ужо парай, і ўпершыню яна не прыйшла на наша ўлюбёнае месца. Парк на набярэжнай, куды мы прыходзілі раней за ўсіх, куплялі, як толькі пачыналася адліга, у круглатварай прадаўшчыцы Мар'і Мікіцічны пульхны свежы хлеб, а потым беглі да ракі і кармілі ім качак, упершыню паўстаў перада мной ва ўсім сваім несамавітым выглядзе. Ціхая сіняя рэчка, вузкія дарожкі ўздоўж, дрэвы ў шахматным парадку – тут ніколі не было выкшталцоных фантанаў, саксафаністы тут не ігралі, не раскладалі футляры і капелюшы ў гэтым адрэзаным ад гарадской мітусні месцы. Гэта былі звычайны бераг і звычайная вада. Я не ведаў пра гэта раней.
Непрыкметна сплываў час – дзесяць хвілін, трыццаць. Слухаўку яна не брала, і мне рабілася не па сабе. Я праседзеў на лаўцы каля ракі, у спадзяванні дачакацца яе, чатыры гадзіны, здзіўляючыся ў перапынках, як я раней не заўважаў маркотнасць паркавага пейзажу. Напэўна, зімой ён быў чароўны. Але як я ні намагаўся прыпомніць гэтыя ж самыя дрэвы, каля якіх мы гулялі з Лізай вось ужо паўгода, у срэбных рукавіцах і снежных шапках, ніякага малюнка ў галаве не ўсплывала.

для моего волнения. Я просидел на лавке возле реки в надежде её дождаться четыре часа, всё в перерывах от тревоги удивляясь, как это я раньше не замечал скучность паркового пейзажа. Наверное, зимой он был волшебнее. Но как я ни старался припомнить эти же самые деревья, возле которых мы гуляли с Лизой вот уже полгода, в серебряных варежках и снежных шапках, никакая картинка не всплывала в голове.

Да, когда пошёл второй час, а Лизы всё не было, я понял, что она не придёт. Я понял, но всё равно ждал ещё два часа.

Наконец вышел из парка и поймал такси. Машина везла меня к дому Лизы — я хотел знать причину её отсутствия. Водитель ехал быстро, люди за окном превращались в кучу мелькающих вертикальных полосок. Эпизоды их жизни можно было разглядеть только на светофорах. Вот молодая женщина стоит в двух метрах от моего такси и поправляет ребёнку спавший ботинок. Так странно, что я запомню этот эпизод, потому что женщина напоминает мне материнское будущее Лизы, а сама мать никогда об этой крошечной, незначительной остановке не вспомнит. Не вспомнит, хотя будет уверять людей даже через сто лет, что бережёт в памяти каждую секунду, которую она провела со своей дочерью.

Машина остановилась, я полез в карман за деньгами, но тут же увидел, что водитель привёз меня не туда. Я поинтересовался, в чём дело, а он с весёлой улыбкой обернулся и сказал:

— Подожди, сейчас я иконку прибью. Без иконки ехать нельзя, вдруг чего. Отвалилась, ехали быстро.

Я пожал плечами. В тонне тревоги четырёх часов эти пятнадцать минут не сделали бы погоды. Что я могу сейчас предпринять? Успокоиться, расслабиться, поудобнее уткнуться в сидение. Так хорошо видно, что прибивает водитель — маленькое развлечение. Это лучше философских мыслей.

Так, калі пайшла другая гадзіна, а Лізы ўсё не было, я зразумеў, што яна не прыйдзе. Я зразумеў, але ўсё роўна чакаў яшчэ дзве гадзіны.
Нарэшце, выйшаў з парку і злавіў таксі. Машына везла мяне да дома Лізы – я хацеў дазнацца, чаму яна не прыйшла. Кіроўца ехаў хутка, людзі за акном ператвараліся ў шэраг мільгаючых вертыкальных палосак. Эпізоды іх жыцця можна было разгледзець толькі на светлафорах. Вось маладая жанчына стаіць у двух метрах ад майго таксі і папраўляе дзіцяці чаравік. Так дзіўна, што я запомню гэты эпізод, бо жанчына нагадвае мне мацярынскую будучыню Лізы, а сама маці пра гэты малюсенькі, нязначны прыпынак ніколі і не ўзгадае.
Машына спынілася, я палез у кішэню па грошы, але ўбачыў, што кіроўца прывёз мяне не туды. Я пацікавіўся, у чым справа, а ён з вясёлай усмешкай павярнуўся і сказаў:
– Чакай, я зараз абразок прымацую. Без абразка ехаць нельга, раптам што. Адваліўся, ехалі хутка.
Я пацiснуў плячыма. Пасля чатырох гадзін трывогі гэтыя пятнаццаць хвілін справу не вырашаць. Што я магу зрабіць зараз? Супакоіцца, расслабіцца, ямчэй уладкавацца на сядзенні. Каб добра бачыць, што робіць кіроўца – маленькая забаўка. Гэта лепш за філасофскія думкі.
Нечакана ён стаў прымацоўваць белую паперку, якая нагадала мне папяровыя чахлы мальбертаў, што я бачыў у царкве восенню. На паперцы было напісана «ІАН».
– Што такое ІАН? – ад здзіўлення ўва мне прачнулася смеласць і нават нахабства лезці не ў сваю справу.
– Мае ініцыялы: Іван Андрэевіч Носаў.
– А дзе абраз? Чаму толькі паперку мацуеце?
– Ён за паперкай. Усе мусяць падпісваць іконы. Хіба ты не ў курсе? – ён па-добраму крэкнуў на маё маўчанне і маё «не ў курсе». Праз дзесяць хвілін мы развіталіся каля дома Лізы.

Неожиданно он стал приколачивать белую бумажку, напомнившую мне бумажные чехлы мольбертов, которые я видел в церкви осенью. На этой бумажке было написано «ИАН».
— Что такое ИАН? — от удивления во мне проснулась смелость и даже дерзость лезть не в своё дело.
— Мои инициалы: Иван Андреевич Носов.
— А где икона? Почему только бумажку крепите?
— Она за бумажкой. Все должны подписывать иконы. Ты разве не в курсе? — он по-доброму крякнул на моё молчание и моё «не в курсе». Через десять минут мы расстались у Лизиного дома.
Лиза долго не открывала, но как только высунулась из-за двери, бросилась в руки, словно её толкнули откуда-то сзади. Она рыдала, рыдала настолько сильно, что не держали ноги.
Она не пришла, потому что сегодня не стало её мамы.
После похорон она молчала месяц. Конечно, дар речи у неё не пропал, а вот желание говорить исчезло. Она не снимала чёрное платье, некогда сшитое её мамой для выпускного вечера. Лиза думала, что это платье сшито для прощания со школой, а оказалось, что для прощания с матерью.
Лиза в горе не была эгоистичной. Ни разу она не попросила меня уйти, хотя ни разу не пригласила. Ни разу не отказалась от моих ласк. Она по-прежнему расчесывала на ночь волосы, допивала хербал и укутывалась пледом. Я всё это видел. Я видел эту же картину раньше в воображении, когда ещё не знал, как приготовляется она ко сну. Теперь это оказалось реальностью. Это было похоже на сбывшуюся мечту. Несмотря на трагедию, я чувствовал, что оба мы счастливы холодными, грустными ночами в пустом доме.
Церковь стала для нас ежедневной традицией. Я сразу вспомнил дорогу к куполам, как только мы дошли до определённой улицы. Не зная, чем занять себя внутри

Яна доўга не адчыняла, але як толькі з'явілася з-за дзвярэй, кінулася ў мае рукі, нібы яе штурханулі ззаду. Яна рыдала, рыдала настолькі моцна, што не трымалася на нагах.
Ліза не прыйшла, таму што сёння не стала яе мамы.
Пасля пахавання яна маўчала месяц. Вядома, мова ў яе не аднялася, а вось жаданне гаварыць знікла. Яна не здымала чорнай сукенкі, некалі пашытай яе мамай для выпускнога вечара. Ліза думала, што гэтая сукенка пашытая для развітання са школай, а аказалася, што для развітання з маці. Ліза ў горы не была эгаістычнай. Ні разу яна не папрасіла мяне сысці, хоць ні разу і не запрасіла. Ні разу не адмовілася ад маіх мілошчаў. Яна паранейшаму расчэсвала на ноч валасы і захутвалася ў плед. Я ўсё гэта бачыў. Я бачыў гэтую карціну раней ва ўяўленні, калі яшчэ не ведаў, як рыхтуецца яна да сну. Цяпер я бачу ўсё на яве. Гэта падобна на спраўджаную мару. Нягледзячы на трагедыю, я адчуваў, што абодва мы шчаслівыя халоднымі, самотнымі начамі ў пустым доме.
Царква стала для нас штодзённай традыцыяй. Я адразу ўспомніў дарогу да купалоў, як толькі мы дайшлі да патрэбнай вуліцы. Не ведаючы, чым заняць сябе ўнутры гэтага таямнічага месца, я проста глядзеў на Лізу. Яна часам крычала на свой так званы абраз, часам сядзела на каленях, часам моўчкі стаяла і глядзела на мальберт. Гэта магло доўжыцца гадзінамі. Гэта магло скончыцца праз пяць хвілін. У нейкі гарачы ліпеньскі дзень мы маглі не завітаць сюды зусім.
Я не ведаў, у чым сэнс малення да мальберта. Што было там намалявана, і ці было, я таксама не ведаў. Можа, там быў Езус?
Яна заўсёды выходзіла з царквы моцнай і мужнай. Яна не брала з сабой гора на прагулкі са мной, але магла галасіць каля свайго мальберта, магла ўдарыць яго.
Аднойчы я папрасіў Лізу паказаць мне яе абраз. Але яна адказала, што лепш ужо мне завесці свой і нікому не паказваць, што там намалявана. А чужыя бачыць не прынята. Нават самы блізкі чалавек не можа паглядзець на твой абраз.

этого таинственного места, я просто смотрел на Лизу. Она иногда кричала на свою так называемую икону, иногда сидела на коленях, иногда молча стояла и смотрела в мольберт. Это могло продолжаться часами. Это могло закончиться через пять минут. В какой-нибудь жаркий июльский день мы могли не прийти сюда вовсе.

Я не знал, в чём заключается смысл стаскивания белого полотна и мольбы мольберту. Что было там изображено, и было ли, я тоже не знал. Может, там был Иисус?

Она всегда выходила из церкви сильной и мужественной. Она не брала с собой горе на прогулки со мной, но могла рыдать у своего мольберта, могла ударить его.

Однажды я попросил Лизу показать мне её икону. Но она ответила, что лучше уж мне завести свою и никому не показывать, что там изображено. А чужие видеть не принято. Даже самый близкий человек не может посмотреть твою икону.

В один из таких молитвенных дней в церковь зашёл мужчина. Он был одет в протёртые джинсы и в сетчатую майку явно не первой свежести. В руках он нёс доллары. Стопка по толщине была не уже всех четырёх томов «Войны и мира». И всё-таки он не боялся нести её в руках, а не в сумке, и, по-видимому, нёс эту пачку так же и по улице. За окном не было автомобиля.

Он подошёл к мольберту с надписью «Пётр» и развернул его от меня — только потом он снял белую обертку. Я долго смотрел на него, уже потеряв интерес к молящейся Лизе. Мужчина бормотал под нос фразы, которые мне невозможно было разобрать. Я не был уверен, что он говорит сейчас по-русски. Я видел только его прыгающие брови. Они выражали сосредоточенность. Потом он накрыл мольберт бумагой и достал спички.

В одну минуту в подсвечнике сгорела целая стопка долларов.

Он вышел из церкви с улыбкой облегчения и предчувствия радости.

После сцены с долларовыми купюрами, горящими в церковном подсвечнике, мы прожили с Лизой в одной квартире ещё ровно десять лет.

Она стала матерью троих прекрасных детей.

У адзін з такіх малітоўных дзён у царкву зайшоў мужчына. Ён быў апрануты ў працёртыя джынсы і майку відавочна не першай свежасці. У руках ён нёс даляры. Стос быў таўшчынёй не менш за чатыры тамы «Вайны і міру». І ўсё ж ён не баяўся несці яго ў руках, а не ў сумцы, і, відаць, нёс гэты пачак і па вуліцы такім жа чынам. Прынамсі, за акном не было аўтамабіля.
Ён падышоў да мальберта з надпісам «Пётр» і павярнуў яго ад мяне – толькі потым зняў белую абгортку. Я доўга глядзеў на яго, ужо страціўшы цікавасць да малення Лізы. Мужчына мармытаў пад нос фразы, якія мне немагчыма было разабраць. Я не быў упэўнены, што ён гаварыў па-руску. Я бачыў толькі, як скачуць яго бровы. Яны выдавалі засяроджанасць. Потым ён накрыў мальберт паперай і выцягнуў запалкі.
За хвіліну ў падсвечніку згарэў цэлы стос даляраў.
Ён выйшаў з царквы з усмешкай палёгкі і прадчування радасці.
Пасля сцэны з далярамі, спаленымі ў падсвечніку, мы пражылі з Лізай у адной кватэры яшчэ роўна дзесяць гадоў.
Яна стала маці траіх цудоўных дзяцей.
Калі я пражыву яшчэ дзевяноста гадоў, я ўсё роўна буду казаць, што памятаю кожную секунду, праведзеную з ёй.
Ліза памерла.
Я буду казаць, што памятаю кожную секунду сваёй тугі без яе.
Калі ў нас з'явілася дзіця, Ліза ўпершыню пасля смерці маці падышла да мальберта. І ўпершыню яна смяялася, а не плакала. І нават упершыню яна забрала эмоцыю і аддала не іконе, мне – шчасце.
Я так і не ведаў, каму яна моліцца. Мне было ўсё роўна. Гэтага амаль не адбывалася, а калі адбывалася, то заўжды заканчвалася яе шчаслівай усмешкай. Яе шчаслівую ўсмешку я любіў. Яна перадала яе нашым дзецям. Я ўпэўнены, што не на генетычным

Если я проживу ещё девяносто лет, я всё равно буду говорить, что помню каждую секунду, проведённую с ней.
Лиза умерла.
Я буду говорить, что помню каждую секунду своей тоски без неё.
Когда у нас появился ребёнок, Лиза впервые после переживаний смерти матери подошла к мольберту. И впервые она смеялась, а не плакала. И даже впервые она унесла эмоцию, отданную своей иконе, мне — счастье.
Я так и не знал, кому она молится. Мне было всё равно. Этого почти не происходило, а если происходило, то всегда заканчивалось её счастливой улыбкой. Её счастливую улыбку я обожал. Она передала её нашим детям. Я уверен, что не на генетическом уровне, а на уровне светозарождения. Лиза просто умела дарить свет и любовь. Она пережила всё и не представляла свою жизнь без таких подарков.

В какой-то невзрачный осенний, а может быть, уже зимний день я совершенно случайно забрёл в знакомый район. Интересно, стоит ли там ещё Лизин мольберт? А если она не верит в бога, и я не верю тоже, то будет ли грехом то, что я приоткрою белое полотно?
На её мольберте было написано «Елизавета». Никогда не называл Лизу полным именем, и тут вдруг щёлкнуло, что Елизавета с древнееврейского означает «почитающая Бога». Какого — она никогда не говорила.
Я встал напротив этой странной и вечной для неё иконы. Никого вокруг не было. Мне ничто не мешало тут же сорвать полотно и узнать тайну. Но я постоял ещё пару минут просто так. Я играл в «угадайку». Я представлял самые знаменитые иконы. Я вспоминал те, которые целовала моя бабушка. Я думал о тех, которые помещают в учебниках. Сколько же в мире существует изображений святых?
Я стянул полотно и увидел портрет жены.
Она молилась себе.

узроўні, а на ўзроўні ўнутранага святла. Ліза проста ўмела дарыць святло і каханне. Яна перажыла ўсё і не ўяўляла свайго жыцця без такіх падарункаў.
У нейкі несамавіты восеньскі, а можа быць, ужо зімовы дзень я цалкам выпадкова завітаў у знаёмы раён. Цікава, ці стаіць там яшчэ Лізін мальберт? А калі яна не верыць у бога, і я не веру таксама, ці будзе грахом тое, што я адхіну белы покрыў?
На яе мальберце было напісана «Лізавета». Ніколі не называў Лізу поўным іменем, і тут раптам прыгадалася, што Лізавета са старажытнаяўрэйскай азначае «тая, што шануе Бога». Якога – яна ніколі не казала.
Я спыніўся насупраць гэтай дзіўнай і вечнай для яе іконы. Нікога вакол не было. Мне нішто не перашкаджала тут жа сарваць абгортку і даведацца таямніцу. Але я пастаяў яшчэ пару хвілін проста так. Я гуляў ва «ўгадайку». Я ўяўляў самыя знакамітыя абразы. Я ўспамінаў тыя, якія цалавала мая бабуля. Я думаў пра тыя, што змяшчаюцца ў падручніках. Колькі ж у свеце малюнкаў святых?
Я сцягнуў палатно і ўбачыў партрэт жонкі.
Яна малілася сабе.

**Юлия Богданова**

**Юлія Багданава**

**Юлия Богданова** родилась 14 августа 1987 года в городе Реж Свердловской области. В 16 лет впервые приняла участие в поэтическом конкурсе, в котором заняла второе место, с тех пор периодически участвует в конкурсах и фестивалях. Стихи, проза, интервью и заметки публикуются в газетах, журналах и альманахах, последняя творческая публикация (кроме рабочих) — в литературно-художественном журнале «Аврора» (г. Санкт-Петербург, № 1, 2012). Среди творческих достижений: победы в литературных конкурсах регионального, областного, всероссийского и международного уровней (в частности, лауреат Международного студенческого фестиваля «Весна ЮУрГУ — 2006» в номинации «интеллектуально-философская поэзия»). В 2007 году вышел собственный сборник «Ню: сердцевина». По образованию и профессии — литературный редактор. С 2012 года живёт и работает в Санкт-Петербурге.

**Юлія Багданава** нарадзілася 14 жніўня 1987 года ў горадзе Рэж Свярдлоўскай вобласці. У 16 гадоў упершыню прыняла ўдзел у паэтычным конкурсе, дзе заняла другое месца, з тых часоў перыядычна ўдзельнічае ў конкурсах і фестывалях. Вершы, проза, інтэрв'ю і нататкі публікуюцца ў газетах, часопісах і альманахах, апошняя творчая публікацыя (акрамя працоўных) – у літаратурна-мастацкім часопісе «Аўрора» (г. Санкт-Пецярбург, № 1, 2012). Сярод творчых дасягненняў: перамогі ў літаратурных конкурсах рэгіянальнага, абласнога, усерасійскага і міжнароднага ўзроўняў (у прыватнасці, лаўрэат Міжнароднага студэнцкага фестывалю «Вясна ПУрДУ – 2006» у намінацыі «інтэлектуальна-філасофская паэзія»). У 2007 годзе выйшаў уласны зборнік «Ню: сарцавіна». Паводле адукацыі і прафесіі – літаратурны рэдактар. З 2012 года жыве і працуе ў Санкт-Пецярбургу.

## ВЧЕРА Я ВИДЕЛ

Вчера я видел, как человека выбросили в мусорку. Это была какая-то женщина. Одетая наспех, в белой замыленной футболке, она явно спешила побыстрее выбросить его и убежать. Я поэтому и обратил на неё внимание: её нетерпение бросалось в глаза, точнее, даже не нетерпение, а лихорадочное отсутствие терпения. Она неуклюже бежала к мусорному контейнеру, обогнала меня, взвихрила после себя тонны пыли. «Зачем же так бежать? — подумал я. — Вроде контейнеры открыты с утра до вечера», — и недовольно покосился на свои белые, по-настоящему белые, только что отутюженные брюки: ну конечно, вся пыль теперь осела на них. Я чертыхнулся, остановился и стал отряхиваться, пришлось опустить мешок на землю. Когда я поднял голову, она уже стояла около контейнера и, неловко взмахнув плечом, сбросила человека в мусорный бак. Он был полон, поэтому человек наполовину высунулся оттуда, свесив одну руку и туловище вместе с головой. Женщина не шелохнулась, чтобы поправить, просто стояла и смотрела на него. Я уже подходил ближе, как она встрепенулась, услышав мои шаги. Обернув усталое лицо, она тут же отвернулась и резко вскинула руку и, клянусь, хотела ударить человека по лицу, но где-то в паре сантиметров остановила ладонь и как-то судорожно погладила его. Похоже, я помешал. Видимо, изначально ему предназначался удар, а потом прощение. Но что теперь — мне тоже нужно выбросить своё. Я всегда раньше старался уступать людям, отодвигался в сторону, чтобы дать пройти, ждал подходящего момента, чтобы сказать, чего я хочу, думал о том, каково будет другому человеку. Пока не понял, что моя жизнь идёт к чёртовому концу и, отодвигая себя в сторону ради интересов других, я так и сдохну, расшаркиваясь перед каждым встречным, в надежде, что мои интересы будут также замечены кем-то другим. Кем-то другим, кому на меня плевать.

# УЧОРА Я БАЧЫЎ

Учора я бачыў, як чалавека выкінулі ў сметніцу. Гэта была нейкая жанчына. Апранутая спехам, у белай замыленай футболцы, яна відавочна спяшалася хутчэй выкінуць яго і ўцячы. Я таму і звярнуў на яе ўвагу: яе нецярпенне кідалася ў вочы, дакладней нават не нецярпенне, а ліхаманкавая адсутнасць цярпення. Яна нязграбна бегла да смеццевага кантэйнера, абагнала мяне, узвіхурыла за сабою тоны пылу. «Навошта ж так бегчы? – падумаў я. – Здаецца, кантэйнеры адчыненыя з раніцы да вечара». І незадаволена зірнуў на свае белыя, па-сапраўднаму белыя, толькі што адпрасаваныя штаны: ну вядома ж, увесь пыл цяпер асеў на іх. Я мацюкнуўся, спыніўся і пачаў абтрэсвацца, нават давялося апусціць мяшок на зямлю. Калі я ўзняў галаву, жанчына ўжо стаяла каля кантэйнера і нязграбным рухам закінула чалавека ў смеццевы бак. Ён быў поўны, таму чалавек напалову высунуўся адтуль, звесіўшы адну руку і тулава разам з галавой. Жанчына не зварухнулася, каб паправіць, проста стаяла і глядзела на яго. Я падыходзіў бліжэй, калі яна страпянулася, учуўшы мае крокі. Павярнуўшы да мяне стомлены твар, яна тут жа адвярнулася, рэзка ўскінула руку і, прысягаю, хацела ударыць чалавека па твары, але ў пары сантыметраў спыніла далонь і неяк сутаргава пагладзіла яго. Падобна на тое, што я перашкодзіў. Мабыць, першапачаткова яму прызначаўся ўдар, а потым прабачэнне. Але што цяпер – мне таксама трэба выкінуць сваё. Я заўсёды раней стараўся саступаць людзям, адсоўваўся ў бок, каб даць прайсці, чакаў прыдатнага моманту, каб сказаць, чаго я хачу, думаў пра тое, як прыемна будзе іншаму чалавеку. Пакуль не зразумеў, што маё жыццё ідзе да чортавага канца і, адсоўваючы сябе ў бок дзеля інтарэсаў іншых, я так і здохну, расшаркваючыся перад кожным сустрэчным, у надзеі, што мае інтарэсы будуць таксама заўважаныя кімсьці іншым. Кімсьці іншым, каму на мяне пляваць.

Я невозмутимо приблизился, кашлянул и втиснулся рядом с ней, чтобы аккуратно сложить свой мешок в бак. Она всё ещё держала руку на щеке человека. Но когда я взглянул ей в лицо, то увидел там отвращение и гнев. Мне стало не по себе, как будто я вторгнулся во что-то интимное. Ведь ладонь её была нежно обвита вокруг его лица — ладонь, предназначенная для других. Лицо же принадлежало ей одной — то, чем является каждый человек, когда находится наедине с собой. И как часто то, что видят другие, является страшной противоположностью тому, что знает о себе сам человек. Я стал поправлять свой мешок, чтобы утрамбовать его как можно тщательнее, я представлял, сколько людей каждый день ходят к мусорному контейнеру, и мне не хотелось, чтобы из-за моей небрежности кому-то не хватило места. Проклятая услужливость, мне же ещё в бар идти, не хватало уделать брюки окончательно. Но, знаете, это всё-таки неприятное зрелище, когда утром, выходя на работу, видишь, как вокруг контейнера как попало валяются мешки или вырастают рядом уродливой горкой.
Я закончил и вдруг заметил, что женщины уже нет. Она ушла. Я пожал плечами, собрался идти, но мой взгляд упал на человека, которого она так неряшливо бросила. «О, чёрт, Том, ну хватит, какое тебе дело! У тебя сегодня был трудный день, надо расслабиться, забыть её». Через минуту мои пальцы уже старательно впихивали человека в контейнер, я даже вспотел: «Какой он тяжёлый! Может, поэтому она его выбросила, что много жрал». Я пытался сложить его аккуратно, нога к ноге, чтобы освободить место для других, но бросил эту затею: ну ладно хоть рука с головой уже не торчат. И вдруг увидел приятеля, он двигался к контейнеру с довольно большим мешком и уже издали махал мне рукой. Я поспешно помахал в ответ и тут же ретировался. Сейчас ещё начнет расспрашивать меня, что случилось и почему так быстро. Не рассказывать же, что я застукал её целующейся в баре с другим. Не трагедия, знакомы были всего месяц, но всё же неприятно. Хорошо, что мешок у меня был припасен

Я спакойна наблізіўся, кашлянуў і ўціснуўся побач з ёй, каб акуратна ўкласці свой мяшок у бак. Яна ўсё яшчэ трымала руку на шчацэ чалавека. Але, калі я зазірнуў ёй у твар, я ўбачыў там агіду і гнеў. Мне стала няёмка, як быццам я пабачыў штосьці інтымнае. Бо далонь яе пяшчотна ляжала на яго твары – далонь, прызначаная для іншых. Твар жа належаў ёй адной – тое, чым з'яўляецца чалавек, калі знаходзіцца сам-насам з сабой. І як часта тое, што бачаць іншыя, з'яўляецца страшнай супрацьлегласцю таго, што ведае пра сябе сам чалавек. Я стаў папраўляць свой мяшок, каб утрамбаваць яго як мага лепш, я ўяўляў, колькі людзей кожны дзень ходзяць да смеццевага кантэйнера, і мне не хацелася, каб з-за маёй нядбайнасці камусьці не хапіла месца. Праклятая паслужлівасць, мне ж яшчэ ў бар ісці, не хапала ўпэцкаць штаны канчаткова. Але, ведаеце, гэта ўсё ж такі непрыемнае відовішча, калі раніцай, выходзячы на працу, бачыш, як вакол кантэйнера валяюцца мяшкі або як яны вырастаюць побач выродлівай горкай.
Я скончыў і раптам заўважыў, што жанчыны ўжо няма. Яна пайшла. Я паціснуў плячыма, сабраўся ісці, але мой позірк спыніўся на чалавеку, якога яна так неахайна кінула. «О, чорт, Том, ну хопіць, што табе за справа! У цябе сёння быў цяжкі дзень, трэба расслабіцца, забыцца пра яе». Праз хвіліну мае пальцы ўжо старанна запіхвалі чалавека ў кантэйнер, я нават узмакрэў – «Які ён цяжкі! Можа, таму яна яго і выкінула, што шмат жор». Я спрабаваў скласці яго акуратна, нага да нагі, каб вызваліць месца для іншых, але кінуў гэтую задуму: ну добра хоць рука з галавой ужо не тырчаць. І раптам убачыў прыяцеля, ён рухаўся да кантэйнера з даволі вялікім мяшком і ўжо здалёк махаў мне рукой. Я паспешліва махнуў у адказ і тут жа рэціраваўся. Цяпер яшчэ пачне распытваць мяне, што здарылася і чаму так хутка. Не распавядаць жа, што я застукаў яе ў бары за пацалункамі з іншым. Не трагедыя, знаёмыя былі ўсяго месяц, але ўсё ж непрыемна. Добра, што мяшок

заранее, как раз под её размер. Я подсчитал в уме, сколько заплатил за прошлый год, — нехило. Так и никакой зарплаты не напасёшься, может, ну его к чёрту — побыть одному пока, а то с каждым годом цена за пользование контейнером увеличивается раза в два. Таким образом правительство борется за идеалы постоянства. Я хмыкнул.

В памяти всплыло лицо той женщины, вероятно, у неё была веская причина для такого отчаянного гнева, как же стремительно она хотела избавиться от человека, что даже выбежала из дома в чём попало. Так бывает, когда внезапно открывается что-то невыносимое, что-то, чего не хочешь замечать, чего избегаешь, но вот оно вдруг обрушивается во всей своей голой сути, и всё, чего хочется в этот момент, — уничтожить малейший след, напоминающий о твоей ошибке, не оставить ни секунды на объяснения, сбежать, пока желание простить не закралось в душу. Не то что я — весь вечер наглаживал брюки, а в коридоре ещё вчера было приготовлено на выброс моё маленькое (и в буквальном смысле, и в переносном) разочарование. Но всё равно, что бы там у неё ни случилось, это не оправдывает того, что она даже не удосужилась упаковать человека как следует. В конце концов, иметь нужно уважение к другим людям. Если уж к этому человеку его не осталось.

А интересно, он уже знает, что его выбросили? Вряд ли, такое обнаруживается не сразу. Узнать, что ты стал чьим-то разочарованием, таким способом — ведь она его даже не предупредила, я уверен, — довольно неприятно. Не берусь осуждать, но люди многослойны. Становясь ближе и снимая слой за слоем, чего вы, собственно, ждёте? Близость требует пересмотра ожиданий: чем ближе к кому-то подходишь, тем большим количеством ожиданий нужно жертвовать. И, подойдя к кому-то с одной стороны, не стоит забывать, что есть ещё и другая. Та, что может очень не понравиться.

Надеюсь, она меня аккуратно упаковала.

у мяне быў прыхаваны загадзя, якраз пад яе памер. Я падлічыў у думках, колькі выдаткаваў за мінулы год, – нямала. Так ніякай зарплаты не напасешся, можа, ну яго – пабыць аднаму пакуль, а то з кожным годам цана за карыстанне кантэйнерам павялічваецца разы ў два. Такім чынам урад змагаецца за ідэалы пастаянства. Я хмыкнуў.

У памяці ўсплыў твар той жанчыны, верагодна, у яе была важная нагода для такога адчайнага гневу, як жа імкліва яна хацела пазбавіцца ад чалавека, што нават выбегла з хаты ў чым была. Гэтак здараецца, калі раптам адкрываеш нешта нясцерпнае, штосьці такое, чаго не хочаш заўважаць, чаго пазбягаеш, але вось яно – раптоўна абрынаецца на цябе ва ўсёй сваёй голай сутнасці, і ўсё, чаго хочацца ў гэты момант, – знішчыць найменшы след, які нагадвае пра тваю памылку, не пакінуць ні секунды на тлумачэнні, збегчы, пакуль жаданне прабачыць не закралася ў душу. Не тое, што я – увесь вечар напрасоўваў штаны, а ў калідоры яшчэ ад учора было прыгатавана на выкід маё маленькае (і ў літаральным сэнсе, і ў пераносным) расчараванне. Але ўсё роўна, што б там у яе ні здарылася, гэта не апраўдвае таго, што яна нават не знайшла час запакаваць чалавека як след. Урэшце рэшт, трэба мець павагу да іншых людзей. Калі ўжо да гэтага чалавека яе не засталося.

А цікава, ён ужо ведае, што яго выкінулі? Наўрад ці, такое выяўляецца не адразу. Даведацца, што ты стаў нечым расчараваннем, такім чынам – бо яна яго нават не папярэдзіла, я ўпэўнены, – даволі непрыемна. Не бяруся асуджаць, але людзі шмат слойныя. Набліжаючыся і здымаючы пласт за пластом, чаго вы, уласна, чакаеце? Блізкасць патрабуе перагляду чаканняў: чым бліжэй да некага падыходзіш, тым большай колькасцю чаканняў трэба ахвяраваць. І, падышоўшы да кагосьці з аднаго боку, не варта забываць, што ёсць яшчэ і іншы. Той, што можа вельмі не спадабацца.

Спадзяюся, яна мяне акуратна запакавала.

Я зашёл в бар и попросил бармена плеснуть мне виски в стакан. Всё-таки славно, что я улизнул от Мёрдока. Я, кажется, понимаю эту женщину, не надо было подходить к ней: зачем кому-то быть свидетелем твоего разочарования. В следующий раз буду ждать, пока не уйдут. Не буду мешать. В конце концов, каждому из нас необходима минутка уединения, когда мы выбрасываем кого-то из своей жизни.

Я зайшоў у бар і папрасіў бармэна лінуць віскі ў шклянку. Цудоўна ўсё-такі, што я ўцёк ад Мёрдака. Я, здаецца, разумею гэтую жанчыну, не трэба было падыходзіць да яе: навошта камусьці быць сведкам твайго расчаравання. Наступным разам буду чакаць, пакуль не сыдуць. Не буду перашкаджаць. Урэшце рэшт, кожнаму з нас неабходна хвілінка адзіноты, калі мы выкідаем кагосьці са свайго жыцця.

## МОЛОДЫЕ БЕЛОРУССКИЕ ПИСАТЕЛИ

## МАЛАДЫЯ БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ

| | |
|---|---|
| Екатерина Федотова | Кацярына Фядотава |
| Виктория Синюк | Вікторыя Сінюк |
| Алена Папко | Алёна Папко |
| Андрей Диченко | Андрэй Дзічэнка |
| Алексей Старухин | Аляксей Старухін |
| Вячеслав Котов | Вячаслаў Котаў |

**Екатерина Федотова**

**Кацярына Фядотава**

**Екатерина Федотова** родилась и выросла в деревне Сапеги Сенненского района Витебской области. Окончив школу, поступила в музыкальное училище города Новополоцка по классу «Хоровое дирижирование. Народный вокал». После училища окончила заочно Белорусский государственный университет культуры и искусств по той же специальности. С 2012 года возглавляет Центр ремёсел и традиционной культуры города Новополоцка. Печаталась в таких изданиях Беларуси, как «ЛіМ», «Маладосць» и др.

**Кацярына Фядотава** нарадзілася і вырасла ў вёсцы Сапегі Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Скончыўшы школу, паступіла ў музычнае вучылішча горада Наваполацка па класе «Харавое дырыжыраванне. Народны вакал». Пасля вучылішча скончыла завочна Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў па той жа спецыяльнасці. З 2012 года ўзначальвае Цэнтр рамёстваў і традыцыйнай культуры горада Наваполацка. Друкавалася ў такіх выданнях Беларусі, як «ЛіМ», «Маладосць» і інш.

## МАРЬИНА ОСЕНЬ

Ветер постучал в стекло яблоневым суком, и Марья в очередной раз пожалела, что не спилила его: не дай бог выбьет стекло. Оно и так чуть держалось, заклеенное пластырем аж в трёх местах, а при особенно сильном ветре звенело жалобно и тонко. Марья тяжело поднялась, припала лицом к холодному окну, молча вглядываясь в осеннюю темноту. А там — глухой и слепой ноябрьский рассвет — хоть глаз выколи... Где ты теперь найдёшь ту пилу в сараюшке... Едва переставляя ноги, Марья добралась до кровати и села, долго, постариковски, приноравливаясь, чтоб прилечь. Но опять разболелся бок — не полежишь. За ночь ветер выстудил дом, и было так холодно, что не спасало и тёплое одеяло. Марья сидела на кровати и слушала, как шумит ветер, как горько плачет стекло... Не выдержала, тяжело подошла к щитку печки, прижалась к нему старческой грудью — холодно... Поплотнее завернулась в старую поддёвку, стащила со щитка тёплый платок и завязала его крест-накрест. Протяжно загудело в дымоходе, и сук хлопнул по стеклу так сильно, что затрепетало от страха сердце, но стекло выдержало. Марья прижалась к нему, вглядываясь в мокрую слякоть. Из окна на неё смотрело маленькое, сухонькое личико с обветренными жизнью губами...

Ветер подул не на шутку. Стекло уже не просто звенело от его порывов, а стонало, предупреждая хозяйку, что скоро не выдержит. Марья взяла с кровати подушку и приложила к оконной раме. Та сразу успокоилась, и в доме стало тихо, даже белоснежные занавески перестали шевелиться. Бок как будто успокоился, уже не рвал нутро, не дёргал, просто висел тяжёлой нитью навязчивой боли. Дочь говорила, как называется эта болезнь, лекарство из Москвы привозила, но что с того...

# МАР'ІНА ВОСЕНЬ

Вецер стукаў у шыбіну яблыневым суком і Мар'я ў чарговы раз пашкадавала, што не спіліла яго, каб, барані божа, не выбіў шкло. Яно і так ледзь ліпела, пераклеенае пластырам ажно ў трох месцах, а пры асабліва моцным подыху ветру жаласліва і тонка звінела. Мар'я цяжка паднялася і прынікла тварам да халоднай шыбіны, моўчкі ўглядаючыся ў восеньскую цемру. А там – глухі і сляпы лістападаўскі ранак, хоць вока выкалі. Дзе ты цяпер знойдзеш тую нажоўку ў хлеўчуку… Ледзь перастаўляючы ногі, Мар'я пасунулася да ложка, села, і доўга, па-старэчы, ладзілася прылегчы. Але зноў разбалеўся бок – ляжаць не выпадала. За ноч вецер выстудзіў хату, і было так халодна, што не ратавала і цёплая коўдра. Мар'я сядзела на ложку і слухала, як шуміць вецер, як жалобна рыпіць шкло… Не вытрымала, ціха пасунулася да шчытка, прыціснулася да яго старэчымі грудзьмі – халодна... Шчыльней захінула старую паддзёўку, сцягнула са шчытка цёплую хустку і завязала яе крыж-накрыж. Працяжна загудзела ў коміне, і сук ляснуў па шыбіне так моцна, што зайшлося ад страху сэрца, але шыбіна вытрымала. Мар'я прыпала да яе, ўзіраючыся ў мокрую слату. Са шкла на яе глядзеў маленькі, сухенькі тварык з абветранымі жыццём вуснамі…
Вецер усхадзіўся не на смех. Шкло ўжо не проста звінела ад парываў, а стагнала, папярэджваючы гаспадыню, што не вытрымае. Мар'я ўзяла з ложка падушку і прылажыла да шыбіны. Тая адразу супакоілася, і ў хаце пацішэла, нават бялюткія фіранкі перасталі калыхацца. Бок як быццам супакоіўся, ужо не рваў нутро, не тузаў, проста вісеў цяжкой ніткай неадчэпнага болю. Дачка казала, як называецца гэтая хвароба, лекі з Масквы прывозіла, але што з таго…
Дачка ў Мар'і разумная – доктарка… Адразу пасля школы паехала вучыцца ў медінстытут. І паступіла… А вывучылася і замуж адразу выйшла… у Маскву. Людзі кажуць – добра… Тодарава дачка шчаслівая, багатая… Мар'я цяжка ўздыхнула.

Дочь у Марьи умная — врач... Сразу после школы поехала учиться в мединститу-те. И поступила... А выучилась и замуж сразу вышла... в Москву. Люди говорят — хорошо... Тодорова дочь счастлива, богатая... Марья тяжело вздохнула.
Тихо отсчитывали минуты часы на окне, в углу на кухне скреблись мыши.
— Вот уж кота на вас нет, чтоб вас... Кот... Кот... Кыци-кыци-кыци...
Мягко спрыгнул на пол старый серый кот и одним махом оказался рядом со ста-рой женщиной. Она на ощупь протянула к нему руку, погладила по мягкой шер-сти. Кот сразу заурчал и примостился рядом на кровати.
— Совсем ты от рук отбился, мыши по дому пешком ходят, а ты только на печи лежишь... — почесала Марья мягкий бок и замолчала. Старческая тонкая рука лежала на тёплой кошачьей голове. Спустя несколько минут она перевернулась на спину и спросила:
— Может, приедет наша Танечка на Рождество? В том году не было... И на эти Коляды не приедет, наверное...
Кот вытянулся и мягко зевнул, показывая, что разговоры эти пустые, но Марья не успокоилась.
— А помнишь, Кот, раньше все собирались на Рождество... И Танечка. И Иринка из Минска приедет, и Петя с Васей... Девчата мне дом уберут, всё вымоют, хлопцы кабанчика заколют... Помнишь, Кот? А потом вечером кабана разберём, печёночки нажарим, сальца... Колбасы крутим... Помнишь, как Танька не могла кишки в руки брать... А ещё врач... А теперь нет никого... Никто не едет, все городские стали... Всем некогда. Иринке писала — приезжай... А она мне — не-когда — работаю, может, летом... Ну и пусть летом... Летом работы много. Петя с Васей, близнецы, не так далеко живут, в райцентре. Километров тридцать... Эти чаще бывают, да и внуки приезжают... Но чтоб все собрались... Кот, почему мышей не ловишь? Скоро по голове ходить будут... Старый ты стал... Как и я. Это же тебе уже сколько годков? Тебя ещё Иринка привела, котёнком от Игнатихи...

Ціха адлічваў хвіліны гадзіннік на вакне, у качарэжніку скрэбліся мышы.
– Вось ката на вас няма, немач… Кот… Кот…. Кыці-кыці-кыці…
Мякка гупнуўся аб падлогу стары шэры кот і адным махам апынуўся побач са старой. Яна навобмацак пацягнула да яго руку і пагладзіла па мяккай поўсці. Кот адразу завуркатаў і прымасціўся побач на ложку.
– Зусім ты ад рук адбіўся, мышы па хаце пяшком ходзяць, а ты толькі на печы ляжыш… – пачасала Мар'я мяккі бок і прыціхла. Старэчая тонкая рука яе ляжала на цёплай кашэчай галаве. Праз колькі хвілін яна перавярнулася на спіну і спытала:
– Ці прыедзе наша Танечка на Каляды? У тым годзе не была… І на гэтыя не прыедзе, пэўна…
Кот выцягнуўся і мякка пазяхнуў, паказваючы, што размовы гэтыя пустыя, але Мар'я не супакоілася.
– А памятаеш, Кот, раней усе збіраліся на Каляды… І Танечка. І Ірынка з Мінска прыедзе, і Пеця з Васем… А дзеўкі мне хату прыбяруць, усю скрозь вымыюць, мальцы кабанчыка завалюць… Памятаеш, Кот? А тады ўвечары кабана разбяром, пячоначку смажым, сальца… Каўбасы круцім… Памятаеш, як Танька гідзілася, не магла кішкі ў рукі браць… А яшчэ доктарка… А цяпер няма нікога… Ніхто не едзе, усе гарадскія сталі… Усім няма калі. Ірынцы пісала – прыедзь… А яна мне: няма калі – працую, можа летам… Ну і няхай сабе летам… Летам работы шмат. Пеця з Васем, блізняты, не так далёка жывуць, у райцэнтры. Кіламетраў за трыццаць… Гэтыя часцей бываюць, і ўнукі прыязджаюць… Але ж каб усе сабраліся… Кот, ты чаму мышэй не ловіш? Хутка па галаве пойдуць… Стары ты стаў… Як і я. Гэта ж табе ўжо колькі год? Цябе яшчэ Ірынка прывяла, кацянём ад Ігнаціхі… А Ірынка ўжо адзінаццаты год як з'ехала… О-хо-хо-хо-хо… Стары ты ўжо, коцік, як я…

А Иринка уже одиннадцатый год как уехала... О-хо-хо-хо-хо... Старый ты, котик, как и я...
Кот ещё минуту полежал рядом, потом осторожно поднялся и изогнулся, грозно сверкнули зеленоватым светом глаза. В углу снова прошелестела мышь, и полосатый спрыгнул на пол.
Холод брал своё, забирался под платок, не спасала и старая поддёвка, стыли ноги в вязаных бурках. Старуха слезла с кровати и пошаркала к печке, взялась растапливать.
Сначала огонь только ласково лизнул сухую лучину, будто приглашая, а потом вошёл в охоту и, проглотив всю, весело поскакал по сухим поленцам. В доме стало тепло, а на дворе незаметно посветлело, и Марья отправилась во двор, в хлевушок. Оттуда сначала слышалось тихое чириканье, потом беспокойное квохтанье потревоженных кур, и вот Марья вышла из сарая с ведром в руке и двумя яйцами в подоле. Кроме кота делили с Марьей судьбу свою коза Манька и две курочки.
Картошка сварилась. По дому пошёл сытный картофельный запах. Полилось из подойника в кошачью миску молоко. Потом в чашку, белую с голубыми горошинами, Танину любимую. Как приедет, бывало, то только из неё пьёт.
— Кот, иди есть будем, — позвала Марья. И он тут же спрыгнул с печи. Лениво подошёл к миске с молоком.
— Кот... Кот ты, Кот. Кот-муркот...
Марья тихо сидит на диване. В доме тепло, тихо...
— Ай-яй-яй-яй-яй... Дробны-ы дождджык, ды накрапае. Выйдзі, дзяўчына, сэ-эрца жа-а-да-е-е-э...
Марья поёт... Кот привык уже. Раньше пугался и убегал... А теперь смотрит на Марью зелёными глазами и слушает. Марья часто поёт. А бывает, и сказки рассказывает... Кот любит сказки больше, чем песни... Под сказки Марьина рука

Кот яшчэ хвіліну паляжаў побач, потым асцярожна падняўся і выгнуўся, грозна бліснула зеленаватым светам вока. У качарэжніку зноў зашапацела мыш, і паласаты скокнуў на падлогу.

Холад браў сваё, лез за плечы пад хустку, ужо не ратавала старая паддзёўка і застылі ногі ў вязаных бурках. Бабка злезла з ложка і пашоргала к шчытку, узялася растапліваць.

Спачатку агонь толькі ласкава лізнуў сухую лучыну, быццам запрашаючы, а потым увайшоў у ахвоту і заглаціў усю, весела паскакаў па сухіх паленцах. У хаце стала цёпла, а за акном неўпрыкмет пасвятлела, і Мар'я выправілася на двор, у хлевушок. Адтуль спачатку чулася ціхае цвырканне, потым неспакойны квокат патрывожаных курэй, і вось Мар'я выйшла з хлява з вядром і двума яйкамі ў падоле. Акрамя ката дзялілі з Мар'яй долю каза Манька і дзве курачкі.

Бульба зварылася. Па хаце панёсся сытны бульбяны пах. Палілося з даёнкі ў каціную міску малако. Потым у кубачак, белы з блакітнымі гарохамі, Танін любімы. Як прыедзе, бывала, дык толькі з яго п'е.

– Кот, хадзі есці, – паклікала Мар'я. І ён тут жа зваліўся з печы. Лена падышоў да міскі з малаком.

– Кот… Кот ты, Кот. Кот-маркот…

Мар'я ціха сядзіць на канапе. У хаце цёпла, ціха…

– Ай-яй-яй-яй-яй… Дробны-ы дожджык, ды накрапае. Выйдзі, дзяўчына, сэ-э-рца жа-а-да-е-е-э…

Мар'я спявае… Кот ужо прывык. Раней пужаўся і ўцякаў… А зараз глядзіць на Мар'ю зялёнымі вачамі і слухае. Мар'я часта спявае. А бывае, і казкі расказвае… Кот любіць казкі больш, чым песні… Пад казкі Мар'іна рука мякка гладзіць яго, чэша за вухам плаўна, як сам аповед. Ні на хвіліну не прыпыняецца… А пад песню рознае бывае…

мягко гладит его, чешет за ухом плавно, как сам рассказ. Ни на минуту не останавливается... А под песню разное бывает... Может даже и за шерсть дёрнуть... Сказки лучше. Сегодня Марья пела, поэтому Кот наблюдал за ней со стороны, близко не подходил.

— Ну, что смотришь? — Марья перестала петь. — Думаешь, баба с ума сошла? Нет, не сошла... Баба твоя ещё всё понимает... Вот Васька с Петькой зазывали на зиму к себе, а я ж не согласилась... У Васьки детки, квартиры нет, куда мне... А к Петьке я сама не хочу... Там невесточка такая, что не приведи господи... Глупая была б — поехала бы... Иди-ка сюда...

Кот вроде бы только этого и ждал — запрыгнул на колени к хозяйке.

— Какой это день сегодня? Суббота? Мозги-то совсем отсохли... А может, воскресенье? Ящик этот поломался... Так хоть новости смотрели... Одного только боюсь: умру и буду лежать... Одна здесь, пока не найдут. А кто меня найдёт? Сыновья раз в месяц звонят — некогда, дочки — далеко... О-хо-хох-хо... А и быстрей бы уже... Ведь восемьдесят шестой годок... Пожила ведь уже... Пожила. Всего было...

Кот не стал слушать дальше — с ней всегда так — все разговоры одинаково заканчиваются. Повернулся, махнул хвостом и исчез.

День входил в полную силу, но был неярким. Низко над землёй ходили серые тучи, готовые вот-вот прорваться снегом, тоскливо смотрели они на одинокую Марьину избушку. А она ещё ниже прижималась, старалась стать незаметной, слиться с чёрной осенней землёй, а то и сровняться с ней, как уже сровнялись остальные.

Марья поплелась в сени. Накинула на плечи старый мужнин кожух и вышла на крыльцо. Влажный ветер вырвал из рук дверь, и она гулко ударила о стену. От неожиданности Марья ойкнула. Осторожно, чтобы не поскользнуться, спустилась с крыльца и пошла к сараю. Где-то там, на полке, лежала пила. Через не-

Можа нават і дзерануць за поўсць… Казкі лепей. Сёння Мар'я пела, таму Кот назіраў за ёю збоку, блізка не падыходзіў.
– Ну, што глядзіш? – Мар'я перастала пець. – Думаеш, баба з глузду з'ехала? Не, не з'ехала… Баба твая яшчэ ўсё разумее… Вось Васька з Пецькам звалі на зіму да сябе, а я ж не згадзілася… У Ваські дзеткі, кватэры няма, куды мне… А да Пецькі я сама не хачу… Там нявестухна такая, што не прывядзі божа… Была б дурная – паехала б… Хадзі-тка сюды…
Кот быццам бы толькі гэтага і чакаў – скокнуў на калені гаспадыні.
– Які гэта дзень сёння? Ці не субота? Во, мазгі зусім адсохлі… А можа, нядзеля? Скрыня гэтая паламалася... Так хоць навіны глядзелі… Аднаго толькі баюся: памру і буду ляжаць… Адна тут, пакуль не знойдуць. А хто мяне знойдзе? Сыны раз у месяц тэлефануюць – няма калі, дачушкі – далёка… О-хо-хох-хо… А і хутчэй бы ўжо… Ужо ж восемдзесят шосты гадок… А і пажыла ж ужо… Пажыла. Усяго было…
Кот не стаў слухаць – з ёю так заўсёды – усе размовы маюць аднолькавы канец. Крутнуўся і прапаў.
Дзень браўся ў поўную моц, але быў няяркім. Нізка над зямлёю хадзілі шэрыя хмары, гатовыя вось-вось прарвацца снегам, тужліва глядзелі на адзінокую Мар'іну хацінку. А яна яшчэ ніжэй прыціскалася і старалася стаць непрыкметнай, зліцца з чорнай восеньскай зямлёй, а то і зраўняцца з ёю, як ужо зраўняліся астатнія.
Мар'я патупала ў сені. Усцягнула на плечы стары гаспадароў кажух і выйшла на ганак. Вільготны вецер вырваў з рук дзверы, і яны гулка ўдарылі аб сцяну. Ад нечаканасці Мар'я ажно войкнула. Асцярожна, каб не пакаўзнуцца, спусцілася з ганка і пасунулася да хлеўчука. Недзе там на паліцы ляжала нажоўка. Праз колькі хвілін Мар'я асцярожна нахіляла яблыневы сук, мокры і слізкі, нажоўка ніяк не хацела пілiць, усё саскоквала, коўзалася… Мар'я падступалася і так і гэтак. Ад старання споўз кажух і хустка, але сук

сколько минут Марья осторожно наклонила яблоневый сук, мокрый и скользкий, да пила всё никак не хотела резать, соскакивала, скользила... Марья и так подступалась, и этак. От усердия сполз кожух и платок, но сук не поддавался. Тогда Марья отступилась. Тяжело дыша, подошла к яблоне, положила руки на ствол.

— Смотри ты... Тёплый... Прости ты меня, старую... Я же знаю, что болит... И мне больно. Каждую ночь, моя родная, болит... А выбьешь стекло — что буду делать?

Марья опять взялась за ножовку и наконец спилила сук, бросила на мёрзлую землю — тащить в сарай уже сил не было.

— Хай себе лежит, — махнула она рукой и тихо поплелась в дом. Не дошла, тяжко колотилось в груди сердце, и опустилась на старую, хрупкую скамейку, прислонилась к тёплому боку дома.

Свет медленно уступал место осеннему полумраку. Ещё можно было рассмотреть одинокие очертания деревьев, низкие кусты шиповника и сухие стволы жёлтых георгинов, но и они начинали сливаться в ровный серый туман. Тихо-тихо было вокруг. Показалось, по тропинке кто-то идёт, Марья присмотрелась... Показалось... Откуда-то появился кот, потёрся о ноги.

— Не успела оглянуться. А жизнь, вот она — как ниточка в клубок завилась-закрутилась. Будто и не было... Эх, короткая она, жизнь эта... Такая короткая, что только вчера, кажется, бегала маленькая, босая, в одной майке... И мама смотрела из-под руки, и папа... Короткая жизнь моя... Одно хорошо: прожила её так, как хотела, правильно прожила... Никому обиды не делала, а если кого и обидела, то не со зла, так, по глупости... Детишек вырастила, каждого в мир выпустила... С мужем всю жизнь вместе прожили — от свадьбы до последнего его денёчка — вместе... Кажется, и не поссорились ни разу... Хорошую жизнь прожила — дай бог каждому. Да вот под старость одна осталась... Слышишь, Кот. Никому не нужна. Оно, конечно, старые никому не нужны... Но сейчас такой мир, что никто никому не нужен... Каждый сам по себе — бегут, как бешеные,

не паддаваўся. Тады Мар'я адступілася. Цяжка дыхаючы, падышла да яблыні, палажыла абедзве рукі на камель.
– Глядзі ты… Цёплы… Прабач ты мяне, старую… Я ж ведаю, што баліць… І мне баліць. Кожную ноч, мая родненькая, баліць… А выб'еш шкло – што я рабіць буду?
Мар'я зноў узялася за нажоўку і нарэшце спіліла сук, кінула на мёрзлую зямлю – цягнуць у паветку ўжо не было моцы.
– Хай сабе ляжыць, – махнула яна рукой і ціха пашоргала ў хату. Але прыпынілася, цяжка калацілася ў грудзях сэрца, і Мар'я апусцілася на старую, крохкую лаўку, прысланілася да цёплага боку хаты.
Святло паволі саступала месца восеньскаму прыцемку. Яшчэ можна было разгледзець адзінокія абрысы дрэў, нізкія кусты шыпшыны і сухія стаўбуры жоўтых вяргінь, але і яны пачыналі зліvацца ў роўны шэры туман. Ціха-ціха было вакол. Здалося, па сцежцы нехта ідзе, Мар'я прыжмурыла вочы, прыгледзелася… Падалося… Аднекуль з'явіўся кот, пацёрся аб старэчыя ногі.
– Не паспела аглянуцца. А жыццё – вось яно, як нітачка ў клубочак звілася, скруцілася. Быццам і не было… Эх, кароткае яно, жыццё гэтае… Такое кароткае, што толькі ўчора, здаецца, бегала малая, босая, у адной кашульцы… І мама глядзела з-пад рукі, і тата… Кароткае жыццё маё… Адно добра: пражыла яго так, як хацела, правільна пражыла… Нікому крыўды не чыніла, а калі каго пакрыўдзіла, дык не ад злосці, так, ад дурасці… Дзетак выгадавала, кожнага ў свет выправіла… З гаспадаром усё жыццё разам пражылі – ад вяселля да апошняга яго дзянёчка – разам… Здаецца, і не пасварыліся ні разу… Добрае жыццё пражыла – хай кожны такое пражыве. Толькі вось пад старасць адна засталася… Чуеш, Кот. Нікому не патрэбна. Яно вядома, старыя нікому не трэба… Але ж цяпер такі свет, што ніхто нікому не патрэбен… Кожны сам сабе – бягуць, як ашалелыя, а куды бягуць – невядома… І мае вось гоняцца за нечым,

а куда бегут — неизвестно... И мои вот гонятся за чем-то, бегут... Некогда им — а я одна... Так и не дождусь, видать, детей своих... Что-то, Кот, сломалось в этом мире, а что — не знаю... То ли я недосмотрела, то ли мир поменялся... Кто его знает... Так-то...

Ветер выдул из старческого глаза слезинку и оставил на тонкой восковой щеке. Низкие тучи расступились и выпустили осеннее солнце на свободу. Оно не собиралось долго смотреть на одинокую землю, прошлось по небу, взглянуло на Марью и растеклось розовой лентой по вершинам близкого леса. Тихо опустилась на воротник кожуха белая муха, потом ещё и ещё... Пошёл снег. Спорно и тихо, будто старался прикрыть неприглядную эту землю, людские поступки и мысли.

Марья, заметенная снегом, смотрела на розовое солнце и видела там такую короткую жизнь свою. И чудилось ей, будто идёт она, маленькая, в белой длинной рубахе, по росистой высокой траве навстречу большому красному солнцу и входит в тёплую его красноту, и сама наполняется ею до краёв, до донышка. До последнего волоска... Красным ласковым светом, основой всего живого. Наполняется и поднимается высоко-высоко и летит над всем белым светом и видит дальние страны, и людей, и высокие горы. А поднявшись так высоко, что и птицы не долетают, — рассыпается по земле тёплыми прозрачными каплями дождя и прорастает зелёной травой, прекрасными цветами и вновь соединяется с солнцем, чтобы не расставаться с ним никогда.

бягуць… Няма калі ім – а матка адна… Так і не дачакаюся я, мабыць, дзетак сваіх… Штосьці, Кот, паламалася ў гэтым свеце, а што, калі – не ведаю… Ці то я не дагледзела, ці то свет такі цяпер… Хто яго ведае… Такі свет…

Вецер выгнаў са старэчых вачэй слязіну і павесіў на тонкую васковую шчаку.

Нізкія хмары расступіліся і выпусцілі восеньскае сонца на волю. Яно не збіралася доўга глядзець на самотную зямлю, прайшлося па небе, глянула на Мар'ю і расцяклося ружовай стужкай па вершалінах недалёкага лесу. Ціха апусцілася на каўнер кажуха белая мухіна, потым яшчэ і яшчэ… Пайшоў снег. Спора і хутка, быццам стараўся прыкрыць непрыглядную гэту зямлю, людскія ўчынкі і думкі.

Мар'я, зацярушаная снегам, глядзела на ружовае сонца і бачыла там такое кароткае жыццё сваё. І мроілася ёй, быццам ідзе яна малая ў белай доўгай кашулі па роснай высокай траве насустрач вялікаму чырвонаму сонцу і ўваходзіць у цёплую яго чырвань, і сама напаўняецца ёю да берагоў, да донца. Да апошняга валаска… Чырвоным ласкавым святлом, асновай усяго жывога. Напаўняецца, і ўзнімаецца высока-высока, і ляціць над усім белым светам, і бачыць далёкія краіны, і людзей, і высокія горы. А падняўшыся так высока, што і птушкі не ўзнімаюцца, – рассыпаецца па зямлі цёплымі празрыстымі кроплямі дажджу і прарастае зялёнай травой, дзіўнымі кветкамі і зноў злучаецца з сонцам, каб не раставацца з ім ніколі.

**Виктория Синюк**

**Вікторыя Сінюк**

**Виктория Синюк** родилась в Минске в 1988 году. С отличием окончила филологический факультет Белорусского государственного университета по специальности «Русская филология». В 2012 году окончила магистратуру БГУ по специальности «Литературоведение», защитила магистерскую диссертацию (присвоена степень магистра филологических наук). Работала учителем русского языка и литературы в СШ № 57 и гимназии № 9 города Минска. В настоящее время обучается в аспирантуре, работает преподавателем русского языка в образовательном центре при Белорусском государственном университете. Имеет публикации в научных и литературно-художественных изданиях. Как прозаик печаталась в журналах «Новая Немига литературная» (Минск), «Брега Тавриды» (Симферополь).

**Вікторыя Сінюк** нарадзілася ў Мінску ў 1988 годзе. З адзнакай скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «Руская філалогія». У 2012 годзе скончыла магістратуру БДУ па спецыяльнасці «Літаратуразнаўства», абараніла магістарскую дысертацыю (прысвоена ступень магістра філалагічных навук). Працавала настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў СШ № 57 і гімназіі № 9 горада Мінска. Цяпер навучаецца ў аспірантуры, працуе выкладчыкам рускай мовы ў адукацыйным цэнтры пры Беларускім дзяржаўным універсітэце. Мае публікацыі ў навуковых і літаратурна-мастацкіх выданнях. Як празаік друкавалася ў часопісах «Новая Няміга літаратурная» (Мінск), «Берагі Таўрыды» (Сімферопаль).

## РАЗЫСКИВАЕТСЯ ФИЛОСОФ

Почти всё свободное время Виктор Велемыслов проводил в библиотеке. Согласно индивидуальному плану работы аспиранта, он должен был подготовить первый раздел диссертации к апрелю. Кроме того, ему нужно написать статью к ежегодной мартовской конференции, чтобы разжиться первой аспирантской публикацией. Сроки поджимали, а у Виктора по-прежнему не получалось засесть за кропотливый научный труд. «Чем же занимался этот бездельник в библиотеке? — спросите вы. — Гонял чаи с маковыми булками в буфете или попусту бродил по мраморным лабиринтам огромного здания, разглядывая нелепые гобелены и барельефы, развешанные на его стенах?» Да-да, и чаи он гонял, и гобелены рассматривал («Это же сколько времени нужно угрохать на эту нелепицу!» — думал, глядя на них, Велемыслов). Но не чаи и гобелены занимали его. Попадая в благоуханный, призывно шуршащий миллионами страниц мир книг, он пропадал, возносился в ноосферу и с большим неудовольствием покидал её, когда третий звонок приглашал последних читателей оставить уютные залы. Постклассическая нарратология, на которую обрёк его профессор Роботенков, мало занимала Виктора, хотя, надо отдать ему должное, он неплохо в ней разбирался. И всё же она проигрывала философии, психологии и классической литературе, которым Велемыслов отдавался со всепоглощающей страстью. Настала блаженная пора, когда все экзамены, все списки для обязательного чтения остались позади и можно было лакомиться знаниями, как того пожелает ненасытный разум. Коллег-аспирантов, иногда появлявшихся в библиотеке, Велемыслов старался обходить стороной. Впрочем, так было не всегда. «Шёл я к людям с открытой и детской душой…» — писал Александр Блок. Так и Виктор шёл к своим товарищам по факультету: щедро делился идеями, почерпнутыми из книг, увлечённо рассказывал интересные и поучительные случаи из жизни их авторов, поверял

# У ПОШУКАХ ФІЛОСАФА

Амаль увесь вольны час Віктар Велямыслаў праводзіў у бібліятэцы. Згодна з індывідуальным планам работы аспіранта, ён мусіў падрыхтаваць першы раздзел дысертацыі да красавіка. Акрамя таго, яму трэба было напісаць артыкул да штогадовай сакавіцкай канферэнцыі, каб разжыцца першай аспіранцкай публікацыяй. Тэрміны падціскалі, а ў Віктара па-ранейшаму не атрымлівалася засесці за карпатлівую навуковую працу. «Чым жа займаўся гэты лайдак у бібліятэцы? – спытаеце вы. – Чаі сёрбаў з булкамі ў буфеце ці блукаў па мармуровых лабірынтах вялізнага будынка, разглядаючы недарэчныя габелены і барэльефы на яго сценах?» Так-так, і чаі ганяў, і габелены разглядаў («Гэта ж колькі часу трэба было ахвяраваць на гэтую недарэчнасць!» – думаў, гледзячы на іх, Велямыслаў). Але не чай ды габелены займалі яго. Трапляючы ў свет кніг, што прызыўна шапацеў мільёнамі старонак, ён знікаў, узносіўся ў наасферу і з вялікай неахвотай развітваўся з ёй, калі трэці званок запрашаў апошніх чытачоў пакінуць утульныя залы. Посткласічная нараталогія, на якую вырак яго прафесар Рабаценкаў, мала займала Віктара, хаця, трэба аддаць яму належнае, ён някепска ў ёй разбіраўся. І ўсё ж яна прайгравала філасофіі, псіхалогіі і класічнай літаратуры, якім Велямыслаў аддаваўся з усёпаглынальнай страсцю. Прыйшла блаславёная часіна, калі ўсе экзамены, усе спісы для абавязковага чытання засталіся ззаду і можна было ласавацца ведамі, як таго захоча ненаедны розум.

Калег-аспірантаў, якія часам з'яўляліся ў бібліятэцы, Велямыслаў імкнуўся абыходзіць бокам. Зрэшты, так было не заўсёды. «Да людзей я ішоў з адкрытай дзіцячай душой...» – пісаў Аляксандр Блок. Так і Віктар ішоў да сваіх таварышаў па факультэце: шчодра дзяліўся ідэямі, запазычанымі з кніг, захоплена распавядаў цікавыя і павучальныя выпадкі з жыццяў іх аўтараў, давяраў патаемныя задумы – да таго часу, пакуль

свои сокровенные замыслы — до тех пор, пока однажды в буфете две милые аспиранточки с кафедры языкознания не вернули его из мира горнего в мир дольний:
— Ох и нелегко, Велемыслов, будет с тобой твоей будущей жене! — подначивали они Виктора после его великолепного монолога о психоаналитических изысканиях Карен Хорни.
— Не понял. Это почему?
— Она тебе: «Витька, купи норковую шубку! Холодно ведь!». А ты ей что? «Дорогая, у тебя компульсивно-обсессивное расстройство»?
— Между прочим, это не так уж далеко от истины. Ведь все эти шубки покупаются женщинами вовсе не для теплоты, а для того, чтобы соответствовать предписаниям гламура и не чувствовать себя чужими на празднике жизни. Уверяться в собственной состоятельности, приобретая модные и трендовые штучки, — согласитесь, в этом определённо есть что-то нездоровое, даже невротическое…
Здесь филологини не выдержали. Они расхохотались так, что суровая, каменноликая буфетчица попросила всю троицу немедленно покинуть помещение.
Больше Виктор просветительством не занимался и родственных душ не искал. Если коллеги, с которыми он время от времени сталкивался в библиотечных коридорах, спрашивали Велемыслова, чем он занимается, Виктор, пряча за спиной жизнеописание Пушкина, или Чехова, или Сократа, отвечал:
— Пишу первый раздел диссертации и доклад на мартовскую конференцию.
Идеи, культурное значение диссертации и доклада никого не интересовали, зато всех беспокоил объём проделанной работы и сроки сдачи её научному руководителю. Когда Виктор говорил, что написал не слишком много и сдаст раздел ещё не скоро, они облегченно вздыхали:
— Ой, и не говори! Эта диссертация — вынос мозга какой-то! Меня научрук поедом ест, а толку мало! Нет, уж лучше б жениться!

аднойчы ў буфеце дзве мілыя аспірантачкі з кафедры мовазнаўства не вярнулі яго са свету вышыняў у свет зямны:
– Ох і нялёгка, Велямыслаў, будзе з табой тваёй будучай жонцы! – падначвалі яны Віктара пасля яго пышнага маналогу аб псіхааналітычных пошуках Карэн Хорні.
– Не зразумеў. Гэта чаму?
– Яна табе: «Віцька, купі норкавае футрачка! Холадна!». А ты ёй што? «Дарагая, у цябе кампульсіўна-абсэсіўнае расстройства»?
– Між іншым, гэта не так ужо і далёка ад ісціны. Усе гэтыя футры набываюцца жанчынамі зусім не для цеплыні, а для таго, каб адпавядаць гламурным правілам і не пачувацца чужымі на свяце жыцця. Упэўнівацца ў тым, што ты адбыўся, набываючы модныя і трэндавыя штучкі, – пагадзіцеся, у гэтым сапраўды ёсць штосьці нездаровае, нават неўратычнае...
Тут філалагіні не вытрымалі. Яны зарагаталі так, што суровая, маналітная буфетчыца папрасіла ўсю троіцу неадкладна пакінуць памяшканне.
Больш Віктар асветніцтвам не займаўся і роднасных душ не шукаў. Калі калегі, з якімі ён час ад часу сутыкаўся ў бібліятэчных калідорах, пыталіся Велямыслава, чым ён займаецца, Віктар, хаваючы за спінай жыццяпіс Пушкіна, або Чэхава, або Сакрата, адказваў:
– Пішу першы раздзел дысертацыі і даклад на сакавіцкую канферэнцыю.
Ідэі, культурнае значэнне дысертацыі і дакладу нікога не цікавілі, затое ўсіх турбаваў аб'ём праведзенай работы і тэрміны здачы яе навуковаму кіраўніку. Калі ж Віктар казаў, што напісаў не надта шмат і зможа здаць раздзел яшчэ не хутка, уздыхалі з палёгкай:
– Ой, не кажы! Гэтая дысертацыя – вынас мозгу нейкі! Мяне кіраўнік ежма есць, а карысці мала! Не, ужо лепш бы жаніцца!
Аднойчы сонечнай лютаўскай раніцай Велямыслаў адправіўся ў залу перыядычных выданняў. Ён з трапятаннем выграб з адмысловай скрыначкі ўсе нумары аднаго

Однажды солнечным февральским утром Велемыслов отправился в зал периодических изданий. Он с трепетом выгреб из специального ящичка все номера одного философского журнала за минувший год и, предвкушая увлекательный экскурс в ноосферу, устроился поудобнее в кресле. Виктор не спеша перелистывал чистые, никем не тронутые страницы — к его разочарованию, интересного было не много. Начинал читать статьи с интригующими заголовками — не увлекало: казённый, мёртвый академический язык никак не соответствовал представлению Виктора о языке живой философии. Даже Гегель изъяснялся не столь мозголомно! С каждым номером разочарование всё более настигало его… Он мрачно перелистывал страницы последнего журнала, и тут глаз зацепился за странное слово — «технобиоэволюция» (оно фигурировало в названии одной из статей). Велемыслов стал читать.

Авторы статьи вдохновенно вещали о грандиозном антропологическом сдвиге, который уже стартовал; о совершенствовании природы человека с помощью новейших технологий; о невиданных прелестях прогресса вроде каких-то лекарственных суперпилюль, которые — представьте себе! — будут телефонировать человеку в случае, если он забудет их принять, и так далее, и так далее. Больше всего Велемыслова впечатлил проект одного чудо-устройства: специальный чип, вживлённый в организм «техночеловека», будет полностью сканировать состояние здоровья его владельца и в трудную минуту на основании своих показаний сам вызовет «скорую помощь» вышедшему из строя «киборгу». Провозвестники технобиоэволюции призывали не бояться этих грядущих новшеств и принять их как должное. Ведь станок Гуттенберга или радио тоже когда-то казались чем-то вопиющим и неслыханным! Такое развитие человечества вполне закономерно, а против объективной исторической необходимости ничего не попишешь. Что поделаешь, коль природа человека столь несовершенна! Слаб человек, слаб. Чип, разработанный лучшими умами современности, спешит на помощь!

філасофскага часопіса за мінулы год і, прадчуваючы захапляльны экскурс у наасферу, ямчэй уладкаваўся ў крэсле. Віктар не спяшаючыся гартаў чыстыя, нікім не кранутыя старонкі – да яго расчаравання, цікавага было не шмат. Пачынаў чытаць артыкулы з інтрыгуючымі загалоўкамі – не ўражвала: казённая, мёртвая акадэмічная мова ніяк не адпавядала ўяўленням Віктара пра мову жывой філасофіі. Нават Гегель прамаўляў не так мазгаломна! З кожным нумарам расчараванне ўсё больш апаноўвала яго... Ён змрочна гартаў старонкі апошняга часопіса, і тут вока зачапілася за дзіўнае слова – «тэхнабіяэвалюцыя» (яно фігуравала ў назве аднаго з артыкулаў). Велямыслаў пачаў чытаць.
Аўтары артыкула натхнёна вяшчалі пра грандыёзны антрапалагічны зрух, які ўжо стартаваў; пра ўдасканаленне прыроды чалавека з дапамогай найноўшых тэхналогій; пра неверагодныя выгоды прагрэсу накшталт нейкіх «суперлекаў», якія – уявіце сабе! – будуць тэлефанаваць чалавеку ў выпадку, калі ён забудзе іх прыняць, і гэтак далей, і гэтак далей. Больш за ўсё Велямыслава ўразіў праект адной цуда-прылады: адмысловы чып, імплантаваны ў арганізм «тэхначалавека», будзе цалкам сканіраваць стан здароўя яго ўладальніка і ў цяжкую хвіліну на падставе сваіх паказанняў сам выкліча «хуткую дапамогу» да сапсаванага «кібарга». Вешчуны тэхнабіяэвалюцыі заклікалі не баяцца будучых навінак і прыняць іх як належнае. Бо станок Гутэнберга ці радыё таксама калісьці здаваліся нечым абуральным і нечуваным! Такое развіццё чалавецтва цалкам заканамерна, а супраць аб'ектыўнай гістарычнай неабходнасці не папрэш. Што зробіш, калі прырода чалавека недасканалая! Слабы чалавек, слабы. Чып, распрацаваны найлепшымі розумамі сучаснасці, спяшаецца на дапамогу!
Велямыслаў вярнуў часопісы на месца і сеў за стол каля акна. У галаве яго, нібы ў калейдаскопе, мяняліся карцінкі будучыні. Вось ён, лядашчы стары, можа быць,

Велемыслов вернул журналы на место и сел за стол возле окна. В голове его калейдоскопически менялись картины будущего. Вот он, дряхлый старик, может быть, именитый профессор, сидит в своём кабинете и вздыхает о прошлом: о весёлом деревенском детстве, о набегах на соседские сады и сладком соке краденой черешни, о первом поцелуе с дерзкой Ленкой, которая уже на следующий день целовалась с Серёжкой за огородами… Ах, эта Ленка! До чего хорошо, до чего коротко было её синее в белый горошек платьице! До чего милы круглые коленки в маленьких ссадинках! И тут его старческое сердце ёкнет, застучит быстрее, в глазах сверкнут слёзы ностальгии и умиления… И в этот самый момент бдительная пилюля, о которой он совсем позабыл, начнёт трезвонить по телефону. Чип, вживлённый в ткани организма, добросовестно зафиксирует: «Аритмия», — и немедленно вызовет «скорую». Через несколько мгновений в квартиру профессора Велемыслова ворвутся врачи-киборги и начнут оказывать экстренную помощь. Их супердатчики, обладающие способностью к полному сканированию психологического и физического состояния человека, определят причину сердечного сбоя: воспоминания о прошлом. Профессор незамедлительно получит инъекцию, раз и навсегда освобождающую его от волнительных мыслей, тревожной памяти и ненужных фантазий…

— Пресвятой Хаксли! Бред какой-то! — Виктор вскочил. Ноги понесли его в буфет: нужно было обдумать прочитанное за чашкой горячего кофе…

* * *

Однажды в библиотеке Велемыслов наткнулся на антропологический трактат одного неизвестного философа современности. Этот труд столь поразил молодого человека, что он ничтоже сумняшеся наделил автора статусом гения,

знакаміты прафесар, сядзіць у сваім кабінеце і ўздыхае пра мінулае: пра вясёлае вясковае дзяцінства, пра набегі на суседскія сады і салодкі сок крадзенай чарэшні, пра першы пацалунак з дзёрзкай Ленкай, якая ўжо на наступны дзень цалавалася з Сяргеем за агародамі... Ах, гэтая Ленка! Якой мілай, якой кароткай была яе сіняя ў белы гарошак сукеначка! Якія мілыя круглыя каленкі ў дробных драпінках! І тут яго старэчае сэрца здрыганецца, загрукоча хутчэй, у вачах заззяюць слёзы настальгіі і замілавання... І ў гэты самы момант пільная пілюля, пра якую ён зусім забыўся, пачне балабоніць па тэлефоне. Чып, імплантаваны ў арганізм, добрасумленна зафіксуе: «Арытмія», – і неадкладна выкліча «хуткую». Праз некалькі імгненняў у кватэру прафесара Велямыслава ўварвуцца лекары-кіборгі і пачнуць аказваць дапамогу. Іх супердатчыкі, якія валодаюць здольнасцю да поўнага сканавання псіхалагічнага і фізічнага стану чалавека, вызначаць прычыну сардэчнага збою: успаміны пра мінулае. Прафесар неадкладна атрымае ін’екцыю, што раз і назаўжды вызваліць яго ад хвалюючых думак, трывожнай памяці і непатрэбных фантазій...

– Найсвяцейшы Хакслі! Вар’яцтва нейкае! – Віктар ускочыў. Ногі панеслі яго ў буфет: трэба было абдумаць прачытанае пад кубак гарачай кавы...

* * *

Аднойчы ў бібліятэцы Велямыслаў натрапіў на антрапалагічны трактат аднаго невядомага філосафа сучаснасці. Гэта праца настолькі ўразіла маладога чалавека, што ён без хвілі сумнення надзяліў аўтара статусам генія, непрызнанне якога было цалкам вытлумачальным: яго ідэі, як прынята казаць, апярэджвалі час, ішлі насуперак з самім духам эпохі, з яе ідэалагічнай арганікай. «Не-не, –

непризнанность которого была вполне объяснима: его идеи, как принято говорить, опережали время, шли вразрез с самим духом эпохи, с её идеологической органикой. «Нет-нет, — возразил Виктор расхожему мнению, — это не идеи опережают время — они как раз весьма современны, это человечество катастрофически отстаёт от них!» Больше всего Виктора вдохновили взгляды мыслителя на будущее и на перспективы развития человеческой природы. В отличие от журнальных философов, обеспокоенных чудо-чипами и киберпилюлями, автор труда говорил о том, каким должен стать человек, чтобы подлинная история человечества, освещённая солнцем разума, наконец началась. Ум, сознание, духовность — вот качества, которые превращают человека в Человека, в Личность, каковых, увы, пока ничтожно мало. Большинство организует свою жизнедеятельность согласно императивам коллективного бессознательного, главные из которых — обогащение и власть. Именно поэтому социальное бытие человечества омрачено нескончаемыми войнами, революциями, проблемами экологии. И частная жизнь человека, в которой главенствует всё тот же принцип власти, чаще всего не имеет никакого отношения к счастью, подменяемому довольством и удовлетворением властных амбиций. Смысл жизни умного человека, личности — не в довольстве и не в господстве над ближним, а в полнокровном, разумном счастье, основанном на любви и познании, на жизнетворчестве и гармонии. Не тюнингованный киборг должен прийти на смену современному человеку, а человек воистину разумный, духовно здоровый, для которого главной заповедью станет заповедь Сократа: «Cognosce te ipsum»[1]. Вот это была бы эволюция! Новая, невиданная эра! Социум, состоящий из людей, культивирующих духовные потребности и гуманистические ценности, — это социум без войн и угро-

[1] Познай сам себя (лат.).

запярэчыў Віктар вядомаму меркаванню, – гэта не ідэі апярэджваюць час – яны якраз вельмі сучасныя, гэта чалавецтва катастрафічна адстае ад іх!» Больш за ўсё Віктара натхнілі погляды мысляра на будучыню і на перспектывы развіцця чалавечай прыроды. У адрозненне ад часопісных філосафаў, занепакоеных цудачыпамі і кіберпілюлямі, гэты аўтар даводзіў тое, якім мусіць стаць чалавек, каб сапраўдная гісторыя чалавецтва, асветленая сонцам розуму, нарэшце пачалася. Розум, свядомасць, духоўнасць – вось якасці, якія ператвараюць чалавека ў Чалавека, у Асобу, якіх, на жаль, пакуль неверагодна мала. Большасць арганізуе сваю жыццядзейнасць згодна з імператывамі калектыўнага несвядомага, галоўныя з якіх – узбагачэнне і ўлада. Менавіта таму сацыяльнае быццё чалавецтва азмрочана няспыннымі войнамі, рэвалюцыямі, праблемамі экалогіі. І прыватнае жыццё чалавека, у якім пануе ўсё той жа прынцып улады, часцей за ўсё не мае ніякага дачынення да шчасця, якое падмяняецца задаволенасцю і задавальненнем уладных амбіцый. Сэнс жыцця чалавека разумнага, асобы – не ў дастатку і не ў панаванні над бліжнім, а ў паўнакроўным, разумным шчасці, заснаваным на любові і пазнанні, на жыццятворчасці і гармоніі. Не цюнінгаваны кібарг павінен прыйсці на змену сучаснаму чалавеку, а чалавек насамрэч разумны, духоўна здаровы, для якога галоўнай запаведдзю стане запавет Сакрата: «Cognosce te ipsum»[1]. Вось гэта была б эвалюцыя! Новая, нябачаная эра! Соцыум, які складаецца з людзей, якія культывуюць духоўныя патрэбы і гуманістычныя каштоўнасці, соцыум без войнаў і пагрозы тэхнагеннага апакаліпсісу, перад якой нават звышмагутны інтэлект апынецца нямоглым. Не інтэлект, які пракладае новыя шляхі ў прыстасаванні да

---

[1] Спазнай самога сябе (лат.).

зы техногенного апокалипсиса, перед которым даже сверхмощный интеллект окажется бессильным. Не интеллект, пролагающий новые пути приспособления к действительности, а разум, постигающий истину и на основе истины гармонизирующий универсум, — вот в чём жизненно нуждается Homo sapiens, получивший свой видовой эпитет авансом! Пора, наконец, начать его отрабатывать! Пора умнеть, человече, иначе необузданный разумом и нравственностью интеллект сотрёт тебя в космическую пыль, с которой, как с горсткой золы, будут играть ветра Вселенной.
Эти идеи всколыхнули Велемыслова и в то же время подарили ему ту мировоззренческую почву, которую он долго искал, но нигде не находил. В невостребованном, никем не прочитанном томике, завалявшемся в библиотечных хранилищах, он нашёл ответы на вопросы, задавать которые в двадцать первом столетии было не принято. Спроси-ка — в чём смысл жизни, начни рассуждать об истине — непременно заподозрят в сочувствии проклятым тоталитарным режимам! Развлекайся, милый Homo ludens[1], прекрасный «техночеловек», и не ищи ума. Поклонись малютке чипу — он подскажет, как жить, как мыслить и страдать…
После роковой встречи с этой книгой у Велемыслова и начались проблемы с диссертацией: постклассическая нарратология утратила для него своё схоластическое обаяние и стала казаться чем-то таким, что назойливо отвлекает его от главного…
Виктор пробовал найти какую-нибудь информацию об авторе трактата, мечтал связаться с ним, если тот ещё жив, однако всеведущий Интернет не знал о нём ровным счётом ничего.

---

[1] Человек играющий (лат.).

рэчаіснасці, а розум, які спасцігае праўду і на аснове ісціны гарманізуе ўніверсум, – вось у чым мае жыццёвую патрэбу Homo sapiens, які атрымаў свой відавы эпітэт авансам! Пара нарэшце пачаць яго адпрацоўваць! Пара разумнець, чалавеча, іначай неўтаймаваны розумам і маральнасцю інтэлект сатрэ цябе ў касмічны пыл, з якім, як са жменькай попелу, будуць гуляць вятры Сусвету.
Гэтыя ідэі ўскалыхнулі Велямыслава і ў той жа час падарылі яму тую светапоглядную глебу, якую ён доўга шукаў, але нідзе не знаходзіў. У незапатрабаваным, нікім не прачытаным томіку, які да часу пакрываўся пылам у бібліятэчных сховішчах, ён знайшоў адказы на пытанні, задаваць якія ў дваццаць першым стагоддзі было не прынята. Спытай, у чым сэнс жыцця, пачні разважаць пра ісціну – абавязкова западозраць у спагадзе да праклятых таталітарных рэжымаў! Забаўляйся, мілы Homo ludens[1], цудоўны наш «тэхначалавек», і не шукай розуму. Пакланіся малютцы чыпу – ён падкажа, як жыць, як думаць і пакутаваць...
Пасля фатальнай сустрэчы з гэтай кнігай у Велямыслава пачаліся праблемы з дысертацыяй: посткласічная нараталогія страціла ўсё сваё схаластычнае абаянне і стала здавацца тым, што назойліва адцягвае яго ўвагу ад галоўнага...
Віктар спрабаваў знайсці якую-небудзь інфармацыю пра аўтара трактата, марыў звязацца з ім, калі той яшчэ жывы, аднак усяведны Інтэрнэт не ведаў пра яго зусім нічога.

[1] Чалавек, які гуляе (лат.).

* * *

Через несколько часов Велемыслов сидел на кухне у своего друга, Пашки Железнова, студента машиностроительного факультета, и излагал ему свои сумбурные соображения о «техночеловечестве». Пашка терпеливо слушал, вовремя подливал чай, но не совсем вникал, из-за чего Витя, обычно спокойный и уравновешенный, так кипятится. Конечно, он и раньше с жаром что-то доказывал Пашке, но в этот раз градус явно побил все рекорды.

— Нет, Пашка, ты понял, да? — негодовал Велемыслов. — Технобиоэволюция! И они с восторгом об этом пишут! Эти кабинетные умники снимают свои цилиндры перед техногенным варварством! Сократа на них нет!

Наконец Павел не выдержал и от чистого сердца решил заступиться за идеологических противников Велемыслова:

— Вить, если подумать, а что плохого? Прогресс не остановишь, да и зачем? Всё течёт, всё изменяется, как сказал философ. А чипы — это же новые ощущения, новые возможности! Поставь себя на место пенсионера, которому, случись что, некому вызвать «скорую помощь». А чип взял и вызвал! Гуманно, между прочим…

— Допустим. Ещё гуманней пересоздать человека так, чтобы у него в принципе никогда и ничего не болело, не находишь? Иными словами, подменить жизнь «умным» железом — со всеми вытекающими последствиями. Как ты не понимаешь, что «гуманные» чипы — это всего лишь частный случай стратегии тотальной дегуманизации! Масштабней мыслить нужно, дружище!

Пашка не горел желанием вникать в подобные диалектические каверзы (такого рода рассуждения казались ему типичной гуманитарной болтовнёй) — он был очарован тем, что услышал ранее:

* * *

Праз некалькі гадзін Велямыслаў сядзеў на кухні ў свайго сябра, Пашкі Жалязнова, студэнта машынабудаўнічага факультэта, і выкладаў яму свае бязладныя меркаванні пра «тэхначалавецтва». Пашка цярпліва слухаў, своечасова падліваў чай, але не надта ўнікаў, з-за чаго Віця, звычайна спакойны і ўраўнаважаны, пачаў заводзіцца. Вядома, ён і раней з запалам штосьці даводзіў Пашку, але на гэты раз градус запалу відавочна пабіў усе рэкорды.

– Не, Пашка, ты зразумеў, так? – абураўся Велямыслаў. – Тэхнабіяэвалюцыя! І яны з захапленнем пра гэта пішуць! Гэтыя кабінетныя разумнікі здымаюць свае капелюшы перад тэхнагенным варварствам! Сакрата на іх няма!

Нарэшце Павел не вытрымаў і ад чыстага сэрца вырашыў заступіцца за ідэалагічных праціўнікаў Велямыслава:

– Віць, калі падумаць, а што тут кепскага? Прагрэс не спыніш, ды і навошта? Усё цячэ, усё змяняецца, як сказаў філосаф. А чыпы – гэта ж новыя адчуванні, новыя магчымасці! Пастаў сябе на месца пенсіянера, якому, як што якое, няма каму выклікаць «хуткую дапамогу». А чып узяў ды выклікаў! Гуманна, між іншым...

– Дапусцім. Яшчэ больш гуманна перастварыць чалавека так, каб у яго ў прынцыпе ніколі і нічога не балела, не згодны? Іншымі словамі, памяняць жыццё на «разумнае» жалеза – з усімі вынікаючымі наступствамі. Як ты не разумееш, што «гуманныя» чыпы – гэта ўсяго толькі прыватны выпадак стратэгіі татальнай дэгуманізацыі! Маштабна думаць трэба, дружа!

Пашка не гарэў жаданнем унікаць у падобныя дыялектычныя каверзы (такога кшталту развагі здаваліся яму тыповай гуманітарнай балбатнёй) – ён быў зачараваны тым, што пачуў раней:

